ВЫДАЕЦЦА З КАСТРЫЧНІКА 1991 г.
№ 7 (1081) 16 лютага 2013 г. Кошт 4000 рублёў.

КУЛЬТУРА

WWW.KIMPRESS.BY
ШТОТЫДНЁВАЯ ГРАМАДСКА-АСВЕТНІЦКАЯ ГАЗЕТА

КАЛЕГІЯ: "АКУПУНКТУРА" ПАДЫХОДАЎ У КАНТЭКСЦЕ ДЗЯРЖПРАГРАМЫ

С. 3 — 14

12 лютага ў Нацыянальнай бібліятэцы краіны адбылося пасяджэнне выніковай калегіі Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь «Аб выніках работы арганізацый Міністэрства культуры ў 2012 годзе і задачах на 2013 год».

Фота Юрыя ІВАНОВА



Крэатыўна пра канцэпцыю

12 лютага ў Міністэрстве культуры краіны пад старшынством міністра культуры Барыса Святлова адбылося першае пасяджэнне, прысвечанае выпрацоўцы канцэпцыі XXII Міжнароднага фестывалю мастацтваў "Славянскі базар у Віцебску". Абмеркаванне вялося ў адпаведнасці з даручэннем Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь Аляксандра Лукашэнкі.

— Гэта было пасяджэнне творчай групы, намаганнямі якой фестываль набывае тое або іншае напаўненне і аблічча, — адзначыла начальнік упраўлення мастацтваў Міністэрства культуры Мар'яна Мальчык. — На пасяджэнне былі запрошаны супрацоўнікі Цэнтра культуры "Віцебск" на чале з дырэктарам Дырэкцыі фестывалю Радзівонам Басам, рэжысёры, якія сёлета будуць працаваць над асобнымі фестывальнымі праграмамі.

Так, у абмеркаванні ўдзельнічаў рэжысёр Канцэртнай залы "Расія" Ілья Глазуноў з Масквы, які будзе кіраваць гала-канцэртам урачыстага адкрыцця фестывалю. Зразумела, прысутнічалі на пасяджэнні і нашы творцы: вядомы тэлерэжысёр Юрый Брэус, які стане курыраваць Міжнародны конкурс маладых выканаўцаў, і рэжысёр Цэнтра культуры "Віцебск" Ірына Коўлена, якая добра зарэкамендавала сябе на некалькіх мінулых фестывалях, ператвараючы дзіцячыя конкурсы ў нязмушаную святочную дзею. На жаль, на пасяджэнні не змог прысутнічаць Генадзь Шагаеў — рэжысёр Канцэртнай залы "Кастрычніцкая", што ў Санкт-Пецярбургу, але ён прадставіў сваю канцэпцыю закрыцця фестывалю, якую мы таксама абмяркоўвалі.

Сабраўшыся разам, мы шукалі магчымыя шляхі далейшага ўдасканалення фестывалю, новыя формы яго правядзення, разважалі пра ўзбагачэнне фестывальнай палітры новымі жанрамі. Каб фестываль плённа развіваўся, трэба, безумоўна, прыцягваць да яго новыя імёны, запрашаць маладых перспектыўных артыстаў. Пра ўсё гэта і ішла размова. Выказваліся прапановы, цікавыя ідэі. Праца ідзе, і ў хуткім часе можна будзе казаць пра першыя вынікі…

Н.Б.

Парыж на "Каложскім дабравесце"

З 27 лютага па 2 сакавіка ў Гродне пройдзе чарговы Фестываль праваслаўных песняспеваў "Каложскі дабравест".

Як паведаміла "К" намеснік начальніка ўпраўлення культуры Гродзенскага аблвыканкама Алена Клімовіч, фэст чакаюць у абласным цэнтры ўжо у дванаццаты раз. На сённяшні дзень адбыліся тры пасяджэнні аргкамітэта фестывалю, на якіх былі абмеркаваны шматлікія пытанні, звязаныя з правядзеннем гэтага прадстаўнічага міжнароднага форуму. Сёлета, па словах суразмоўцы "К", у ім прымуць удзел духоўныя і свецкія калектывы з Францыі, Сербіі, Румыніі, Літвы, Польшчы, Украіны, Расіі і, вядома ж, Беларусі.

Фестываль "Каложскі дабравест", адзначыла Алена Клімовіч, па традыцыі, арганізуецца ў два туры. Першы адбыўся ў перыяд Каляд, у студзені, выключна для парафіяльных хароў Гродзенскай епархіі і стаў самастойным творчым мерапрыемствам. Другі ж тур пройдзе ў абласным цэнтры з удзелам калектываў з іншых краін. Усяго ў ім прымуць удзел звыш 40 ансамбляў, у тым ліку царкоўныя хары і калектывы епархій ды раённых цэнтраў, абласных гарадоў, хары святароў і духоўных школ, а таксама некаторыя іншыя.

Пад час фестывалю пройдзе шэраг культурных мерапрыемстваў: выстаўка з фондаў Гродзенскага дзяржаўнага музея гісторыі рэлігіі, вечар духоўнай паэзіі і аўтарскай песні, кіналекторыі ў кінатэатры "Чырвоная зорка", выстаўкі мастацкіх работ на рэлігійную тэматыку ў Гродзенскай выставачнай зале і ў музеі абласнога метадычнага цэнтра народнай творчасці ды выстаўка фотаработ "Праваслаўны свет". Акрамя цырымоній адкрыцця і закрыцця фестывалю, што пройдуць у Гродзенскім абласным драматычным тэатры, а таксама конкурсных праслухоўванняў, запланаваны і асобныя канцэрты. Так, 28 лютага адбудзецца выступленне хору студэнтаў Маскоўскай дзяржаўнай кансерваторыі ім. П.І. Чайкоўскага, а 1 сакавіка жыхары і госці горада змогуць папрысутнічаць на канцэртах Архірэйскага хору Свята-Аляксандра-Неўскага кафедральнага сабора з Парыжа і хору пеўчых стараверскіх прыходаў Сібіры.

Ю.Ч.

Шэмеш і Сыракомля на Радзіме

13 лютага ў Нацыянальным мастацкім музеі адбыўся вернісаж аднаго твора: жывапіснага кампазіцыйнага партрэта Людвіка Кандратовіча — Уладзіслава Сыракомлі — пэндзля Адама Казіміравіча Шэмеша са збораў Літоўскага мастацкага музея.

І выдатны паэт ды краязнаўца Сыракомля, і таленавіты жывапісец ды літаратар Шэмеш — нашы славутыя землякі: першы — з в. Смольчаў Бабруйскага павета Мінскай губерні (цяпер — Любанскі раён), другі — з Ігуменскага павета таксама Мінскай губерні, але лёс так ці інакш звязаў абодвух і з Мінскам, і з Вільняй. У "К" №№ 32, 33 за 2011 г. быў надрукаваны матэрыял пад назвай "Ключ да мастацтва, або Багатае сэрца Адама Шэмеша" (Б.Крэпака), у якім падрабязна распавядаецца пра жыццё і творчасць Адама Шэмеша, а таксама пра драматычны лёс паэта Уладзіслава Сыракомлі. Абодва творцы былі добрымі сябрамі цягам некалькіх гадоў — з 1846-га па 1864-ы, — аж да заўчаснай смерці ад сухотаў Сыракомлі, якога пахавалі ў Вільні.

Дарэчы, у "імправізацыі" Сыракомлі "У коле знаёмых у Мінску" Шэмеш прыгаданы як "адзін з самых высакародных людзей". Такім жа высакародным быў і сам Сыракомля. Пра гэта красамоўна сведчыць і партрэт, прадстаўлены ў нашым музеі. Твор цалкам увасабляе пункт гледжання мастака на сутнасць гуманістычных ідэалаў чалавека сярэдзіны XIX ст. Вобраз паэта ахутаны такім прыўзнятарамантычным флёрам, што міжволі праводзіш паралелі з бліскучымі партрэтамі яго сучасніка Карла Брулова ці Трапініна. Простая кампазіцыя, умоўнае асвятленне, старанна вымалеваны складкі тканіны на цёмна-сіняй вопратцы. Пэндзаль плаўна праходзіць праз белую манішку, чорны бант пад каўнерыкам на шыі, счэпленыя пальцы рук. Фон — фрагмент сцяны цаглянага замка, рамантычнае неба з сонечным прасветам скрозь аблокі, а з правага боку — кроны зялёнага дрэва. Погляд паэта — горды, пранізлівы, упэўнены.

Партрэт быў напісаны з натуры ў 1854-м, за дзесяць гадоў да смерці аўтара знакамітага "Паштальёна" ("Ямшчыка").

На вернісажы дырэктар Літоўскага мастацкага музея Рамуальдас Будрыс адзначыў, што гэты партрэт з'яўляецца гордасцю музея і, акрамя ўсяго іншага, сімвалізуе тыя агульныя культурныя карані, якія звязваюць беларусаў і літоўцаў на працягу многіх стагоддзяў.

У 1930-я партрэт знаходзіўся ў Таварыстве сяброў навук у Вільні, адкуль трапіў у Акадэмію навук Літвы, а ў 1941 годзе быў перададзены Літоўскаму мастацкаму музею.

Б.К.

На здымку: пад час вернісажу.
Фота аўтара

Век Цвіркі

14 лютага ў Нацыянальным мастацкім музеі прайшлі ўрачыстасці з нагоды 100-годдзя з дня нараджэння выдатнага песняра беларускай зямлі, народнага мастака Беларусі, лаўрэата Дзяржаўнай прэміі Віталя Цвіркі.

У той дзень адбылося ўрачыстае гашэнне маркі з арыгінальным канвертам, а таксама прэзентацыя кнігі, прысвечанай майстру, з серыі "Знакамітыя мастакі з Беларусі", што выходзіць у выдавецтве "Беларусь" па заказе Нацыянальнага мастацкага музея. Вясной у НММ запланавана і юбілейная выстаўка работ Віталя Канстанцінавіча як даніна памяці, павагі і любові да творцы.

Наша газета неаднойчы пісала пра жыццё і мастацтва Віталя Цвіркі, бо без ягонага жывапісу, без яго педагагічнай і грамадскай дзейнасці немагчыма прадставіць у поўнай меры нацыянальную культуру Беларусі пасляваенных дзесяцігоддзяў.

Цвірка — той мастак, які прыйшоў да гранічнай яснасці пластычнай формы, стварыў своеасаблівы, непаўторны нацыянальны вобраз беларускай прыроды, што не мае аналагаў у гісторыі нашага жывапісу. Творца сцвердзіў думку: прачытанне навакольнага свету — бязмежнае, гэтак сама, як бязмежныя чалавечыя пачуцці і любоў да роднай зямлі.

Б.К.

Наш СДК у… Башкартастане

Чарговым крокам па папулярызацыі айчыннай культуры за межамі нашай краіны стала адкрыццё ў Акадэмічнай бібліятэцы Латвійскага дзяржаўнага ўніверсітэта ў Рызе Беларускага інфармацыйнага цэнтра. Яго стварэнню паспрыяла Пасольства Рэспублікі Беларусь у Латвійскай Рэспубліцы.

Як адзначыў Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Рэспублікі Беларусь у Латвійскай Рэспубліцы Аляксандр Герасіменка, апошнім часам назіраецца станоўчая дынаміка ў развіцці міждзяржаўных узаемаадносін у справе захавання і папулярызацыі беларускай культуры ў Латвіі. Па словах дыпламата, асноўнымі задачамі Беларускага інфармацыйнага цэнтра стануць развіццё як культурных, так і эканамічных, навуковых, спартыўных сувязей, прэзентацыя турыстычных магчымасцей Беларусі, а таксама забеспячэнне доступу да неабходнай нарматыўна-прававой інфармацыі.

У сваю чаргу, новым імпульсам для развіцця аўтэнтычнай беларускай культуры ў Расійскай Федэрацыі стала адкрыццё пасля капітальнага рамонту Сельскага дома культуры. Такі аб'ект аднавіў сваю працу ў Балтыйскім сельскім савеце Рэспублікі Башкартастан, дзе кампактна пражывае беларуская дыяспара. У знакавым мерапрыемстве прыняў удзел кіраўнік аддзялення Пасольства Рэспублікі Беларусь ва Уфе Васілій Новак.

Варта адзначыць, яшчэ летась Прэзідэнтам Башкартастана былі выдзелены сродкі для правядзення капітальнага рамонту будынка. У выніку значна палепшылася матэрыяльна-тэхнічная база, пашырыліся плошчы беларускага музея і бібліятэкі, у фондзе якой маецца разнастайная літаратура на беларускай мове. Акрамя таго, пасля рамонту адкрыўся метадычны кабінет Беларускага гісторыка-культурнага цэнтра "Балтыка", а пры падтрымцы спонсараў былі набыты новыя касцюмы для калектываў мастацкай самадзейнасці "Жаўраначкі" і "Сябры", што дзейнічаюць пры СДК.

Тым часам, гэтымі днямі ва Урадзе Свярдлоўскай вобласці з удзелам мясцовых улад і кіраўніка аддзялення Пасольства Рэспублікі Беларусь у Екацярынбургу Віктара Паляніна абмяркоўвалася пытанне стварэння помніка народнаму артысту Беларусі і СССР Уладзіміру Мулявіну. У прыватнасці, Урад Свярдлоўскай вобласці падтрымаў прапановы беларускага боку па ўстаноўцы помніка заснавальніку і мастацкаму кіраўніку беларускага вакальна-інструментальнага ансамбля "Песняры" ў цэнтры Уральскай сталіцы — каля кінаканцэртнага тэатра "Космас".

К.А.

І рэканструкцыя, і аншлаг

Пасля грунтоўнай рэканструкцыі адкрыўся Гродзенскі абласны тэатр лялек. З вынікамі работ нядаўна азнаёміўся Прэм'ер-міністр Міхаіл Мясніковіч.

Тэатр займеў не толькі дадатковыя памяшканні, але і найноўшае тэхнічнае ўзбраенне.

А сёння працягваецца рэканструкцыя Брэсцкага абласнога тэатра лялек. Яна таксама карэнным чынам палепшыць тэхнічныя і творчыя магчымасці ўстановы культуры.

Як паведамляе "К" намеснік начальніка ўпраўлення культуры Брэсцкага аблвыканкама Дзмітрый Сачкоўскі, рэканструкцыя нагадвае будоўлю "з нуля": ад старога будынка на цэнтральнай вуліцы абласнога цэнтра засталася ці не адна сцяна. Работы тут былі распачаты летась. Сёлета рэканструкцыя ўгэўнена выходзіць з нулявога цыкла. За студзень асвоена 2,5 мільярда рублёў. Мяркуецца, што якасна абноўлены тэатр прыме гледачоў ужо ў наступным годзе.

А пакуль брэсцкія лялечнікі, па словах Дзмітрыя Сачкоўскага, даюць спектаклі ў былым кінатэатры "Юнацтва", прыстасаваным пад тэатральныя патрэбы. Нягледзячы на тое, што часовы будынак установы месціцца ў адным са спальных раёнаў Брэста, аншлагі ў ім — пастаянныя.

Купалаўскі фармат

У Музеі кнігі Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі адбылася прэзентацыя ўзноўленай у мініяцюрным фармаце купалаўскай "Жалейкі" 1908 года. Фармат факсімільнага выдання — 35 на 47 міліметраў.

З тэхнічных прычын "Жалейка" зроблена двухтомнай. У першай кнізе 63 вершы, у другой — 35. Двухтомнік выйшаў у свет у азербайджанскім выдавецтве "Indigo". Да стварэння выдання спрычынілася Зафіра Салахова — старшыня азербайджанскага Рэспубліканскага таварыства "Кніга", дырэктар бакінскага Музея мініяцюрных кніг. Факсімільную копію арыгінальнага выдання "Жалейкі" прадаставіла азербайджанскім калегам Нацыянальная бібліятэка Беларусі. А фінансава падтрымала выданне Міжнароднае грамадскае аб'яднанне "Кангрэс азербайджанскіх абшчын Беларусі".

Наклад кнігі — 50 асобнікаў. Такім чынам, выданне ужо з друкарні выходзіла ў статусе бібліяграфічнага рарытэта.

Міжнародная акцыя праходзіць таксама і ў Дзяржаўным літаратурным музеі Янкі Купалы. Гэта прэзентацыя кнігі "Проглас" — першай славянскай паэмы, створанай Канстанцінам Філосафам (святым Кірылам) як прадмова да першай славянскай Бібліі. У праграме прэзентацыі — адкрыццё выстаўкі работ славацкага скульптара Людмілы Цвенгрошавай з прыватнай калекцыі Пасла Славацкай Рэспублікі ў Рэспубліцы Беларусь Марыяна Сэрваткі.

Лялькі з крытыкай

Праз восем гадоў ізноў была адноўлена традыцыя правядзення творчых лабараторый тэатраў лялек Беларусі.

У 1990 — 2000-я лабараторыі фінансаваліся Міністэрствам культуры. Вясной мінулага года, дзякуючы намаганням ды ўласным сродкам ужо калектываў лялечных тэатраў Беларусі, традыцыю адрадзілі.

— Тая творчая лабараторыя, якую мы бачым сёння, у гэтым сезоне, у першую чаргу важная для калектываў з несталічных тэатраў, — адзначае загадчык літаратурнай часткі Беларускага дзяржаўнага тэатра лялек Любоў Дзёмкіна. — Без прафесійнай крытыкі немагчыма творчае развіццё, калектывы вымушаны ставіць вялікую колькасць спектакляў, каб прыцягнуць і здзівіць гледача, але, зразумела, колькасць — не заўсёды якасць. Тым больш, вядома, што некаторыя мінскія тэатральныя крытыкі неахвотна ездзяць у іншыя гарады. Таму наша лабараторыя — выдатны шанец для маленькіх тэатраў паказаць сябе. А для больш плённай працы пасля кожнага спектакля мы арганізоўваем абмеркаванне пастаноўкі творчай групай, журналістамі і крытыкамі, каб артысты маглі адразу ж пазнаёміцца з першым уражаннем ад працы…

Ужо атрымалі сваю "порцыю" выключна канструктыўнай крытыкі Мінскі абласны тэатр лялек "Батлейка" з пастаноўкай "Певень, Кот, Цмок і іншыя", Беларускі дзяржаўны тэатр лялек з пастаноўкай "Дзяды", Магілёўскі абласны тэатр лялек, які прадставіў гледачам спектакль "Неверагодныя авантуры паноў Кубліцкага і Заблоцкага", а Гомельская ж трупа пазаўчора паказала пастаноўку "Над прорваю ў жыце". А за ім чакаем Гродзенскі тэатр са спектаклем "Вій"…

Надзея ПЯКАРСКАЯ

12 лютага ў канферэнц-зале Нацыянальнай бібліятэкі краіны прайшло пасяджэнне калегіі Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь. На парадак дня было вынесена адзінае пытанне: "Аб выніках работы Міністэрства культуры ў 2012 годзе і задачах на 2013 год". У дакладзе міністра культуры краіны Барыса Святлова быў прыведзены не толькі дэталёвы аналіз зробленага, але і вызначаны кірункі далейшай дзейнасці ў галіне культуры.

Упершыню за апошнія гады на падвядзенне леташніх вынікаў працы і абмеркаванне надзённых праблем сабраліся работнікі культуры з усіх раёнаў Беларусі, што, апрача дзелавітасці, дадало мерапрыемству традыцыйнай святочнасці. Сапраўды, не так ужо і часта збіраюцца разам рупліўцы-аднадумцы ад культуры. Таму атмасфера карпаратыўнай еднасці панавала і ў канферэнц-зале, і ў кулуарах калегіі...

У выніковай калегіі прынялі ўдзел намеснік Прэм'ер-міністра Рэспублікі Беларусь Анатоль Тозік; намеснік начальніка галоўнага ідэалагічнага ўпраўлення — начальнік упраўлення сацыяльна-культурнай палітыкі галоўнага ідэалагічнага ўпраўлення Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь Ірына Дрыга; старшыня Пастаяннай камісіі па адукацыі, культуры і навуцы Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь Генадзь Пальчык; старшыня Цэнтральнага камітэта Беларускага прафсаюза работнікаў культуры Наталля Аўдзеева.

Таксама ўдзел у рабоце калегіі прынялі намеснікі старшынь аблвыканкамаў, Мінгарвыканкама, што курыруюць сацыяльна-культурную сферу, начальнікі ўпраўленняў культуры аблвыканкамаў і Мінгарвыканкама, цэнтральны апарат Міністэрства культуры, прадстаўнікі міністэрстваў і ведамстваў краіны, кіраўнікі арганізацый культуры рэспубліканскага і абласнога падпарадкавання, абласных і гарадскіх выканаўчых камітэтаў прафсаюза работнікаў культуры, абласных кінапракатных арганізацый, аддзелаў культуры рай- і гарвыканкамаў, а таксама — творчых саюзаў і грамадскіх арганізацый, дзеячы культуры і мастацтваў, прадстаўнікі рэспубліканскіх СМІ.

У цэнтры ўвагі пад час пасяджэння — другі год рэалізацыі Дзяржаўнай праграмы "Культура Беларусі" на 2011 — 2015 гг.

КУЛУАРЫ: ПРАЗ ФОТА І СЛОВА

У Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі, дзе праводзілася пасяджэнне выніковай калегіі Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь, мы, па традыцыі, пагутарылі з прадстаўнікамі рэгіёнаў і сталіцы. Тэма кулуарных маналогаў была прысвечана не столькі леташнім здабыткам, колькі сёлетнім задачам і праблемам, што замінаюць іх вырашэнню.

Віктар БАЖАН, начальнік аддзела культуры Жлобінскага райвыканкама:

— Асноўная задача аддзела — годна правесці ў Жлобіне Рэспубліканскі фестываль-кірмаш працаўнікоў вёскі "Дажынкі-2013". Рашэнне гэтае толькі прынята, канкрэтыкі па падрыхтоўцы аб'ектаў да дзяржаўнага свята яшчэ няма, але мы хацелі б, натуральна, каб кожнай гарадскай установе культуры была нададзена ўвага. На давядзенне да ладу музея мы ўжо атрымалі грошы. Будуць узведзены новыя гасцініца і дзіцячы садок... Зробім усё для таго, каб абноўленае аблічча займелі ДШМ № 1, Дом культуры, Цэнтральная і Дзіцячая бібліятэкі...

А год мінулы мы завяршылі няблага. Дасягнулі практычна ўсіх даведзеных паказчыкаў. План па аказанні платных паслуг выканалі больш чым на 120 працэнтаў у супастаўных цэнах пры плане 106,6 працэнта.

Уладзімір ЦЯРЭНЦЬЕЎ, намеснік старшыні Віцебскага аблвыканкама:

— Яшчэ летась распачалі работу над канцэпцыяй XXII Міжнароднага фестывалю мастацтваў "Славянскі базар у Віцебску". Рэгулярна праходзяць пасяджэнні арганізацыйнага камітэта. Літаральна сёння, пасля пасяджэння выніковай калегіі, збіраемся па гэтым пытанні ў міністра культуры... Натуральна, мы імкнёмся, каб чарговы фэст нечым адрозніваўся ад папярэдняга. Сёлета, да прыкладу, хочам фінальны канцэрт фестывальнага дзіцячага конкурсу правесці не на сцэне Канцэртнай залы "Віцебск", а ў Амфітэатры. Канцэрт гэты, сапраўды, — заўжды цікавы і аншлагавы. Увогуле, фестываль стаў для свету яркай візітоўкай Беларусі. І гэты пашанотны статус мы будзем усяляк умацоўваць!..

Паважаныя калегі! Шаноўныя госці!

Дазвольце вас сардэчна прывітаць на нашым прадстаўнічым сходзе з нагоды падвядзення вынікаў дзейнасці сферы культуры ў 2012 годзе і неабходнасці акрэсліць канкрэтныя падыходы да развіцця культуры Беларусі ў 2013 годзе.

Спачатку хацеў бы засяродзіць вашу ўвагу на тых "трох кітах", на якіх грунтуецца дзейнасць любой, у тым ліку і нашай, галіны. Гэта фінансава-эканамічнае становішча, матэрыяльна-тэхнічная база і кадравае забеспячэнне.

КУЛЬТУРА-2013: КАНКРЭТНЫЯ ПАДЫХОДЫ

Даклад міністра культуры Рэспублікі Беларусь Барыса Святлова на выніковай калегіі Міністэрства культуры

Фота Юрыя ІВАНОВА

САЦЫЯЛЬНА-ЭКАНАМІЧНАЕ РАЗВІЦЦЁ ГАЛІНЫ

Як і ў мінулыя гады, бюджэт у 2012-м з'яўляўся значнай і стабільнай крыніцай фінансавання культуры. У 2012 годзе аб'ём бюджэтных сродкаў на ўтрыманне і развіццё сферы культуры (без уліку сродкаў на капітальнае будаўніцтва) склаў, паводле папярэдніх даных, 0,58% ад валавога ўнутранага прадукту (2011-ы — 0,50%). На 2013 год прадугледжаны бюджэтныя сродкі на культуру ў памеры 0,59% ад запланаванага валавога ўнутранага прадукту.

Фінансава-эканамічная выснова нашай дзейнасці — гэта Дзяржаўная праграма "Культура Беларусі" на 2011 — 2015 гады, на рэалізацыю якой у 2012-м былі прадугледжаны сродкі ў аб'ёме 254,9 млрд. рублёў. На фінансаванне названай праграмы ў 2013 годзе прадугледжаны сродкі ў аб'ёме 399,5 млрд. рублёў, што на 57% больш, у параўнанні з 2012-м.

На працягу 2012 года Міністэрствам культуры праводзілася работа па забеспячэнні выканання ў поўным аб'ёме паказчыкаў, якія вызначаны названай праграмай, у тым ліку па павелічэнні дзяржаўнымі арганізацыямі культуры пазабюджэтных (уласных) даходаў. Па выніках работы за 2012 год пазабюджэтныя паступленні дзяржаўных арганізацый сістэмы Міністэрства культуры склалі 556,2 млрд. рублёў, што на 85% больш у параўнанні з 2011 годам пры плане 5%. У 2013-м плануецца рост пазабюджэтных сродкаў не менш за 5%, у параўнанні з папярэднім годам, што складзе каля 585 млрд. рублёў.

Сума спонсарскай дапамогі, атрыманая арганізацыямі сістэмы Міністэрства культуры, вырасла за 2012 год, у параўнанні з 2011-м, у 1,6 раза.

У бягучым годзе нам неабходна прадоўжыць сістэмную работу, накіраваную на прыцягненне спонсарскай дапамогі ў сферу культуры.

У 2012 годзе выдаткі на культуру ў адпаведнасці з планамі бюджэтнага фінансавання і прагнознымі аб'ёмамі платных паслуг у культуры з разліку на аднаго жыхара ў сярэднім па рэспубліцы склалі 3,7 базавай велічыні, у тым ліку за кошт сродкаў бюджэту — 3,2 базавай велічыні, платных паслуг — 0,5 базавай велічыні.

За 2012 год выручка ад рэалізацыі прадукцыі (работ, паслуг) па нашых 9 камерцыйных прадпрыемствах у цэлым склала 175,6 млрд. рублёў пры плане 143,7 млрд. рублёў. Рэнтабельнасць продажаў дасягнула 14% пры плане 9,8%. Камерцыйнымі прадпрыемствамі атрыманы чысты прыбытак у памеры 21,5 млрд. рублёў. Стратных прадпрыемстваў у нашай галіне ў 2012 годзе не было.

(Працяг на стар. 4.)

КУЛЬТУРА-2013: КАНКРЭТНЫЯ ПАДЫХОДЫ

Даклад міністра культуры Рэспублікі Беларусь Барыса Святлова на выніковай калегіі Міністэрства культуры

(Працяг. Пачатак на стар. 3.)

Але, у той жа час, не выканалі мэтавыя паказчыкі бізнес-планаў развіцця 2 камерцыйныя прадпрыемствы: "Віцебск-Белпрамкультура" і "Нацыянальная кінастудыя "Беларусьфільм". Звяртаю вашу увагу на недапушчальнасць такіх "вынікаў" у 2013 годзе.

Вельмі важным паказчыкам сацыяльна-эканамічнага развіцця галіны з'яўляецца станоўчае сальда па знешнім гандлі і паслугах культуры.

Так, у 2012 годзе, у параўнанні з 2011-м, па арганізацыях Міністэрства культуры чакаецца тэмп росту экспарту паслуг на ўзроўні 133,4%, імпарту паслуг — на ўзроўні 129,5%. Найбольшы аб'ём экспарту паслуг аказваецца Нацыянальнай кінастудыяй "Беларусьфільм" і ўстановамі адукацыі. Найбольшы аб'ём імпарту паслуг прыйшоўся на тэатральна-відовішчныя арганізацыі і Дзяржаўны музей гісторыі Вялікай Айчыннай вайны. Сальда па знешнім гандлі паслугамі за 2012 год прагназуецца ў суме 2 308 тыс. дол. ЗША і павялічылася, у параўнанні з 2011-м, на 632,4 тыс. дол. ЗША.

На 2013 год пастаўлена задача павелічэння экспарту паслуг у памеры не менш чым на 9%, у параўнанні з мінулым годам, у тым ліку Нацыянальнай кінастудыяй "Беларусьфільм" — не менш чым на 15%, іншых арганізацый культуры, падпарадкаваных Міністэрству культуры, — не менш чым на 5%, устаноў адукацыі ў сферы культуры — не менш чым на 4%. Гэта дазволіць забяспечыць станоўчае сальда.

Падкрэсліваю таксама, што ў сувязі з даручэннем Кіраўніка дзяржавы ў 2013 годзе Міністэрству культуры сумесна з падпарадкаванымі арганізацыямі неабходна забяспечыць далейшую аптымізацыю выдаткаў сродкаў рэспубліканскага бюджэту на рэстаўрацыю і рэканструкцыю гісторыка-культурных каштоўнасцей, правядзенне культурных мерапрыемстваў, а таксама павелічэнне аб'ёмаў пазабюжетных сродкаў, што накіроўваюцца на названыя мэты.

А ў цэлым сацыяльна-эканамічныя паказчыкі дзейнасці арганізацый сістэмы Міністэрства культуры сістэматызаваны і зацверджаны Планам развіцця культурнай дзейнасці на 2013 год, на няўхільнае выкананне якога я звяртаю вашу ўвагу.

І напрыканцы разгляду пытанняў сацыяльна-эканамічнага развіцця галіны адзначу, што сярэдняя заработная плата работнікаў культуры за студзень — снежань 2012 г. склала 2514,7 тыс. рублёў.

Аналіз стану аплаты працы паказвае, што ўзровень сярэднямесячнай заработнай платы работнікаў культуры да сярэдняй заработнай платы па рэспубліцы складае 67%. Выклікае заклапочанасць наяўнасць тэндэнцыі зніжэння на працягу апошніх гадоў працэнту сярэднямесячнай заработнай платы работнікаў культуры ў адносінах да сярэднямесячнай заработнай платы па рэспубліцы.

Намі робяцца пэўныя захады па выпраўленні гэтай сітуацыі. У адпаведнасці з даручэннем Кіраўніка дзяржавы ўжо сёння распрацоўваецца праект Указа, што датычыцца павышэння аплаты працы супрацоўнікаў музеяў, тэатральна-відовішчных арганізацый і прафесійных калектываў мастацкай творчасці, якім прысвоены статус "нацыянальны".

Але ў сітуацыі, што склалася, неабходна накіраваць намаганні саміх арганізацый культуры на павелічэнне пазабюджэтных сродкаў з мэтай іх накіравання на стымулюючыя выплаты работнікам.

МАТЭРЫЯЛЬНА-ТЭХНІЧНАЯ БАЗА

Па-ранейшаму адной з актуальных задач у 2012 годзе з'яўлялася паступовае ўмацаванне і развіццё матэрыяльна-тэхнічнай базы ўстаноў культуры.

У Дзяржаўную інвестыцыйную праграму на 2012 год было ўключана 15 аб'ектаў устаноў культуры з аб'ёмам фінансавання ў памеры 430 859,943 млн. руб. У параўнанні з 2011 годам, аб'ём інвестыцый узрос на 227%.

Вытворчасць работ ажыццяўлялася на 11 аб'ектах культуры, на 4 аб'ектах культуры выконваліся работы по распрацоўцы праектна-каштарыснай дакументацыі. Працэнт асваення выдзеленых сродкаў склаў 92%.

(Працяг на стар. 5.)

Падводзячы вынікі за 2012 год, адзначым, што для Гродзеншчыны значнымі падзеямі сталі правядзенне ў Гродне Першага Нацыянальнага форуму "Музеі Беларусі", IX Рэспубліканскага фестывалю нацыянальных культур, перамога ў 4 намінацыях на II Нацыянальнай тэатральнай прэміі Абласнога тэатра лялек, I прэмія на конкурсе маладых выканаўцаў Нацыянальнага фестывалю беларускай песні і паэзіі "Маладзечна-2012" (салістка абласной філармоніі Дар'я Шульгіна)... У вобласці прайшоў 21 фестываль. Творчая дзейнасць была скіравана на забеспячэнне захавання і развіцця беларускай культуры.

У абласную інвестыцыйную праграму на 2012 год было ўключана 13 устаноў культуры, выдзелена 155 млрд. рублёў. У 2013 годзе будуць прадоўжаны работы на чатырох аб'ектах. З завяршэннем у першым паўгоддзі 2013-га работ на Слонімскім драматычным тэатры будуць у поўным аб'ёме выкананы мерапрыемствы Праграмы рэканструкцыі і тэхнічнага пераабсталявання дзяржаўных тэатраў. Будуць прадоўжаны работы па рэканструкцыі абласной філармоніі, сядзібы М.К. Агінскага ў в. Залессе Смаргонскага раёна, Маладзёжнага цэнтра на праспекце Касманаўтаў.

Праблема прывядзення ў належны стан устаноў культуры вобласці, якія не

ўвайшлі ў Інвестыцыйную праграму, значным чынам вырашаецца за кошт правядзення работ гаспадарчым спосабам, калі фінансавыя сродкі выдзяляюцца толькі на закупку матэрыялаў, а работы выконваюцца гаспадарчымі групамі аддзелаў культуры ці па дагаворах падраду з фізічнымі асобамі.

За 2012 год на гэтыя мэты накіравана 12,3 млрд. руб. Адрамантаваны Гродзенскі дзяржаўны каледж мастацтваў — 1071,6 млн. руб.; Гродзенскі абласны метадычны цэнтр народнай творчасці — 574,4 млн. руб.; Дзіцячая школа мастацтваў у Слоніме — 797,9 млн.руб.

Праблема забеспячэння тэатральна-відовішчных устаноў вобласці тэхнікай, музычнымі інструментамі, транспартам вырашана з дапамогай старшыні Гродзенскага аблвыканкама Сямёна Барысавіча Шапіры, які сустракаўся з творчымі калектывамі, кіраўнікамі ўстаноў на працягу 2012 года звыш дзесяці разоў. Па выніках сустрэч прынята рашэнне аб выдзяленні дадаткова 10 млрд. руб на набыццё музычных інструментаў, аўтатранспарту, апаратуры для гэтых устаноў.

Задачай, над якой працавалі аддзелы культуры вобласці ў 2012 годзе, было скарачэнне сеткі ўстаноў культуры. Улічваючы абставіны змянення дэмаграфічнай сітуацыі ў вобласці, падыходзячы рацыянальна да выкарыстання бюджэтных сродкаў, за мінулы год сетка ўстаноў скарацілася на 58 бібліятэк і 15 дамоў культуры. Эканомія бюджэтных сродкаў склала 1 млрд. руб.

Гэты працэс неадназначна ўспрымаецца як работнікамі ўстаноў культуры, што закрываюцца, так і жыхарамі тых населеных пунктаў, дзе адбываюцца гэтыя працэсы. У сувязі з гэтым значна павялічваюцца звароты-скаргі ў розныя вышэйстаячыя арганізацыі. Для забеспячэння жыхароў такіх вёсак паслугамі культуры арганізавана работа аўтаклубаў і бібліобусаў. Нельга назваць гэта раўнацэннай заменай, аднак у дадзеным выпадку ўсё залежыць ад граматнай арганізацыі працы (складанне прымальных для насельніцтва графікаў, стварэнне мабільных творчых калектываў).

Для ўдасканалення пазастацыянарнага абслугоўвання жыхароў населеных пунктаў упраўленнем культуры на 2013 год запланавана набыццё новых машын з сучасным абсталяваннем для цэнтралізаваных бібліятэчных сістэм Ваўкавыскага, Дзятлаўскага, Шчучынскага раёнаў.

У 2012 годзе скончылася стварэнне пастаяннай экспазіцыі ў Гродзенскім дзяржаўным музеі гісторыі рэлігіі. Развіццё музейнай справы ў рэгіёнах вобласці наўпрост залежыць ад якасці пастаянных экспазіцый, ад іх актуальнасці і адпаведнасці сучасным патрабаванням. 6 музеяў вобласці працуюць без пастаянных экспазіцый. Пры планаванні бюджэтнага фінасавання на 2013 год упраўленнем культуры ўлічана неабходнасць завяршэння работ па стварэнні пастаянных экспазіцый у Ашмянскім, Смаргонскім, Іўеўскім, Бераставіцкім музеях.

Праблемай для ДШМ, музычных школ з'яўляецца недахоп музычных інструментаў, а таксама тое, што многія з іх па сваім тэхнічным стане патрабуюць рамонту або замены. Для вырашэння гэтага пытання Гродзенскі гарадскі і раённыя выканаўчыя камітэты пачынаючы з 2013-га будуць штогод прадугледжваць фінансавыя сродкі на набыццё музычных інструментаў у памеры не менш за 5% ад бюджэтнага фінансавання, якое выдаткоўваецца на ўтрыманне дзіцячых школ мастацтваў (без уліку сродкаў, накіраваных на рамонтныя работы).

У вобласці створаны ўмовы для развіцця сферы культуры, пры якіх бюджэт з'яўляецца значнай і стабільнай крыніцай фінансавання. Расходы абласнога і мясцовага бюджэтаў на ўтрыманне ўстаноў культуры (без уліку сродкаў на капітальнае будаўніцтва) склалі ў 2010 годзе — 120 млрд. руб., або 3,4% у бюджэтных расходах вобласці, у 2011 годзе — 190,2 млрд. руб. (3,7%), за 2012 год — 375 млрд. руб. (3,8%).

Разам з тым, важнай умовай развіцця ўстаноў культуры, паляпшэння матэрыяльна-тэхнічнай базы, павышэння заработнай платы з'яўляецца атрыманне даходаў ад ажыццяўлення пазабюджэтнай дзейнасці ў 2011 годзе — 13,7 млрд. руб, за 2012 год — 30,7 млрд. руб., што ў 2,2 раза больш, чым у адпаведны перыяд 2011-га. На 2013 год запланавана атрымаць 50 млрд. руб.

Адной з крыніц паляпшэння матэрыяльна-тэхнічнай базы з'яўляецца прыцягненне інвестыцый. У 2011 годзе былі адобраны праекты міжнароднага тэхнічнага супрацоўніцтва Смаргонскага (212,0 тыс. еўра), Мастоўскага (201,4 тыс. еўра), Ашмянскага (8 тыс. еўра) аддзелаў культуры і г. Гродна (40,9 тыс. еўра), якія пачалі рэалізоўвацца ў 2012-м, на агульную суму ў 501,4 тыс. еўра.

У 2012 годзе былі адобраны праекты трансгранічнага супрацоўніцтва аддзелаў культуры Свіслацкага (29,9 тыс. еўра), Ашмянскага (58,5 тыс. еўра), Лідскага (56,0 тыс. еўра) і Воранаўскага (18,5 тыс. еўра) раёнаў, ДУК "Гродзенскі музей Максіма Багдановіча" (81,8 тыс. еўра), якія пачнуць рэалізоўвацца ў 2013-м, на агульную суму ў 575,1 тыс. еўра. У адпаведных міністэрствах Рэспублікі Беларусь праходзіць узгадненне праект Гродзенскай абласной бібліятэкі на суму ў 589 тыс. еўра.

Праблемай застаецца даволі нізкая заработная плата па галіне культуры. За 2012 год яна склала па вобласці 2413 тыс. руб., або 71,6% ад сярэднеабласной. Безумоўна, шляхамі яе павелічэння павінна стаць павелічэнне з бюджэту за кошт аптымізацыі сеткі, аднак у вобласці ставіцца задача павелічэння заработнай платы таксама і за кошт накіравання сродкаў на яе павелічэнне з пазабюджэтных ды ўласных даходаў. Для іх павелічэння ў вобласці запланаваны новыя творчыя мерапрыемствы: фестывалі сыру, квасу, традыцыйнай культуры "Скарбы Гродзеншчыны", вулічных тэатраў, свята лялечных тэатраў і многія іншыя.

Прапануем штогод даводзіць паказчык матэрыяльнага стымулявання спецыялістаў з фондаў спажывання ў разліку на аднаго працуючага.

У вобласці выкананы амаль усе паказчыкі Дзяржпраграмы "Культура Беларусі", аднак значнае скарачэнне колькасці бібліятэк і клубаў (на 2013 год плануецца закрыць яшчэ больш за 40 устаноў; плануемая эканомія — 2,9 млрд. руб.) не дазволіла выканаць колькасны паказчык па павелічэнні клубных фарміраванняў.

Прапануем, з улікам значнага скарачэння сеткі клубных устаноў, бібліятэк, перагледзець колькасныя паказчыкі праграмы па павелічэнні клубных фарміраванняў ды працэнтнага абнаўлення кніжнага фонду і паказчык павелічэння колькасці наведванняў.

Аляксандр ВЯРСОЦКІ,
начальнік упраўлення культуры Гродзенскага абласнога выканаўчага камітэта **(з выступлення)**:

"Колькасныя паказчыкі. Патрэбен перагляд"

КУЛУАРЫ: ПРАЗ ФОТА І СЛОВА

Юрый КУЛЕНІЧ,
начальнік аддзела культуры Івацэвіцкага райвыканкама:

— Распачынаем, як і паўсюдна па рэспубліцы, няпросты працэс аптымізацыі. Ён прымусіць нас значна павялічыць эфектыўнасць работы мабільных устаноў культуры. Да слова, дзейнасць нашага аўтаклуба па колькасці выездаў і якасці абслугоўвання сельскага насельніцтва прызнана лепшай на Брэстчыне...

У раёне няма Дома рамёстваў, а вельмі развіта вышыўка. Закладваюцца іншыя асновы для ўдасканалення іншых мясцовых традыцыйных промыслаў і абрадаў. Думаю, і Дом рамёстваў у нас з'явіцца. Прынамсі, пастараемся сёлета многае для гэтага зрабіць...

КУЛЬТУРА-2013: КАНКРЭТНЫЯ ПАДЫХОДЫ

Даклад міністра культуры Рэспублікі Беларусь Барыса Святлова на выніковай калегіі Міністэрства культуры

(Працяг. Пачатак на стар. 3, 4.)

Прычына — у недасканалай дзейнасці заказчыка — "Аб'яднанай дырэкцыі будуючыхся аб'ектаў".

Я лічу, што менавіта з яе боку адсутнічаў дзейсны кантроль за выкананнем дагавораў з будаўнічымі і праектнымі арганізацыямі, з пастаўшчыкамі абсталявання; тэндары праводзіліся запознена, па некалькі разоў, якасць іх правядзення была нізкая; неэфектыўна і марудна ішла праца пусканаладачных арганізацый.

На мой погляд, надышоў час змяніць кіраўніцтва "Аб'яднанай дырэкцыі будуючыхся аб'ектаў" і навесці адпаведны парадак у яе дзейнасці.

У адпаведнасці з пастановай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 26 мая 2010 г. № 797, у 2012 годзе ажыццяўлялася работа па рэканструкцыі і тэхнічным пераабсталяванні дзяржаўных тэатраў Рэспублікі Беларусь. Выдзеленыя сродкі на 2012 год асвоены ў поўным аб'ёме. Канчаткова ўсе работы неабходна завяршыць у 2013-м.

У сувязі з недахопам фінансавання выклікае занепакоенасць завяршэнне работ на аб'ектах у адпаведнасці з Праграмай рэканструкцыі і тэхнічнага пераабсталявання тэатраў Рэспублікі Беларусь.

Таму, упраўленням культуры Брэсцкага аблвыканкама і Мінскага гарвыканкама неабходна ў бліжэйшы час забяспечыць аб'екты адпаведнымі сродкамі з мэтай выканання Праграмы ў 2013 годзе ў поўным аб'ёме.

У 2012 годзе працягвалася праца па ўмацаванні матэрыяльна-тэхнічнай базы арганізацый культуры. У адпаведнасці з выдаткаванымі сродкамі былі закуплены музычныя інструменты, кінатэхналагічнае абсталяванне, гукаўзмацняльная і асвятляльная апаратура на агульную суму 20,4 млрд. рублёў. У параўнанні з мінулым годам, аб'ём сродкаў, выдзеленых на набыццё тэхнічнага абсталявання і музычных інструментаў, узрос больш чым у 3 разы.

Як і раней, Міністэрства культуры надавала вялікую ўвагу пытанням энергазбяражэння.

Выкананне мэтавага паказчыка па энергазбяражэнні арганізацыямі, падпарадкаванымі Міністэрству культуры, за перыяд студзень — снежань 2012 г., з улікам укаранёных энергазберагальных мерапрыемстваў, запланаваных у адпаведнасці з Праграмай па энергазбяражэнні, склала мінус 3%, што адпавядае ўстаноўленаму заданню на 2012 год.

Эканомія паліўна-энергетычных рэсурсаў у галіне за студзень — снежань 2012 года ад праведзеных энергазберагальных мерапрыемстваў у рамках выканання Рэспубліканскай праграмы энергазбяражэння склала 1 604 тоны ўмоўнага паліва, у тым ліку па ўстановах культуры рэспубліканскай уласнасці 303 тоны ўмоўнага паліва.

Разам з тым, асобнымі ўстановамі рэспубліканскага падпарадкавання такімі, як "Беларускі відэацэнтр", "Інстытут культуры Беларусі", перыядычна не выконваўся паказчык па энергазбяражэнні, не прадстаўляліся своечасова справаздачы, неабгрунтавана дапускалася перавыдаткаванне паліўна-энергетычных рэсурсаў.

У 2013 годзе арганізацыям культуры неабходна прыняць дадатковыя меры па выкананні паказчыка па энергазбяражэнні з улікам новых патрабаванняў.

У мінулым годзе Міністэрствам культуры была праведзена значная работа ў частцы пытанняў аховы працы і пажарнай бяспекі.

Аднак у 2012 годзе ў падначаленых арганізацыях адбыліся 4 няшчасныя выпадкі, з іх 2 — з цяжкім зыходам.

Асноўнымі прычынамі вытворчага траўматызму па-ранейшаму з'яўляюцца: парушэнне пацярпелымі працоўнай і вытворчай дысцыпліны, інструкцый па ахове працы; невыкананне кіраўнікамі і спецыялістамі абавязкаў па ахове працы; асабістая неасцярожнасць пацярпелага.

У 2013-м арганізацыям культуры неабходна забяспечыць безумоўнае выкананне патрабаванняў Дырэктывы Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь № 1 ад 11 сакавіка 2004 г.

ЗАКАНАДАЎСТВА

Шматлікія пытанні фінансава-эканамічнага характару, праблемы развіцця матэрыяльна-тэхнічнай базы не маглі быць вырашаны без пастаяннай заканатворчай работы ў галіне культуры.

У 2012 годзе працягвалася мэтанакіраваная работа па ўдасканальванні заканадаўства ў нашай сферы шляхам унясення змяненняў і дапаўненняў у законы Рэспублікі Беларусь, прынятыя раней.

(Працяг на стар.6.)

Валянціна ДУБРОВА, дырэктар Гомельскай абласной універсальнай бібліятэкі імя У.І. Леніна **(з выступлення):**

"Аптымізацыя, інтэграцыя і нарматывы"

Цягам апошніх гадоў сістэма публічных бібліятэк Гомельскай вобласці перажывае змены, якія адпавядаюць агульнай дынаміцы сацыяльных і дэмаграфічных працэсаў у рэспубліцы. Так, у сувязі з аптымізацыяй сеткі публічных бібліятэк, звязанай з памяншэннем колькасці сельскага насельніцтва, у вобласці назіраецца штогадовае скарачэнне колькасці бібліятэчных устаноў. У 2012 годзе ў маланаселеных пунктах было закрыта 19 сельскіх бібліятэк, якія працуюць на 0,5 і 0,25 стаўкі (але, у той жа час, у Жлобіне была летась адкрыта публічная бібліятэка). Такім чынам, па стане на 1 студзеня 2013 года ў галіне культуры Гомельшчыны функцыянавала 653 бібліятэкі: абласная, 100 гарадскіх (у тым ліку 22 цэнтральныя), 11 гарпасялковых, 541 сельская бібліятэка.

Каб задаволіць патрэбы людзей, што пражываюць у сельскай мясцовасці, дзе няма стацыянарнай бібліятэкі, прымяняюцца разнастайныя формы абслугоўвання: традыцыйныя (пункты выдачы, кніганошаства) і новыя (перасоўныя бібліятэкі). Аўтабібліятэкі, як паказала практыка, з'яўляюцца найбольш эфектыўнай і дзейснай формай абслугоўвання насельніцтва... Разам з тым, існуюць гэўныя цяжкасці: нашы аўтабібліятэкі не маюць як бібліятэчнага, так і тэхнічнага абсталявання. Літаратура перавозіцца ў скрынках, што ўскладняе працу з ёй.

У 2011 — 2012 гадах на Гомельшчыне ладзіўся эксперымент па стварэнні інтэграваных устаноў шляхам аб'яднання сельскіх публічных і школьных бібліятэк...

...Усяго ў эксперыменце прыняло ўдзел 218 бібліятэк сістэмы Мінкультуры і 109 бібліятэк агульнай сярэдняй адукацыі сістэмы Міністэрства адукацыі. У цэлым па рэспубліцы эканомія бюджэтных сродкаў ад правядзення эксперыментаў склала 1,3 мільярда рублёў...

...З мэтай вывучэння магчымасці аб'яднання сельскіх і школьных бібліятэк была створана рабочая група, якая з лістапада 2011 года па красавік 2012 года наведала ўсе раёны вобласці і 340 маланаселеных пунктаў.

Па стане на 1 студзеня ў вобласці функцыянавалі 54 інтэграваныя ўстановы сістэмы Мінкультуры. 19 з іх размешчаны ва ўстановах адукацыі, астатнія — ва ўстановах культуры ды ў іншых (напрыклад, у сельскім Савеце). Пры аб'яднанні ўлічваліся наступныя асноўныя крытэрыі: дэмаграфічная сітуацыя (колькасць жыхароў, якія пражываюць у дадзеным населеным пункце), матэрыяльна-тэхнічная база гэтых устаноў, агульная плошча бібліятэкі, наяўнасць прафесійных кадраў.

У выніку праведзенай работы сельскія бібліятэкі былі пераведзены з не заўсёды ацяпляльных памяшканняў, многія з якіх патрабавалі капітальнага рамонту, у будынкі школ. Іншымі словамі, была значна палепшана матэрыяльна-тэхнічная база бібліятэк. Таксама вельмі важна і тое, што размяшчэнне публічнай бібліятэкі ў сельскай школе, дзе колькасць навучэнцаў меншая за прадугледжаны нарматыў, дазваляе больш эфектыўна выкарыстоўваць памяшканні і аб'ядноўваць творчыя сілы пры правядзенні культурна-дасугавых мерапрыемстваў для дзяцей.

Фонды кожнай інтэграванай бібліятэкі склаліся з літаратуры па ўсіх галінах ведаў за кошт фондаў сельскай і школьнай бібліятэк, пашырыўся "рэпертуар" перыядычных выданняў. Стаў даступным для ўсіх чытачоў бібліятэчны фонд Цэнтралізаванай бібліятэчнай сістэмы з яго шырокім дыяпазонам дакументаў: кнігі, кампакт-дыскі, электронныя рэсурсы.

Аб'яднанне бібліятэк прадугледжвае выключэнне дубліравання ў камплектаванні фондаў, што таксама прывядзе да эканоміі бюджэтных сродкаў і да больш якаснага камплектавання фондаў інтэграваных устаноў. Праца па аб'яднанні будзе прадоўжана і ў 2013 — 2014 гадах.

Нягледзячы на бурнае развіццё інфармацыйных тэхналогій — аўдыявізуальных ды інтэрактыўных сродкаў камунікацый, — друкаваная прадукцыя да гэтага часу застаецца запатрабаваным, а часам і адзіным сродкам інфармацыі, які пакліканы, у тым ліку, задавальняць і духоўныя патрэбы чытачоў.

Сукупны фонд публічных бібліятэк вобласці па выніках работы за мінулы год склаў каля 10 мільёнаў розных крыніц інфармацыі, што на 974,5 тысячы экзэмпляраў менш, чым у 2011-м. 48,5% фонду сканцэнтравана ў сельскіх філіялах. Асноўная яго частка — дакументы на папяровых носьбітах (84%), электронныя дакументы складаюць менш за 1%.

Асноўнай крыніцай фінансавання камплектавання фондаў публічных бібліятэк застаецца дзяржаўны бюджэт (абласны і мясцовы). Аб'ём фінансавых сродкаў у 2012 годзе склаў 13 897,6 мільёна рублёў, што амаль ўдвая больш, чым у 2011-м (7 751,7 мільёна рублёў).

Пры гэтым летась была набыта 491 тысяча экзэмпляраў новых выданняў (у 2011-м — 436,9 тысячы). Розніца, як бачыце, — не вельмі значная. Звязана гэта з падаражаннем друкаванай прадукцыі, асабліва перыядычных выданняў.

Колькасць новых паступленняў наўпрост звязана з выкананнем нарматыву па камплектаванні фондаў бібліятэк (не менш за 15% ад агульнай сумы бюджэтнага фінансавання, згодна з даручэннем Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, дадзенага 29 верасня 2005 года).

Па выніках 2012 года ў сярэднім па рэспубліцы на камплектаванне фондаў публічных бібліятэк з сумы бягучага бюджэту фінансавання выдаткавана 16%, у тым ліку ў Брэсцкай вобласці — 15,8%, Віцебскай — 16,1%, Гомельскай — 18%, Гродзенскай — 15,3%, Магілёўскай — 15,1%, Мінскай — 16,5%, у Мінску — 15,2%.

На сёння склалася сітуацыя, пры якой нарматыў 15% перавыконваецца, але пры гэтым паказчык "абнаўляльнасць фондаў" (павінен быць роўны 5%, у адпаведнасці з Дзяржпраграмай "Культура Беларусі на 2011 — 2015 гады) — не выкананы.

Намі быў праведзены аналіз стану фондаў публічных бібліятэк Гомельскай вобласці, які паказаў самую высокую кнігазабяспечанасць (г. зн. колькасць кніг на кожнага чытача), роўную 18,3 (прытым што сярэднерэспубліканскі паказчык роўны 17). Самы ж нізкі паказчык зваротаў (г. зн. запатрабаванасць кожнай кнігі) — 1,01 (сярэднерэспубліканскі — 1,09).

Цяпер у фондах назапасілася вялікая колькасць літаратуры 1970 — 80-х гадоў, якая страціла актуальнасць і не запатрабавана чытачамі. Прыняцце рашэння аб адначасовым спісанні гэтай часткі фонду дазволіла б не толькі пазбавіць бібліятэкі ад баласту, але і больш рацыянальна выкарыстоўваць бюджэтныя сродкі на абнаўленне фондаў. Такое рашэнне было прынята на рэгіянальным узроўні. Павелічэнне аб'ёму фінансавання на камплектаванне і праца па адначасовым спісанні фондаў дазволілі дасягнуць ды перавыканаць паказчык "абнаўляльнасць".

Па рэспубліцы паказчык выкананы не ў поўным аб'ёме. Абнаўленне фондаў па рэспубліцы склала 4,8%, у тым ліку ў Брэсцкай вобласці — 4,3%, Віцебскай — 5,4%, Гомельскай — 5,2%, Гродзенскай — 3,7%, Магілёўскай — 4,2%, Мінскай — 5,1%, г. Мінск — 5,8%. Паўстае пытанне аб правамернасці прымянення 5% паказчыка ў адносінах да буйных бібліятэках, фонды якіх у большай частцы — мемарыяльныя і разлічаны на доўгае захоўванне. А гэта значыць, што ў праграму "Культура Беларусі" на 2011 — 2015 гады неабходна, на маю думку, уносіць папраўкі.

Папаўняліся бібліятэчныя фонды выданнямі, якія выпускаюцца ў рамках дзяржзаказу. І калі ў 2011 годзе бібліятэкамі вобласці было набыта 26,3 тысячы экзэмпляраў такіх выданняў, дык у 2012-м — 29,9 тысячы экзэмпляраў.

У Год кнігі дзейнасць бібліятэк была скіравана на прыцягненне ўвагі да кнігі і чытання, што дазволіла бібліятэкам выканаць паказчык праграмы "Культура Беларусі" на 2011 — 2015 гады. Адбылося павелічэнне колькасці наведванняў бібліятэк, у тым ліку аддаленых карыстальнікаў (на 1% штогод). У цэлым жа па рэспубліцы паказчык па выніках 2012-га павялічыўся на 1,4%, у тым ліку ў Брэсцкай вобласці — 4,0%, Віцебскай — 0,8%, Гомельскай — 1,5%, Гродзенскай — 1,5%, Магілёўскай — 1,6%, Мінскай — 0,9%.

Змена і карэкціроўка фарматаў дзейнасці, прымяненне інавацыйных метадаў ды прыёмаў у рабоце з карыстальнікамі дазволілі захаваць становішча і статус бібліятэк у культурнай прасторы рэспублікі. А самі бібліятэкі назапасілі неабходны патэнцыял для развіцця.

КУЛУАРЫ: ПРАЗ ФОТА І СЛОВА

Уладзімір МАРОЗ, вядучы рэдактар студыі "Летапіс" Нацыянальнай кінастудыі "Беларусьфільм":

— Сёлета тэматычная праграма нашай студыі «Летапіс» — досыць разнастайная і цікавая. Ужо гатова карціна пра першага міністра замежных спраў БССР Кузьму Кіслёва. Чакаем завяршэння сумеснай беларуска-французскай стужкі «Цені Нарвялішак». Неўзабаве запускаецца фільм «Афганцы» — пра лёсы воінаў-інтэрнацыяналістаў. Дзве карціны прысвечаны мастакам-інвалідам з Івацэвіччыны і Стаўбцоўшчыны, рэжысёры — Юрый Цімафееў і Вольга Дашук. Па маім сцэнарыі Яўген Сяцько мяркуе зняць фільм пра паэта Леаніда Дранько-Майсюка...

КУЛЬТУРА-2013: КАНКРЭТНЫЯ ПАДЫХОДЫ

Даклад міністра культуры Рэспублікі Беларусь Барыса Святлова на выніковай калегіі Міністэрства культуры

(Працяг. Пачатак на стар. 3 — 5.)

Так, змяненні ў Закон Рэспублікі Беларусь "Аб кінематаграфіі ў Рэспубліцы Беларусь" былі накіраваны на стварэнне ўмоў для прыцягнення сродкаў юрыдычных і фізічных асоб для фінансавання кінематаграфіі, на фарміраванне і развіццё канкурэнтнага асяроддзя ў галіне кінавытворчасці.

Гэтым жа мэтам служылі зацверджаныя пастановамі Савета Міністраў Палажэнне аб Адкрытым рэспубліканскім конкурсе кінапраектаў на вытворчасць нацыянальных фільмаў і фільмаў у рамках сацыяльна-творчых заказаў, Палажэнне аб парадку выдачы крэдытаў на вытворчасць нацыянальных фільмаў і фільмаў у рамках сацыяльна-творчых заказаў, а таксама Інструкцыя аб парадку пакрыцця прадзюсарскіх рызык, зацверджаная пастановай Міністэрства культуры.

Унесеныя змяненні ў Закон Рэспублікі Беларусь "Аб культуры ў Рэспубліцы Беларусь" вызначылі органы, правамоцныя прысвойваць званні, статусы ў сферы культуры, акрэслілі асаблівасці прававога становішча і парадку дзейнасці тэатраў, цыркаў, канцэртных арганізацый, арганізацый культуры змяшанага тыпу, далі магчымасць ствараць у арганізацыях культуры апякунскія саветы, а ў тэатрах, цырках, канцэртных арганізацыях па рашэнні самой арганізацыі — мастацкія саветы.

Прынятыя змяненні ў Закон Рэспублікі Беларусь "Аб ахове гісторыка-культурнай спадчыны Рэспублікі Беларусь" паспрыялі павышэнню эфектыўнасці аховы гісторыка-культурнай спадчыны, спрасцілі шэраг працэдур, удасканалілі парадак аховы археалагічных аб'ектаў і нематэрыяльных гісторыка-культурных каштоўнасцей, імплементавалі ў нацыянальнае заканадаўства некаторыя палажэнні міжнародных дагавораў.

Яшчэ адно важнае дасягненне ў нашым заканадаўстве — прыняцце Палажэння аб правядзенні рэспубліканскай акцыі "Мецэнат культуры Беларусі", што дазволіла закласці аснову для адраджэння і развіцця ў Рэспубліцы Беларусь традыцый мецэнацтва.

Быў распрацаваны таксама праект Закону Рэспублікі Беларусь "Аб унясенні змяненняў і дапаўнення ў Закон Рэспублікі Беларусь "Аб народным мастацтве, народных промыслах (рамёствах) у Рэспубліцы Беларусь". Прапанаваны законапраект прыняты ў Палаце прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь без заўваг у першым чытанні.

Работа над заканадаўствам у галіне культуры ў мінулым годзе набывала ўсё больш сістэмны характар дзякуючы распрацоўцы праекта Кодэкса аб культуры, канцэпцыя якога была адобрана Кіраўніком нашай краіны.

Стварыць Кодэкс, які сістэматызаваў бы заканадаўства ў сферы культуры і мастацтва, спрашчаў яго прымяненне, — гэта задача на бягучы і бліжэйшыя гады.

КАДРЫ

Стратэгія развіцця краіны дыктавала ў мінулым годзе неабходнасць актыўнай кадравай палітыкі, пастаяннага ўдасканалення гэтай працы, падрыхтоўкі якаснага рэзерву для прызначэння на кіруючыя пасады, арганізацыі зладжанай сістэмы навучання, павышэння кваліфікацыі кадраў.

У сістэме Міністэрства культуры на канец 2012 года працавала 49,5 тыс. чалавек (без рабочых прафесій).

Большасць з іх (88,7%) складалі спецыялісты з вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыяй, у тым ліку вышэйшую адукацыю мелі 43,6%, сярэднюю спецыяльную — 45,1% працуючых. У параўнанні з 2011 годам колькасць спецыялістаў у галіне павялічылася на 0,5%, у тым ліку з вышэйшай адукацыяй — на 0,7%.

Найлепшы паказчык укамплектаванасці спецыялістамі з адукацыяй мелі установы культуры і мастацтва г. Мінска (95%) і Гродзенскай вобласці (92%).

У мінулым годзе актывізавалася праца па арганізацыі стажыровак за мяжой работнікаў сферы культуры. За мінулы год прайшлі стажыроўку 23 чалавекі ў вядучых установах вышэйшай адукацыі і тэатрах Расіі, Германіі, Кітая, Польшчы ды іншых краінах.

За 2012 год 12 чалавек прайшлі павышэнне кваліфікацыі ў Інстытуце дзяржаўнай службы Акадэміі кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь.

(Працяг на стар. 7.)

Святлана КАЗЛОВА, дырэктар Магілёўскага дзяржаўнага бібліятэчнага каледжа імя А.С. Пушкіна **(з выступлення)**:

"Як адрэгуляваць адносіны паміж выпускніком і заказчыкам?"

Асноўнай задачай для ўстаноў сярэдняй спецыяльнай адукацыі, у тым ліку сферы культуры, з'яўляецца павышэнне якасці падрыхтоўкі будучых спецыялістаў, эфектыўна адаптаваных і канкурэнтаздольных на рынку працы. У той жа час, паспяховая рэалізацыя пастаўленай задачы немагчымая без фарміравання трывалай сістэмы партнёрскага ўзаемадзеяння. Мадэль дадзенай сістэмы ўключае наступныя звёны: школа — каледж — арганізацыя-заказчык кадраў — ВНУ — дзяржаўныя і мясцовыя органы ўлады.

Пабудаваная на прынцыпах узаемнай зацікаўленасці сістэма партнёрскага ўзаемадзеяння дазваляе вырашыць шэраг актуальных праблем, перш за ўсё такіх, як: пераадоленне наступстваў складанай дэмаграфічнай сітуацыі і ажыццяўленне якаснага набору шля-

хам сумеснай прафарыентацыйнай работы ў школах; ліквідавання дубліравання падрыхтоўкі, актывізацыя тэрмінаў навучання і фінансавых затрат на навучанне, павышэнне адукацыйнага ўзроўню выкладчыкаў каледжа праз узаемасувязь з установамі вышэйшай адукацыі; узмацненне практыкаарыентаванага характару навучання ва ўстанове сярэдняй спецыяльнай адукацыі; скарачэнне тэрміну адаптацыі выпускнікоў на працоўных месцах; узмацненне сацыяльнай абароненасці выпускнікоў...

Асноўным кірункам узаемадзеяння каледж — школа з'яўляецца, натуральна, прафарыентацыйная работа.

Развіваецца ў апошнія гады і ўсё больш умацоўваецца ўзаемадзеянне з БДУКіМ. Нягледзячы на тое, што наша ўстанова адукацыі атрымала статус каледжа ў ліку апошніх у рэспубліцы, бесперапынная інтэграваная сістэма прафесійнай адукацыі "тэхнікум—універсітэт" была пабудавана ў ліку першых пачынаючы з 1994 г. За гэтыя гады склаўся добры вопыт супрацоўніцтва з факультэтам інфармацыйна-дакументных камунікацый.

Каледж — арганізацыі-працадаўцы. У рамках гэтай звязкі робіцца наступнае: заключэнне дагавораў аб узаемным супрацоўніцтве для арганізацыі ўсіх відаў практыкі, па падрыхтоўцы спецыялістаў і працаўладкаванні выпускнікоў; удзел працадаўцаў у рабоце дзяржаўнай атэстацыйнай камісіі; правядзенне педагагічных саветаў сумесна з органамі кіравання ў сферы культуры з запрашэннем кіраўнікоў устаноў культуры, якія ўдзельнічаюць у арганізацыі практыкі.

Шырока выкарыстоўваюцца такія формы, як: запрашэнне працадаўцаў для ўдзелу ў рабоце навукова-практычных канферэнцый, "круглых сталоў", педагагічных чытанняў, што праводзяцца ў каледжы; запрашэнне кіраўнікоў і работнікаў бібліятэк і школ у якасці членаў журы конкурсаў прафесійнага майстэрства сярод навучэнцаў; арганізацыя каледжам дадатковых адукацыйных паслуг патэнцыйным працадаўцам (тэматычныя семінары, кансультацыі ды іншыя).

На базе вучэбна-кансультацыйнага пункта каледжа мы стварылі групу адаптацыйнага маніторынгу з мэтай аказання дапамогі нашым выпускнікам і адаптацыі да ўмоў прафесійнага асяроддзя; выяўлення праблем у рабоце маладых спецыялістаў, аналіз прычын іх узнікнення; аказанне кансультацыйнай, метадычнай дапамогі ў пераадоленні цяжкасцей; вядзецца маніторынг працаўладкавання і замацавання выпускнікоў.

Есць пэўныя поспехі, але маюцца і цяжкасці. Умоўна мы іх падзялілі на дзве групы: "глабальныя" і "мясцовыя". Праблемы "глабальныя": нізкая заработная плата бібліятэчных работнікаў (разам з іншымі катэгорыямі работнікаў сферы культуры); няўстойлівая дэмаграфічная сітуацыя. Праблемы "мясцовыя": пакуль яшчэ недасканалая сістэма прафесійнага адбору; малая колькасць выпускнікоў, якія паступаюць па мэтавай кантрактнай падрыхтоўцы.

Натуральна, працэс фарміравання такой складанай, разнастайнай сістэмы сацыяльнага парнёрства адбываецца неадназначна: адны сувязі ўстанаўліваюцца хутка, іншыя — значна складаней.

Напрыклад, з 2009 г. каледжам вядзецца работа па заключэнні дагавораў з арганізацыямі — заказчыкамі кадраў на падрыхтоўку спецыялістаў і працаўладкаванне выпускнікоў, і на сённяшні дзень іх дзейнічае 72. Пры гэтым базавая арганізацыя-закачык мае пераважнае права на задавальненне сваёй патрэбы ў спецыялістах. У тым жа годзе было заключана 23 дагаворы (100%) з аддзеламі культуры Магілёўскай вобласці, і штогод яны абнаўляюцца. Як вынік — толькі за тры апошнія гады вобласць атрымала 338 спецыялістаў і мае сярод працуючых на пасадах у бібліятэчных установах самы нязначны працэнт (14,%) спецыялістаў без профільнай адукацыі.

Некалькі іншая сітуацыя з іншымі абласцямі. Ад 24% да 80% аддзелаў культуры заключылі з намі дагаворы. І гэта прытым што, па афіцыйных статыстычных даных, у асобна ўзятых абласцях працэнт працуючых бібліятэкараў, якія не маюць профільнай адукацыі, застаецца даволі высокім.

Супастаўляючы гэтыя даныя з планам набору на завочнае аддзяленне каледжа, прыходзім да высновы, што, здаецца, у нас не павінна быць праблем пад час уступных кампаній бліжэйшых пяці-сямі гадоў. Але ўжо летась мы адчувалі пэўныя цяжкасці пад час прыёмнай кампаніі на завочнае аддзяленне.

Эфектыўнасць нашай дагаворнай сістэмы адбіваецца і на размеркаванні. Штогод мы бачым сваю запатрабаванасць, бо колькасць заявак перавышае колькасць выпускнікоў, але, з іншага боку, мае месца нераўнамерная колькасць размеркаваных маладых спецыялістаў у разрэзе абласцей. Незадавальненне заявак адбываецца з прычыны адсутнасці ўраджэнцаў тых рэгіёнаў, дзе ёсць патрэба ў абнаўленні калектываў бібліятэчных устаноў. Асноўныя прычыны — адсутнасць дагавора з каледжам альбо проста абыякавае выкананне абавязацельстваў заказчыкамі кадраў.

Сёння асаблівае месца ва ўзаемадзеянні з працадаўцамі мэтазгодна адводзіць мэтавай падрыхтоўцы спецыялістаў. На жаль, пазіцыя, што займаюць і ў гэтым пытанні некаторыя рэгіёны рэспублікі, таксама не можа нас задавальняць. Але ці толькі нас?

Думаю, названыя праблемы ў той або іншай ступені маюць месца ва ўсіх установах сярэдняй спецыяльнай адукацыі галіны. Таму бачыцца мэтазгодным узмацненне ўвагі і кантролю ўпраўленняў і аддзелаў культуры да існуючых кадравых праблем.

Новы перспектыўны вектар партнёрскага ўзаемадзеяння звязаны з прапрацоўкай пытання аб адкрыцці на базе нашага каледжа рэсурснага цэнтра. У ім мы бачым дадатковыя, больш шырокія, грані ўзаемадзеяння са сваімі партнёрамі, рэальную магчымасць рэалізацыі праз канцэнтрацыю матэрыяльна-тэхнічных, адукацыйных, кадравых рэсурсаў, такіх кірункаў, як: арганізацыя бесперапыннай прафесійнай адукацыі; павышэнне кампетэнтнасці работнікаў культуры ў выкарыстанні інфармацыйных тэхналогій і навыкаў работы на сучасным абсталяванні; даследаванне рынку працы ў мэтах абагульнення патрабаванняў працадаўцаў да якасці падрыхтоўкі выпускнікоў; распрацоўка і ўкараненне ў адукацыйны працэс інавацыйных тэхналогій ды многае іншае.

База для гэтага маецца: абсталяваныя камп'ютарныя класы, кваліфікаваныя кадры, добраўпарадкаваны інтэрнат.

КУЛУАРЫ: ПРАЗ ФОТА І СЛОВА

Ірына Канапелька, начальнік аддзела Фрунзенскага раёна горада Мінска:

— Наш раён самы вялікі ў беларускай сталіцы: сёння тут пражывае больш за 400 тысяч жыхароў. Актыўнае горадабудаўніцтва фарміруе культурную палітыку раёна. Галоўны клопат — узвядзенне ўстаноў культуры. На нашай тэрыторыі — толькі пяць бібліятэк, чатыры музычныя школы і ўсяго адзін кінатэатр. Мая мара — стварыць у раёне ўстановы культуры клубнага тыпу. Хочацца, каб у спальных мікрараёнах былі маладзёжныя цэнтры з добрай матэрыяльна-тэхнічнай базай. Зараз жа ў нас практычна ўсе асноўныя культурныя мерапрыемствы праводзяцца на адкрытых пляцоўках…

КУЛЬТУРА-2013: КАНКРЭТНЫЯ ПАДЫХОДЫ

Даклад міністра культуры Рэспублікі Беларусь Барыса Святлова на выніковай калегіі Міністэрства культуры

(Працяг. Пачатак на стар. 3 — 6.)

У мінулым годзе 59 работнікаў сферы культуры былі ўганараваны дзяржаўнымі ўзнагародамі. Сярод іх 44 чалавекі — адзначаны ордэнамі і медалямі (35 — медалём Францыска Скарыны, 4 — ордэнам Францыска Скарыны, 5 — медалём "За працоўныя заслугі") і 15 прысвоены ганаровыя званні ("Заслужаны артыст Рэспублікі Беларусь" — 6 чал., "Заслужаны дзеяч мастацтваў Рэспублікі Беларусь" — 1 чал., "Заслужаны дзеяч культуры Рэспублікі Беларусь" — 3 чал., "Заслужаны работнік адукацыі Рэспублікі Беларусь" — 1 чал., "Народны артыст Беларусі" — 3 чал., "Народны мастак Беларусі" — 1 чал.).

АДУКАЦЫЯ

Пазітыўныя з'явы адбываліся ў сферы мастацкай адукацыі.

Паспяхова прайшлі працэдуру акрэдытацыі Беларуская дзяржаўная акадэмія музыкі, Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў, Беларуская дзяржаўная харэаграфічная гімназія-каледж, Мінскі і Лідскі дзяржаўныя музычныя каледжы.

У адпаведнасці з заданнямі Дзяржаўнай праграмы "Культура Беларусі" на 2011 — 2015 гады праводзілася работа па пераўтварэнні аднапрофільных школ у шматпрофільныя школы мастацтваў. Іх колькасць павялічылася да 374 адзінак (плюс 57 за 2012 г.). Агульны кантынгент вучняў школ мастацтваў павялічыўся са 107 тыс. у 2011 г. да 109 тыс. дзяцей у 2012 г. Арганізавана прайшла прыёмная кампанія ў навучальныя ўстановы.

Разам з тым, неабходна адзначыць, што за апошнія два гады ніводная ўстанова вышэйшай адукацыі ў сферы культуры не выканала планавых заданняў прыёму. У 2012-м фактычная рэалізацыя плана прыёму склала 96%. Такія вынікі работы сведчаць пра недахопы ў арганізацыі прафарыентацыйнай дзейнасці ўстаноў вышэйшай адукацыі.

У 2012 годзе ажыццяўлялася таксама работа па арганізацыі дадатковай адукацыі дарослых.

Значнае месца ў рабоце з творча адоранай моладдзю займала дзейнасць спецыяльнага фонду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па падтрымцы таленавітай моладзі.

Узнагародамі і заахвочваннямі фонду ў 2012 г. былі адзначаны 254 прадстаўнікі моладзі і 15 калектываў мастацкай творчасці. На гэтыя мэты, а таксама на падтрымку творчых праектаў было выкарыстана 1,4 млрд. рублёў.

У 2012 г. за кошт сродкаў фонду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па падтрымцы культуры і мастацтва былі прафінансаваны 13 творчых і адукацыйных праектаў на агульную суму 996,5 млн. рублёў.

Лепшыя прадстаўнікі ўстаноў адукацыі сферы культуры з поспехам удзельнічалі ў міжнародных конкурсах, якія праводзіліся за межамі рэспублікі.

Сведчаннем нязменна вялікай увагі дзяржавы да пытанняў фарміравання ў беларускім грамадстве высокай духоўнасці, захавання і прымнажэння нацыянальнай культурнай спадчыны, развіцця беларускай культуры і мастацтва, падтрымкі кадраў культуры стала прысуджэнне ў 2012 г. спецыяльных прэмій Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь дзеячам культуры і мастацтва і прэміі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь "За духоўнае адраджэнне". Сярод уладальнікаў высокіх узнагарод — 2 прадстаўнікі сферы культуры і 8 калектываў устаноў культуры.

НАВУКА

Шырокая тэматыка навуковых даследаванняў па актуальных пытаннях развіцця культуры была прадстаўлена ў раздзеле "Удасканальванне навуковага забеспячэння ў сферы культуры" Дзяржаўнай праграмы "Культура Беларусі" на 2011 — 2015 гады.

Па-ранейшаму злабадзённымі засталіся пытанні пераадолення тэндэнцый дубліравання навуковых заданняў і мерапрыемстваў, актуальнасці і практыкаарыентаванасці навуковых даследаванняў. Гэтыя праблемы нам неабходна будзе вырашыць у 2013 годзе.

А зараз я хацеў звярнуцца да спецыфічных форм дзейнасці, уласцівых галіне культуры, і пачну з разгляду дзейнасці па ахове гісторыка-культурнай спадчыны.

(Працяг на стар. 8.)

Галіна КАРАТКОВА, начальнік аддзела культуры Браслаўскага райвыканкама **(з выступлення)**:

"Як правесці міжнародны праект без вопыту?"

За 2012 год краіну наведала каля 2 млн. замежнікаў. І немалая іх частка прыпадае на перліну Беларускага Паазер'я — Браслаўшчыну. На тэрыторыі гэтага раёна налічваецца 48 аб'ектаў, што ўнесены ў Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцей.

На Замкавай гары ў райцэнтры ў XI — XVIII стагоддзях знаходзілася абарончая крэпасць. Аб'ект з'яўляецца адным з самых вялікіх па плошчы гарадзішчам Ранняга Сярэднявечча і адносіцца да 3-й катэгорыі каштоўнасці. Аднак сёння ўпадабаная турыстамі Замкавая гара больш нагадвае выспу дзікай прыроды і мае патрэбу ў добраўпарадкаванні, а магчыма, і ў аднаўленні элементаў старажытнай крэпасці.

Дзякуючы Міністэрству культуры, Дзяржаўнай праграме "Замкі Беларусі" на 2012 — 2018 гады мы атрымалі такую магчымасць. На добраўпарадкаванне тэрыторыі гарадзішча ў 2012-м было выдаткавана 135 млн. рублёў. На сённяшні дзень распрацаваны эскізны праект "Паркавы комплекс "Замкавая гара". Фінансаванне прадугледжана і на бліжэйшыя гады. У 2013 — 300 млн. рублёў.

Браслаўскі раён мае спрыяльныя ўмовы для развіцця турыстычных і экс-

курсійных маршрутаў. Сёння іх — каля дваццаці. Ёсць вельмі запатрабаваныя напрамкі, але, на жаль, ім пакуль не надаецца адпаведная ўвага. Гэта экскурсіі з анімацыяй, цімбілдынгі, конныя паходы і іншае.

Цэнтрам гісторыка-культурнай спадчыны на Браслаўшчыне з'яўляецца "Браслаўскае раённае аб'яднанне музеяў", у складзе якога — Музей традыцыйнай культуры. Ён знаходзіцца ў будынку былога млына... Мае ўстанова і сваю гасцініцу на 13 месцаў. У 2012 годзе музей наведала 29 944 чалавекі, зароблена 266 млн. рублёў.

У пунктах продажу сувеніраў прадстаўлена больш як 300 тыпаў і ўзораў вырабаў майстроў, творчасць якіх прапагандуе наш рэгіён. Для пашырэння асартыменту сувенірнай прадукцыі, паляпшэння яе якасці штогод ладзіцца конкурс "Браслаўскі сувенір". Абавязковая ўмова ўдзелу ў ім — наяўнасць лагатыпа, звязанага з геаграфіяй або гісторыяй рэгіёна.

На Браслаўшчыне — 169 аграсядзіб, якія прадастаўляюць турыстычныя паслугі. У большасці выпадкаў гэта — толькі пражыванне і харчаванне. Для сучаснага турыста гэта недастаткова. Яго могуць зацікавіць нацыянальная кухня, местачковыя звычаі, сувенірныя вырабы. Для папулярызацыі народных рамёстваў на аграсядзібах у 2012 годзе супрацоўнікамі музея для гаспадароў ладзіліся майстар-класы па вырабе сувеніраў з ільну, бавоўны, гліны, развучванне беларускіх песень і танцаў.

У раёне наладжана выданне турыстычна-інфармацыйных матэрыялаў, распрацаваны турбрэнд Браслаўшчыны, устаноўлена 325 турыстычна-інфармацыйных шчытоў і ўказальнікаў. Выпушчана больш як 50 відаў друкаванай прадукцыі: гістарычныя, бібліяграфічныя даведнікі, буклеты, паэтычныя зборнікі, турыстычныя карты, гіды... Музейнае аб'яднанне рыхтуе да выдання альбом "Браслаў учора і сёння".

Браслаўскі рэгіён з'яўляецца перспектыўным для развіцця фестывальнага турызму. Традыцыйнымі сталі Адкрыты чэмпіянат па аўтамабільным ралі "Славянскі кубак", конкурсы для рыбакоў-аматараў "Шчупакова ўдача". Каля дзесяці тысяч паломнікаў з розных краін збірае рэлігійнае свята, прысвечанае каранацыі іконы "Божая Маці — валадарка азёр".

Вабіць турыстаў сваёй самабытнасцю, адсылае да рыцарскіх часоў, знаёміць з рамёствамі і побытам далёкіх стагоддзяў Свята сярэднявечнай культуры "Меч Брачыслава". Летась яго ўдзельнікамі сталі рыцарскія клубы з Прыбалтыкі, Расіі, Украіны.

Самым масавым мерапрыемствам, а таксама "візітоўкай" раёна з'яўляецца Свята традыцыйнай культуры "Браслаўскія зарніцы". Гэта адно з найстарэйшых святаў у Рэспубліцы Беларусь (ладзіцца з 1967 года). У 2012 годзе ў ім бралі ўдзел больш як 30 калектываў з 10 краін. У рамках фестывалю летась праходзіла "Харавая асамблея". Адкрываў мерапрыемства зводны хор з 400 удзельнікаў. Стала добрай традыцыяй праводзіць у рамках згаданага свята Інвестыцыйны форум з удзелам акрэдытаваных у Беларусі дыпламатаў і кіраўнікоў рэгіянальнага звяна з розных краін. Мы ўдзячныя Міністэрству культуры і ўпраўленню культуры Віцебскага аблвыканкама за метадычную і фінансавую падтрымку свята.

Браслаўскім райвыканкамам праводзіцца значная работа па ўмацаванні добрасуседскіх стасункаў, наладжванні сувязей з замежнымі партнёрамі. Заключана 16 дагавораў аб супрацоўніцтве з рэгіёнамі Расіі, Латвіі, Літвы, Украіны, Польшчы, Эстоніі, Арменіі.

Аднак візавы рэжым, недастаткова ўмацаваная матэрыяльная база ўстаноў культуры ствараюць гэўныя цяжкасці ў развіцці трансгранічных зносін.

Удзел у праектах Праграмы трансгранічнага супрацоўніцтва Еўрапейскага інструмента добрасуседства і партнёрства "Латвія — Літва — Беларусь" дазваляе сумеснымі намаганнямі вырашаць праблемы прыгранічных рэгіёнаў і ўмацоўваць культурныя сувязі.

Аддзел культуры райвыканкама бярэ удзел у двух праектах міжнароднай тэхнічнай дапамогі. Гэта "Паляпшэнне сацыяльна-культурных сувязей паміж Зарасайскім, Даўгаўпілскім і Браслаўскім прыгранічнымі рэгіёнамі шляхам прыцягнення моладзі і стварэння больш актыўнага мясцовага партнёрства" (скарочаная назва — "Радасць у руху") і "Захаванне і развіццё культурна-гістарычнай спадчыны Рэзекненскага і Браслаўскага раёнаў" (скарочаная назва — "След у гісторыі").

Агульны бюджэт "Радасці ў руху" складае 158 тыс. еўра. Бюджэт беларускай часткі праекта "След у гісторыі" — 103 613 еўра. У рамках праекта на тэрыторыі Браслаўскага раёна летась працаваў этнамузычны летнік. Для ўдзельнікаў былі зладжаны майстар-класы знакамітых музыкантаў Літвы, Латвіі, Беларусі. Вынікам навучання стаў заключны канцэрт прадстаўнікоў трох народаў, таксама выдадзены буклет "Па старонках этнамузычнага летніка…", плануецца выпуск 300 дыскаў з запісам канцэрта.

Праект прадугледжвае і супрацоўніцтва ва ўдасканаленні маладзёжнай творчасці. Танцавальны калектыў і эстрадная студыя "Фартуна" Відзаўскага дома культуры ў ліпені 2012 года сталі ўдзельнікамі Маладзёжнага міжнароднага летніка ў г. Зарасаі, дзе былі прадстаўлены майстар-класы ад вядомых літоўскіх і нарвежскіх майстроў па вакале і харэаграфіі. Моладзь засвоіла новы напрамак — "мадэрн-танец".

Для павышэння прафесійнай кампетэнцыі работнікаў устаноў культуры на тэрыторыях Літвы, Латвіі і Беларусі былі арганізаваны трохдзённыя семінары з удзелам прадстаўнікоў міністэрстваў і ўніверсітэтаў краін-удзельніц. Дзякуючы праекту самадзейныя калектывы Браслаўшчыны прынялі ўдзел у дзясятку мерапрыемстваў прыбалтыйскіх краін.

У рамках праекта "След у гісторыі" ў 2013 годзе плануецца правесці ганчарны і мастацкі пленэры ў Рэзекнэ, пленэр па ткацтве ў Браславе ды іншыя. На сродкі, прадугледжаныя праектамі, закуплены музычныя інструменты, народныя касцюмы для танцавальнага і вакальнага калектываў, камп'ютары ды іншае.

У 2013 годзе плануецца ўмацаваць матэрыяльную базу музейнага аб'яднання. На тэрыторыі Музея традыцыйнай культуры маюць з'явіцца ганчарныя печы, ліхтары, што працуюць на сонечных батарэях, унутраная гукаўзмацняльная сістэма.

Удзел у згаданых праектах паказвае, што трансгранічныя і прыгранічныя сувязі значна пашыраюць магчымасці прафесійнага ўдасканалення самадзейных калектываў, дазваляюць больш эфектыўна вырашаць іх сацыяльныя і культурныя праблемы, у тым ліку — за кошт скарыстання магчымасцей ды інвестыцый Еўрапейскага Саюза.

Аднак у міжнародным супрацоўніцтве рэгіёнаў існуюць гэўныя цяжкасці: недахоп вопыту ў падрыхтоўцы і рэалізацыі міжнародных праектаў, адрозненні нарматыўна-прававой базы Рэспублікі Беларусь і краін Еўрапейскага Саюза. У сферы турызму адчувальны недахоп кваліфікаваных спецыялістаў, слаба развіта інфраструктура рэгіёнаў.

Напрыканцы свайго выступлення хачу падкрэсліць, што багатая культурна-гістарычная спадчына, прыродныя рэсурсы, зручнае геаграфічнае становішча нашай дзяржавы спрыяюць развіццю турызму ўвогуле. Але толькі агульная зацікаўленасць, комплексны падыход і падтрымка ўсіх міністэрстваў і ўстаноў краіны дазволяць вывесці турыстычную галіну на якасна новы ўзровень.

Пытанне пасля выступлення

Пасля выступлення Галіны Каратковай з пытаннем да яе звярнуўся віцэ-прэм'ер Урада Анатоль Тозік:

— Якія праблемы сёння перашкаджаюць, на ваш погляд, развіццю турызму на Браслаўшчыне? Бо, на маю думку, турыстычны патэнцыял раёна — вялікі, а вось выкарыстоўваецца ён вельмі слаба. Між тым, Браслаўшчына магла б зарабляць на турызме вялікія грошы, якія маглі б стаць асноўным рэсурсам росту дабрабыту насельніцтва раёна… Што патрэбна ад Міністэрства культуры Беларусі, ад Урада краіны, для таго, каб у гэтым кірунку справы развіваліся больш дынамічна?

Як адзначыла Галіна Караткова, асноўных праблем на турыстычнай дзялянцы некалькі. Першая з іх — недахоп кваліфікаваных спецыялістаў, якія могуць свабодна валодаць замежнымі мовамі: англійскай, літоўскай, польскай і гэтак далей. А такія людзі цяпер вельмі запатрабаваныя. Акрамя гэтага, на думку Галіны Каратковай, на Браслаўшчыне яшчэ вельмі слаба развіта турыстычная інфраструктура. Таму востра паўстае пытанне інвестыцый — з боку як дзяржавы, так і прыватнага бізнесу.

КУЛЬТУРА-2013: КАНКРЭТНЫЯ ПАДЫХОДЫ

Даклад міністра культуры Рэспублікі Беларусь Барыса Святлова на выніковай калегіі Міністэрства культуры

(Працяг. Пачатак на стар. 3 — 7.)

АХОВА ГІСТОРЫКА-КУЛЬТУРНАЙ СПАДЧЫНЫ

Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь налічвае 5 555 каштоўнасцей з улікам уключэння ў 2012 годзе 131 аб'екта.

У 2012 годзе за кошт сродкаў Дзяржаўнай інвестыцыйнай праграмы рэстаўрацыйна-аднаўленчыя работы праводзіліся на 13 аб'ектах спадчыны ў аб'ёме 389,5 млрд. рублёў.

У адпаведнасці з мерапрыемствамі Дзяржаўнай праграмы "Замкі Беларусі" ў 2012 годзе праводзіліся работы на 19 аб'ектах. З іх на 17 — за кошт сродкаў рэспубліканскага і мясцовага бюджэтаў, на 2 аб'ектах — за кошт пазабюджэтных крыніц. З рэспубліканскага бюджэту было выдзелена 2,7 млрд. рублёў на фінансаванне рэстаўрацыі замкаў у г. Навагрудку, г. Лідзе, в. Крэва Смаргонскага раёна, в. Гальшаны Ашмянскага раёна.

Колькасць зваротаў аб узгадненні навукова-праектнай дакументацыі ў 2012 годзе павялічалася на 28%, на атрыманне дазволаў на выкананне работ — на 5%.

Разам з тым, у рэгіёнах ахоўныя дошкі ўстаноўлены толькі на 76% гісторыка-культурных каштоўнасцей, пашпарты падрыхтаваны для 73% каштоўнасцей, праекты зон аховы распрацаваны для 10% нерухомых матэрыяльных гісторыка-культурных каштоўнасцей. Дадзенае становішча патрабуе неадкладнай арганізацыі мерапрыемстваў па прыцягненні ўласнікаў да выканання патрабаванняў заканадаўства.

З улікам выяўленых правапарушэнняў складзены акты, якія накіраваны на адрас уласнікаў і мясцовых выканаўчых ды распарадчых органаў для кантролю за выпраўленнем недахопаў. Па фактах правядзення работ без дазволу выдадзены 18 прадпісанняў Міністэрства культуры.

У 2013 годзе нам неабходна распрацаваць і зацвердзіць графік выканання работ на аб'ектах Дзяржпраграмы "Замкі Беларусі"; забяспечыць выкананне рэстаўрацыйных работ на Будслаўскім касцёле; распрацаваць канцэпцыю Праграмы захавання гісторыка-культурнай спадчыны і развіцця традыцыйнай культуры ў Мсціслаўскай і Навагрудскай рэкрэацыйных зонах.

НАРОДНАЯ ТВОРЧАСЦЬ

Народная творчасць — гэта найважнейшы пласт нацыянальнай культуры, без якога немагчыма развіццё прафесійнага мастацтва.

Стабільнасць развіцця народнай творчасці ў краіне замацавана дзейнасцю клубных фарміраванняў. Гэта аматарскія і фальклорныя калектывы мастацкай творчасці, студыі, гурткі, аб'яднанні, клубы па інтарэсах. У 2012 годзе колькасць клубных фарміраванняў павялічылася, у параўнанні з 2010-м, амаль на 300 і склала на пачатак 2013 года 26 422 адзінкі, якія аб'ядналі больш за 292 184 удзельнікі.

Каля 69% усіх клубных фарміраванняў адносяцца да аматарскіх калектываў мастацкай творчасці. На працягу 2012 года з іх удзелам было праведзена больш за 72 тысячы канцэртаў і спектакляў, звыш 25 тысяч тэатралізаваных святаў і абрадаў, больш чым 23 тысячы выставак твораў дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва, народных рамёстваў і промыслаў.

Мінулы год быў адметны паступовай працай у рэгіёнах па захаванні традыцыйнай мастацкай культуры.

Новыя захады з'явіліся ў рабоце па адраджэнні, развіцці і папулярызацыі народных мастацкіх промыслаў ды рамёстваў.

Знакавай падзеяй стала распрацоўка і прыняцце Дзяржаўнай праграмы адраджэння тэхналогій і традыцый вырабу слуцкіх паясоў і развіцця вытворчасці нацыянальнай сувенірнай прадукцыі "Слуцкія паясы" на 2012 — 2015 гады, якая ўяўляе з сябе комплексную сістэму мер па рэалізацыі дзяржаўнай палітыкі Рэспублікі Беларусь у сферы захавання традыцый і развіцця нацыянальнага мастацтва, народных мастацкіх промыслаў у Рэспубліцы Беларусь.

Прыспеў час больш актыўна весці работу па выкананні гэтай праграмы.

(Працяг на стар. 9.)

Ігар ЧАРНЯЎСКІ, начальнік упраўлення па ахове гісторыка-культурнай спадчыны і рэстаўрацыі Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь **(з выступлення)**:

"Ад зон аховы да рэкламы: дык чый жа клопат?"

Дзяржаўная палітыка ў сферы аховы гісторыка-культурнай спадчыны прадугледжвае рэалізацыю сістэмы арганізацыйных, прававых, эканамічных, матэрыяльна-тэхнічных, навуковых, інфармацыйных, іншых мер, скіраваных на выяўленне матэрыяльных аб'ектаў і нематэрыяльных праяў творчасці чалавека, якія могуць уяўляць гісторыка-культурную каштоўнасць, наданне ім статуса гісторыка-культурнай каштоўнасці, улік, захаванне, аднаўленне, утрыманне і выкарыстанне гісторыка-культурных каштоўнасцей, што ажыццяўляюцца ў мэтах зберажэння і прымнажэння гісторыка-культурнай спадчыны.

На працягу 2012 года кожная з адзначаных мер знайшла рэальнае ўвасабленне. У дакладзе Барыса Святлова адзначаны асноўныя аб'екты спадчыны, на якіх Міністэрствам культуры забяспечана фінансаванне работ сродкамі рэспубліканскага бюджэту. А гэта 38 гісторыка-культурных каштоўнасцей, вызначаных у мінулым годзе Дзяржаўнай інвестыцыйнай праграмай, дзяржаўнымі праграмамі "Культура Беларусі" на 2011 — 2015 гг. і "Замкі Беларусі" на 2012 — 2018 гг. Агульны аб'ём сродкаў рэспубліканскага бюджэту склаў звыш 420 млрд. рублёў. У цэлым жа Міністэрствам культуры выдадзена 1 199 дазволаў на выкананне навукова-праектных і рэстаўрацыйна-аднаўленчых работ па краіне, ажыццёўлены разгляд навукова-праектнай дакументацыі або праектных прапаноў на выкананне рэстаўрацыйна-аднаўленчых работ, па выніках чаго падрыхтавана 1 375 заключэнняў па праектах.

Важным для ўмацавання сферы аховы гісторыка-культурнай спадчыны стала ўступленне ў дзеянне ў жніўні 2012 г. змяненняў і дапаўненняў у Закон Рэспублікі Беларусь "Аб ахове гісторыка-культурнай спадчыны Рэспублікі Беларусь". Асноўныя прававыя новаўвядзенні скіраваны на пашырэнне функцый мясцовых выканаўчых і распарадчых органаў, больш актыўнае іх рэагаванне на звароты грамадзян і юрыдычных асоб з адпаведных адміністрацыйна-тэрытарыяльных адзінак. Міністэрствам культуры прапанаваны змяненні ў Бюджэтны кодэкс Рэспублікі Беларусь, што дазволіла ўдакладніць парадак фінансавання работ на гісторыка-культурных каштоўнасцях сродкамі бюджэтаў розных узроўняў, у тым ліку і сельскімі выканкамамі.

На сённяшні дзень прававая база сферы аховы гісторыка-культурнай спадчыны дазваляе ў поўнай меры забяспечыць вырашэнне задач па захаванні і эфектыўным выкарыстанні культурнага і гістарычнага набытку народа Беларусі. У мэтах безумоўнага выканання патрабаванняў нацыянальнага заканадаўства і міжнародных дагавораў па ахове спадчыны, да якіх далучылася Рэспубліка Беларусь, на 2013 год варта акрэсліць наступныя найбольш актуальныя задачы.

1. Забеспячэнне падрыхтоўкі рэгіянальных праграм на ўзроўні абласцей, гарадоў і раёнаў па ахове гісторыка-культурнай спадчыны, вызначаных артыкулам 10 Закону аб ахове спадчыны. Гэтая тэма была падрабязна абмеркавана на калегіі Міністэрства культуры 26 студзеня бягучага года, якой засведчана наяўнасць такіх праграм толькі ў Віцебскай вобласці. Упраўленням культуры Брэсцкага, Гродзенскага, Мінскага, Магілёўскага, Гомельскага абласных і Мінскага гарадскога выканкамаў належыць правесці работу па іх падрыхтоўцы. Пры гэтым асноўную ўвагу варта надаць ажыццяўленню малазатратных мерапрыемстваў па кансервацыі аб'ектаў спадчыны, прывядзенню ў належны санітарны стан іх тэрыторый, прыцягненню пазабюджэтных сродкаў на захаванне гісторыка-культурных каштоўнасцей, у тым ліку дапамогі спонсараў і валанцёраў.

2. Па-ранейшаму застаецца актуальнай распрацоўка і зацвярджэнне праектаў зон аховы нерухомых матэрыяльных гісторыка-культурных каштоўнасцей, якія на сённяшні дзень створаны толькі для 375 аб'ектаў спадчыны. Гэта каля 10% ад неабходнага. Варта нагадаць, што ў 2012 і 2013 гг. рашэннямі калегіі Міністэрства культуры вызначана першачарговая задача падрыхтоўкі такіх праектаў для тых аб'ектаў, у зонах размяшчэння якіх будаўнічыя работы плануецца праводзіцца ў бліжэйшыя 3-5 гадоў. Такі падыход дазволіць не толькі рацыянальна выкарыстаць сродкі ды забяспечыць выкананне патрабаванняў Закону, але і стварыць умовы гарманічнага спалучэння аб'екта новага будаўніцтва ды помнікаў даўніны.

3. Асаблівую актуальнасць мае забеспячэнне належнага ўтрымання і выкарыстання аб'ектаў Сусветнай спадчыны і, у першую чаргу, іх прыроднага і антрапагеннага атачэння. Асабліва важным гэта з'яўляецца ў правядзенні ўзгодненай з палажэннямі Канвенцыі UNESCO аб ахове сусветнай культурнай і прыроднай спадчыны горадабудаўнічай і гаспадарчай палітыкі ў Міры і Нясвіжы. Відавочна, што захадаў, якія прадпрымаюцца Міністэрствам культуры, недастаткова. У сувязі з гэтым прапануем падрыхтаваць і разгледзець пытанне на пасяджэннях Гродзенскага і Мінскага аблвыканкамаў адпавед-

Святлана БАРАНОК, намеснік начальніка ўпраўлення культуры Мінскага абласнога выканаўчага камітэта **(з выступлення)**:

Мінулы год для сферы культуры Міншчыны быў насычаны шэрагам буйнамаштабных мерапрыемстваў рэспубліканскага і міжнароднага ўзроўню. Статус "Культурная сталіца Беларусі" дазволіў Нясвіжу, з яго непаўторнай архітэктурай і мноствам аб'ектаў сусветнай спадчыны, стаць цэнтрам культурнага жыцця рэгіёна. На канцэртных пляцоўках горада ў рамках фестываляў Уладзіміра Співакова і Юрыя Башмета выступілі сусветна вядомыя музыканты піяніст Барыс Беразоўскі і ансамбль "Салісты Масквы", у рамках новых тэатральных праектаў сваё майстэрства дэманстравалі вядомыя акцёры драматычных тэатраў і салісты Вялікага тэатра оперы і балета Беларусі, у першым дабрачынным Палацавым балі прынялі ўдзел госці з Расіі Анастасія Валачкова, Марат Башараў, Дзмітрый Харацьян, група "Квадро". Хачу выказаць падзяку Міністэрству культуры за фінансавую падтрымку праекта і прадастаўленую магчымасць жыхарам горада-музея далучыцца да шэдэўраў мастацтва.

Жыхары Міншчыны ганарацца тым, што наша зямля ўзгадавала многіх выбітных дзеячаў культуры і мастацтва і заўсёды шануе памяць пра сваіх землякоў. У 2012 годзе мы адзначалі юбілейныя даты класікаў беларускай літаратуры Янкі Купалы, Якуба Коласа і Максіма Танка і ў рэгіёнах было праведзена шмат мерапрыемстваў па прапагандзе ды папулярызацыі спадчыны паэтаў, добраўпарадкаванні мемарыяльных аб'ектаў, звязаных з жыццём і творчасцю юбіляраў.

Яркімі і запамінальнымі сталі памятныя мерапрыемствы з нагоды 200-годдзя вайны 1812-га. У памяць пра гэта быў устаноўлены памятны знак "Смутак і Пакланенне" на Брылёўскім полі, створана новая экспазіцыя ў Барысаўскім аб'яднаным музеі, праведзены IV Міжнародныя Каладзееўскія чытанні. Каля пяці тысяч чалавек, у тым ліку прадстаўнікі дыпмісій Расіі, Францыі, Германіі, Аўстрыі ды іншых краін, нашчадкі Напалеона і Давыдава прынялі ўдзел у мітынгу-рэквіеме на Брылёўскім полі, а выступленні клубаў ваенна-гістарычнай рэканструкцыі з Беларусі і краін замежжа прадставілі гледачам фрагменты бітваў двухсотгадовай даўніны.

Значныя аб'ёмы фінансавання былі накіраваны летась на ўмацаванне матэрыяльнай базы. Толькі на рамонтныя і будаўнічыя работы асвоена звыш 105 млрд. рублёў. Нядрэнных вынікаў установы культуры вобласці дасягнулі ў частцы паступлення пазабюджэтных даходаў: план выкананы амаль на 150 працэнтаў, даходы ўстаноў культуры склалі 23,4 млрд. рублёў (гэта без абласнога цэнтра). Дасягнуты вынікі і па іншых напрамках сацыяльна-эканамічнага развіцця галіны.

Аднак, аналізуючы асноўныя паказчыкі дзейнасці арганізацый культуры па напрамках — клубныя, бібліятэчныя, музейныя, адукацыйныя ўстановы, якія мы штогод прадстаўляем у Міністэрства культуры для абагульнення і ана-

на. Гэта цалкам стасуецца з палажэннямі Канвенцыі аб ахове сусветнай спадчыны адносна асаблівай ролі мясцовых супольнасцей, якім належыць прадугледзець ахову аб'ектаў Сусветнай спадчыны ў планах рэгіянальнага развіцця.

4. У 2012 годзе па даручэнні Урада краіны Міністэрствам культуры пры ўдзеле спецыялістаў па ахове спадчыны ўпраўленняў культуры аблвыканкамаў і Мінгарвыканкама, некаторых раёнаў абласцей праведзены аналіз пералікаў гісторыка-культурных каштоўнасцей, што вызваляюцца ад падатку на нерухомасць і землі, занятыя якімі, вызваляюцца ад зямельнага падатку. Правядзенне гэтай работы засведчыла адсутнасць у шэрагу мясцовых органаў кіравання поўнай інфармацыі аб стане гісторыка-культурных каштоўнасцей. Другая выснова датычыцца нізкага ўзроўню інфармаванасці ўласнікаў гісторыка-культурных каштоўнасцей аб патрабаваннях заканадаўства аб ахове гісторыка-культурнай спадчыны. У выніку агульная колькасць аб'ектаў спадчыны ў названых пералiках, прадстаўленых мясцовымі выканаўчымі і распарадчымі органамі, была паменшана з 5 143 да 949.

У сувязі з гэтым спецыялістам Міністэрства культуры сумесна з упраўленнямі культуры аблвыканкамаў у першым паўгоддзі належыць завяршыць удакладненне звестак аб тэхнічным стане гісторыка-культурных каштоўнасцей, выпрацоўцы прапаноў па неабходных мерапрыемствах па іх захаванні, стварэнні ўмоў наведвання.

5. З мэтай пашырэння інфармацыі аб прававых падставах аховы гісторыка-культурнай спадчыны існуе неабходнасць правядзення абласных семінараў для кіраўнікоў гар- і райвыканкамаў, аддзелаў культуры ды мясцовых спецыялістаў па ахове спадчыны, а наступным этапам, на ўзроўні гарадоў і раёнаў, — для ўласнікаў і ўладальнікаў гісторыка-культурных каштоўнасцей, якім неабходна давесці інфармацыю аб устаноўленых заканадаўствам іх правах і абавязках. Ажыццёўленыя Мінскім аблвыканкамам і шэрагам райвыканкамаў вобласці такія семінары сталі карыснымі для кожнага з бакоў.

6. Патрабуе вырашэння пытанне захавання архітэктурна-канструктыўнага аблічча помнікаў архітэктуры і забеспячэння належнага ўтрымання тэрыторый аб'ектаў спадчыны. Упраўленням культуры аблвыканкамаў і Мінскага гарвыканкама сумесна з гар- і райвыканкамамі неабходна звярнуць увагу на ўладкаванне аконных і дзвярных запаўненняў, устаноўку кандыцыянераў, спадарожнікавых антэн, характар і размяшчэнне рэкламы, сезонных месцаў гандлю, пераабсталяванне памяшканняў першых паверхаў, пераведзеных у нежылы фонд. Пакуль жа ўсе гэтыя пытанні застаюцца выключным клопатам Міністэрства культуры. У той жа час, не толькі Законам аб ахове гісторыка-культурнай спадчыны, але і Законамі аб мясцовым кіраванні і самакіраванні, аб архітэктурнай, горадабудаўнічай і будаўнічай дзейнасці ў Рэспубліцы Беларусь у сферы аховы спадчыны ўстаноўлена значная, а часам і выключная кампетэнцыя мясцовых выканаўчых і распарадчых органаў.

Сярод многіх мерапрыемстваў па выкананні дзяржаўнай палітыкі ў сферы аховы гісторыка-культурнай спадчыны для рэалізацыі ў бліжэйшай перспектыве прапанаваны толькі найбольш важныя і актуальныя, з нашага пункта гледжання. Збольшага яны не патрабуюць значных капітальных затрат і часам залежаць ад добрай волі адказных за захаванне культурнага і гістарычнага набытку спецыялістаў. Не трэба вялікіх намаганняў для стварэння умоў наведвання, напрыклад, памятных мясцін, звязаных з імёнамі Адама Міцкевіча або аднаго з прадстаўнікоў славутага роду Нарбутаў, дзесьці ў Карчове або Начы. Гэтак сама і не вымагае значных высілкаў прывядзенне ў належны санітарны стан тэрыторыі, скажам, сядзібы Ромераў у Каралінаве або Ядвігіна Ш. у Карпілаўцы. Эфект жа ад рэалізацыі гэтых і шматлікіх іншых мерапрыемстваў будзе значны для ўсяго беларускага грамадства.

Абмеркаванне даклада

Пасля выступлення Ігара Чарняўскага прагучала пытанне ад віцэ-прэм'ера Анатоля Тозіка:

— Ігар Мяфодзьевіч, скажыце, калі ласка, наколькі, на вашу думку, у нас абгрунтаваны тыя крытэрыі, па якіх мы той або іншы аб'ект уключаем у дзяржаўны Спіс гісторыка-культурных каштоўнасцей? Часта чую прапановы, што лепш скараціць гэты Спіс, а грошы, якія мы маем, накіраваць на захаванне і рэстаўрацыю сапраўды вельмі важных для нашай гісторыі і культуры помнікаў…

У адказ Ігар Чарняўскі заўважыў, што крытэрыі вызначэння аб'ектаў для ўнясення ў Спіс гісторыка-культурных каштоўнасцей у Беларусі дастаткова распрацаваныя і абгрунтаваныя. Іншая справа, што некаторыя з гэтых крытэрыяў маюць даволі агульны характар. Міністэрства культуры разам з Нацыянальнай акадэміяй навук Беларусі правяло ўжо некалькі кансультацый на гэтую тэму, і таму, на думку Ігара Чарняўскага, у перспектыве цалкам магчыма ўдакладненне некаторых крытэрыяў у дачыненні да канкрэтных відаў аб'ектаў спадчыны — помнікаў архітэктуры і археалогіі.

Таксама задала пытанне Ігару Чарняўскаму і намеснік начальніка галоўнага ідэалагічнага ўпраўлення — начальнік упраўлення сацыяльна-культурнай палітыкі галоўнага ідэалагічнага ўпраўлення Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь Ірына Дрыга:

— Ігар Мяфодзьевіч, скажыце, калі ласка, ці будуць пад Дзяржаўную праграму "Замкі Беларусі" на 2012 — 2018 гады прыцягвацца пазабюджэтныя сродкі, згодна з даручэннем Прэзідэнта краіны? Як вядома, у Дзяржпраграму ўваходзяць 38 аб'ектаў, а для колькіх з іх адкрыты на сённяшні дзень дабрачынныя рахункі па зборы сродкаў? І што яшчэ можа зрабіць у гэтым накірунку Міністэрства культуры? Напрыклад, зладзіць сёлета і ў наступныя гады нейкія дабрачынныя акцыі, прыцягваць валанцёраў і гэтак далей...

Як адзначыў Ігар Чарняўскі, рахункаў для паступлення пазабюджэтных сродкаў адкрыта на сённяшні дзень няшмат. Так, адзін ёсць у Нясвіжы, і на гэты рахунак прыцягнута прыкладна 600 — 700 мільёнаў рублёў. Другі — у Навагрудку, і на гэтым рахунку Міністэрства культуры Беларусі сканцэнтравала сродкі ад правядзення рэспубліканскай латарэі "Скарбніца". Па другіх аб'ектах гэтае пытанне прапрацоўваецца, і, магчыма, сёлета будзе адкрыты яшчэ шэраг дабрачынных рахункаў для збору пазабюджэтных сродкаў.

Што да валанцёраў, дык на сённяшні дзень, па словах Ігара Чарняўскага, яны актыўна выкарыстоўваюцца толькі на адным аб'екце гісторыка-культурнай спадчыны — у Любчы. Хаця ў гэтым аспекце ёсць і пэўныя праблемы: усё ж такі правядзенне работ на падобных аб'ектах патрабуе прафесійнай падрыхтоўкі. Тэма валанцёрскага руху, а таксама прыцягнення спонсарскіх сродкаў, як адзначыў Ігар Чарняўскі, будзе абмеркавана самым бліжэйшым часам на пасяджэнні ў Мядзельскім райвыканкаме, каб асноўныя работы на мясцовым замку праводзіліся менавіта за кошт пазабюджэту. Што да іншых аб'ектаў, унесеных у Дзяржпраграму "Замкі Беларусі", дык, магчыма, і для іх рэстаўрацыі можна будзе задзейнічаць спонсарскія сродкі. Але, як лічыць Ігар Чарняўскі, абмяркоўваць гэтую тэму варта асобна на кожным канкрэтным прыкладзе. Найбольш перспектыўныя ў гэтым плане, на думку начальніка ўпраўлення па ахове гісторыка-культурнай спадчыны, тыя аб'екты, якія размешчаны на тэрыторыі Нарачанскага краю, Браслаўскага раёна Віцебскай і Заслаўскага раёна Мінскай абласцей.

"Гастрольныя туры па-за планам — па дагаворах"

лізу, — міжволі задаешся пытаннем: а ці адлюстроўваюць даныя паказчыкі дынаміку сацыякультурных працэсаў у рэгіёнах? Можа быць, у сувязі са зменай падыходаў варта перагледзець і крытэрыі ацэнкі? Так, на працягу некалькіх гадоў мы праводзім аптымізацыю сеткі, і колькасць устаноў культуры штогод зніжаецца. У бліжэйшыя гады гэты працэс будзе працягвацца, і пры аналізе дзейнасці па-ранейшаму рабіць стаўку на рост валавых паказчыкаў уяўляецца немэтазгодным. Да прыкладу, паказчык "колькасць клубных фарміраванняў", які ў першую чаргу залежыць ад колькасці ўстаноў, пры скарачэнні сеткі, як правіла, таксама зніжаецца. Штучнае павелічэнне гэтага паказчыка ажыццявіць тэхнічна можна, але ці трэба?

Спісанне старой і незапатрабаванай літаратуры ў бібліятэках прыводзіць да зніжэння аб'ёмаў фондаў, але, разам з тым, павялічвае абарачальнасць фонду, і разам з абнаўленнем фондаў з'яўляецца больш важным паказчыкам (*для даведкі: 25% састарэлай літаратуры*).

На наш погляд, аб'ектыўнай ацэнкай якасці і даступнасці паслуг можа стаць працэнт ахопу насельніцтва паслугамі культуры. Да прыкладу, бібліятэчным абслугоўваннем у Мінскай вобласці на працягу многіх гадоў ахоплена 40-41% насельніцтва, і ўзровень гэты даволі стабільны. Пры дэмаграфічных зрухах колькасць чытачоў з года ў год можа вар'іравацца, але працэнтны паказчык павінен адпавядаць гэўнаму ўзроўню. Такі ж падыход можа быць выкарыстаны і ў адносінах да клубных устаноў ды пазашкольных устаноў адукацыі ў сферы культуры, так званых школах мастацтваў. Сёння паказчыкамі Дзяржпраграмы "Культура Беларусі" нам прадпісана штогод павялічваць кантынгент ДШМ у сярэднім на 150-200 чалавек у год. Задача выканальная, але пра якасць дадатковай адукацыі і эканоміі бюджэтных сродкаў у дадзеным выпадку казаць не даводзіцца (96-97% выдаткаў па навучанні ў ДШМ нясе дзяржава, і 3-4% — бацькоўская плата). Лічым, што ў цяперашніх умовах варта казаць не пра павелічэнне, а пра захаванне кантынгенту навучэнцаў.

Патрабуюць карэкціроўкі паказчыкі названай праграмы ў частцы, якая звязана з развіццём прафесійнага мастацтва. У адпаведнасці з Указам Прэзідэнта № 457 рашэннямі аблвыканкамаў зацверджаны нарматывы па колькасці спектакляў і канцэртаў для кожнай арганізацыі, таму павелічэнне колькасці спектакляў і наведвальнікаў на 3% і 4% у год адпаведна загадзя невыканальнае.

І апошняе. У нас склалася сістэма работы з Белдзяржфілармоніяй па арганізацыі канцэртаў у камерных залах дзіцячых школ мастацтваў, пры якой план гастролей артыстаў Белдзяржфілармоніі загадзя ўзгадняецца з упраўленнем культуры і даводзіцца да аддзелаў культуры рай- і гарвыканкамаў. Прапануем падобную сістэму ўкараніць і для арганізацыі гастролей дзяржаўных прафесійных калектываў ды выканаўцаў ва ўстановах культуры абласцей. Своечасовае планаванне і раўнамернае размеркаванне творчых сіл рэспублікі па рэгіёнах створыць умовы для якаснай падрыхтоўкі мерапрыемстваў і дыялога паміж заказчыкам і выканаўцам.

Гастрольныя туры па-за рамкамі зацверджаных планаў, на наш погляд, могуць і павінны ажыццяўляцца на дагаворных умовах з кіраўнікамі арганізацый культуры на месцах, без садзейнічання дзяржаўных органаў абласнога ўзроўню.

КУЛЬТУРА-2013: КАНКРЭТНЫЯ ПАДЫХОДЫ

Даклад міністра культуры Рэспублікі Беларусь Барыса Святлова на выніковай калегіі Міністэрства культуры

(Працяг. Пачатак на стар.3 — 8.)

Фестывалі па-ранейшаму заставаліся дзейснай формай падтрымкі традыцыйнай мастацкай культуры.

Знакавымі ў 2012 годзе сталі: "Вясновы букет", "Звіняць цымбалы і гармонік", "Залатая пчолка", "Берагіня", "Аўцюкі", "Халі-Хало", "Кліч Палесся".

Метадычныя цэнтры застаюцца дзейснымі каардынатарамі культурнага развіцця рэгіёнаў краіны, забяспечваюць трывалую падтрымку народнай творчасці і культурна-творчых ініцыятыў насельніцтва.

Больш пільнай увагі да работы метадычных цэнтраў неабходна надаць з боку Інстытута культуры Беларусі, які, дарэчы, да гэтага часу яшчэ не вызначыўся са сваімі функцыямі і ўвогуле са сваім статусам.

Адным з важнейшых накірункаў у дзейнасці Міністэрства культуры з'яўляецца развіццё культуры ў сельскай мясцовасці.

У 2011 годзе пачалася рэалізацыя Дзяржаўнай праграмы ўстойлівага развіцця сяла на 2011 — 2015 гады, якая мае генетычную сувязь з папярэдняй дзяржаўнай праграмай. Дадзены падыход павінен забяспечыць працяг ажыццяўлення выбранай лініі развіцця культуры ў сельскай мясцовасці.

У галіне культуры працягваецца працэс аптымізацыі; пачалося стварэнне арганізацый культуры змяшанага тыпу. Дадзеная работа патрабуе ўдумлівага падыходу, скрупулёзнага аналізу і перспектыўнага мыслення.

БІБЛІЯТЭЧНАЯ СПРАВА

2012 год, як вядома, быў аб'яўлены Годам кнігі. Падаецца вельмі сімвалічным, што правядзенне Года кнігі ў нашай краіне супала з іншымі знакавымі культурнымі падзеямі.

Так, сваё 90-годдзе адзначыла галоўная бібліятэка краіны — Нацыянальная бібліятэка Беларусі. У рамках яе юбілею быў арганізаваны Міжнародны кангрэс "Нацыянальная бібліятэка як феномен культуры".

На высокім арганізацыйна-творчым узроўні адбылося святкаванне 130-годдзя з дня нараджэння славутых беларускіх Песняроў — Янкі Купалы і Якуба Коласа.

На высокім узроўні прайшлі мерапрыемствы, прысвечаныя 100-годдзю з дня нараджэння Максіма Танка.

Заканамерна, што ў мінулы Год кнігі асаблівая ўвага з боку дзяржавы была скіравана на камплектаванне фондаў бібліятэк.

Мясцовым органам улады па-ранейшаму неабходна забяспечваць выкананне вызначанага Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь нарматыву аб вылучэнні на камплектаванне фондаў бібліятэк не менш 15% сродкаў ад сумы бюджэтнага фінансавання, якая выдаткоўваецца на ўтрыманне названых устаноў. Па выніках 2012 года ў цэлым па рэспубліцы нарматыў выкананы (16%).

На жаль, не выконваецца ў поўным аб'ёме такі паказчык, як абнаўленне фондаў бібліятэк (на 5% у год). У выніку бібліятэчныя фонды па-ранейшаму ўтрымліваюць шмат састарэлай і незапатрабаванай чытачамі літаратуры. Таму ў бліжэйшай перспектыве неабходна правесці планавую работу па абнаўленні фондаў бібліятэк.

Актуальнай застаецца стварэнне Нацыянальнай электроннай бібліятэкі Беларусі. У 2012 годзе пасля доўгіх абмеркаванняў былі вызначаны стратэгічныя шляхі па вырашэнні гэтай задачы. Прыспеў час перайсці ад слоў да спраў і рэалізаваць дадзены План.

Гаворачы аб падзеях, што адбыліся ў 2012 годзе ў галіне бібліятэчнай справы, нельга не адзначыць эксперымент па інтэграцыі ў сельскіх населеных пунктах публічных і школьных бібліятэк, які праводзіўся згодна з даручэннем Урада.

Эканомія бюджэтных сродкаў ад правядзення поўнага ці частковага аб'яднання бібліятэк рознай ведамаснай прынадлежнасці склала каля 1,3 млрд. бел. рублёў, што пацвярджае эфектыўнасць праведзенай працы.

У той жа час, неабходна адзначыць, што ўвогуле ў 2012 г. сетка публічных бібліятэк Міністэрства культуры скарацілася амаль на 130 адзінак.

(Працяг на стар.10.)

КУЛЬТУРА-2013: КАНКРЭТНЫЯ ПАДЫХОДЫ

Даклад міністра культуры Рэспублікі Беларусь Барыса Святлова на выніковай калегіі Міністэрства культуры

(Працяг. Пачатак на стар. 3 — 9.)

МУЗЕЙНАЯ СПРАВА

2012 год таксама можна лічыць і Годам музеяў у нашай краіне.
Сёння дзяржавай створаны неабходныя ўмовы для развіцця і дзейнасці дзяржаўных музеяў. Вялікую ўвагу музеям краіны надае асабіста Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь А.Р. Лукашэнка.

У адпаведнасці з яго даручэннямі ў 2012 годзе быў адкрыты першы на прасторах блізкага і далёкага замежжа, унікальны Музей сучаснай беларускай дзяржаўнасці.

Пад пільнай увагай Прэзідэнта знаходзіцца і стварэнне новай экспазіцыі Беларускага дзяржаўнага музея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны.

У 2012 годзе дзейнасць дзяржаўных музеяў краіны была накіравана на выкананне мерапрыемстваў і паказчыкаў Дзяржаўнай праграмы "Культура Беларусі" на 2011 — 2015 гады.

Стабільна і ўпэўнена працаваў Нацыянальны мастацкі музей.

У цэлым музеямі па рэспубліцы выкананы ўсе паказчыкі. У 2012 годзе Музейны фонд Рэспублікі Беларусь павялічыўся на 54 716 музейных прадметаў. У параўнанні з 2010-м, аб'ём Музейнага фонду Рэспублікі Беларусь павялічыўся на 1,95%. Колькасць наведванняў музеяў у 2012 годзе Рэспублікі Беларусь склала 4 956,2. У параўнанні з 2010 годам, гэты паказчык павялічыўся на 24%.

Асобна неабходна адзначыць дзейнасць Міністэрства культуры і дзяржаўных музеяў па прыцягненні спонсарскіх сродкаў.

Так, буйныя міжнародныя выставачныя праекты — выстаўка "Каралеўскія скарбы: еўрапейскія шэдэўры са збору Лонданскага музея Вікторыі і Альберта", "Марк Шагал: жыццё і каханне" — упершыню экспанаваліся ў нашай краіне з дапамогай буйных прамысловых прадпрыемстваў, прадстаўнікоў бізнесу. "Белгазпрамбанк" сумесна з Нацыянальным мастацкім музеем пры падтрымцы Міністэрства культуры прафінансавалі буйны праект "Мастакі Парыжскай школы".

У бягучым годзе нам неабходна раскрыць у поўнай ступені вялікі патэнцыял такіх брэндавых для краіны музейных комплексаў, як Нясвіж і Мір.

ПРАФЕСІЙНАЕ МАСТАЦТВА

Беларусь па праве ганарыцца сваімі дасягненнямі ў прафесійным мастацтве. Не стаў выключэннем і 2012 год, які прынёс пэўныя поспехі ў розных відах мастацтва.

Тэатральнае мастацтва

Мінулы год стаў плённай старонкай творчай дзейнасці дзяржаўных тэатраў, якія дасягнулі станоўчых вынікаў, ажыццявілі новыя пастаноўкі спектакляў і абнавілі раней пастаўленыя, прынялі ўдзел у міжнародных ды рэспубліканскіх фестывалях, правялі гастролі па Беларусі і за мяжой.

Шэраг тэатральных калектываў у 2012 годзе ажыццяўляў сваю творчую і вытворчую дзейнасць у складаных умовах рэканструкцыі.

У 2012 годзе ў тэатрах г. Мінска былі ажыццёўлены новыя пастаноўкі спектакляў па дзяржаўным заказе Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь за кошт сродкаў рэспубліканскага бюджэту, прадугледжаных дзяржаўнай праграмай "Культура Беларусі" на 2011 — 2015 гады. Амаль усе дадзеныя спектаклі пастаўлены па творах беларускіх класікаў і сучаснікаў.

На пастаноўку новых спектакляў па дзяржаўным заказе ў 2012 годзе Міністэрствам культуры было выдаткавана з рэспубліканскага бюджэту каля 627 млн. беларускіх рублёў.

За 2012 год у дзяржаўных тэатрах Беларусі было пастаўлена 138 новых спектакляў — амаль столькі ж, як і ў 2011-м. Параўнанне паказчыкаў работы за 1-е паўгоддзе 2012 і 2011 гадоў паказвае рост у 2012-м: колькасці спектакляў на 4%; колькасці гледачоў, якія наведалі спектаклі — на 9%, колькасці гледачоў, якія наведалі канцэрты — на 15%.

(Працяг на стар. 11.)

Зінаіда КУЧАР,
дырэктар Дзяржаўнага музея гісторыі тэатральнай і музычнай культуры Рэспублікі Беларусь, намеснік старшыні Рэспубліканскай рады дырэктараў музеяў **(з выступлення)**:

"Набываць толькі ўнікальныя прадметы..."

Адкрыццём новых музеяў, стварэннем новых экспазіцый, ажыццяўленнем значных міжнародных і нацыянальных праектаў стаў для нас 2012 год. І невыпадкова, як адзначыў сёння Барыс Уладзіміравіч у сваім дакладзе, мы лічым, без перабольшвання, мінулы год — **Годам музеяў**.

Значнай падзеяй мінулага года з'явіўся **Першы Нацыянальны форум** "Музеі Беларусі"... За свой вялікі музейны вопыт шчыра скажу, што такой з'явы ў музейнай справе яшчэ не было... Правядзенне Форуму дало магчымасць **упершыню** сабрацца разам **не толькі музеям**, падпарадкаваным Міністэрству культуры, але і музеям іншых міністэрстваў і ведамстваў, турыстычным кампаніям, вытворцам сучаснага музейнага абсталявання як нашай краіны, так і гасцей Беларусі з краін СНД, замежных краін... Абмен вопытам, прапановы, прадстаўленыя праекты сталі падмуркам для стварэння **Праграмы развіцця музейнай справы да 2017 года, у якой адлюстраваны ўсе кірункі музейнай дзейнасці.**

Прадстаўнічы ўдзел рэгіёнаў падцвердзіў, што шмат цікавых праектаў неабходна аб'яднаць адной ідэяй і даць ім новае жыццё. Дадзенае пытанне абмяркоўвалася таксама і на калегіі Міністэрства культуры ў верасні мінулага года. Вынікам гэтага абмеркавання стала прапанова падрыхтоўкі **рэспубліканскага праекта "Культура не ведае правінцыі"**, якую мы ўжо прадставілі ў Міністэрства культуры. Праграма мае на мэце забяспечыць кожнага жыхара Беларусі, незалежна ад месца яго пражывання, магчымасцю ўбачыць каштоўныя помнікі гісторыі ды шэдэўры айчыннага і сусветнага мастацтва. Рэалізацыя гэтай праграмы дасць магчымасць прадставіць больш за 120 выставачных праектаў у рэгіёнах нашай краіны і пазбегнуць дубліравання пры падрыхтоўцы выставак. А аб'яднанне фондаў узбагаціць іх змест і прадстаўленне наведвальніку.

Другая задача, якую мы зараз выконваем у адпаведнасці з прапановамі, выказанымі на Форуме, і рашэннем калегіі Міністэрства культуры, — **распрацоўка Праграмы эфектыўнага выкарыстання Музейнага фонду**.

Мы добра разумеем, што адна з асноўных функцый музея — захаванне Музейнага фонду, ведаем, што сёння не больш за 7-10% прадметаў выкарыстоўваецца для паказу шырокай публіцы. Але калі мы не будзем прэзентаваць фонды наведвальніку (а гэта амаль 3 млн. прадметаў асноўнага фонду), цэлыя пакаленні так і не ўбачаць скарбы ды нацыянальныя здабыткі, якімі ганарыцца наша краіна. **Таму менавіта за выставачнымі праектамі — другое жыццё музейных фондаў.**

Адначасова ў падраздзеле праграмы "Камплектаванне музейнага збору" мы ставім пытанне **аб якасным адборы прадметаў у музейныя фонды.** Павінен стаць адзіным для ўсіх музеяў падыход у выкарыстанні бюджэтных сродкаў: набываць толькі тыя прадметы, якія з'яўляюцца ўнікальнымі і займуць належнае месца ў Музейным фондзе. **Практыка набыцця аднолькавых тыповых прадметаў у розных музеях павінна быць перагледжана. Сучаснай формай партнёрскіх адносін мусіць стаць дэпазіт.**

Стварэнне адзінай музейнай прасторы патрабуе стварэння сучаснай музейна-выставачнай інфраструктуры. А для гэтага павінны быць годныя фондасховішчы, залы, адпаведнае ўсім міжнародным стандартам выставачнае і асвятляльнае абсталяванне, сучасная сістэма тэмпературна-вільготнаснага рэжыму і аховы. На гэта звярнулі ўвагу і ўдзельнікі Форуму. Адпаведнае рашэнне было прынята калегіяй Міністэрства культуры.

Мінкультуры атрымала лісты ад упраўленняў культуры аблвыканкамаў аб тым, што выставачныя залы і абсталяванне ў асобных музеях адпавядаюць сучасным нормам, але вопыт правядзення нацыянальных і міжнародных праектаў паказаў, што замежныя партнёры ставяцца да гэтага пытання скрупулёзна, таму абласным упраўленням неабходна звярнуцца да яго яшчэ раз.

Пры распрацоўцы падпраграмы "Захаванне фондаў" прапануецца ўпраўленням культуры разгледзець пытанне **стварэння дэпазітарыяў для некалькіх музеяў**, што дасць магчымасць добраўпарадкаваць і захоўваць Музейны фонд тых музеяў, дзе сёння належныя ўмовы яшчэ не створаны. Прапануем таксама прадугледзець стварэнне ў іх рэгіянальных цэнтраў рэстаўрацыі і кансервацыі музейных прадметаў.

Важным кірункам дзейнасці музеяў з'яўляецца ўлік фондаў. Мы — першая з краін СНД, якая перайшла на электронны ўлік музейных прадметаў, мы першымі выкарысталі ў экспазіцыі Дзяржаўнага літаратурнага музея Янкі Купалы 3D-тэхналогіі, стварылі электронны Дзяржаўны каталог асабліва каштоўных прадметаў Музейнага фонду. Мы — краіна, якая стварыла першую на прасторы СНД і замежжа экспазіцыю XXI стагоддзя ў Музеі сучаснай беларускай дзяржаўнасці. Экспазіцыя атрымала высокую ацэнку спецыялістаў і наведвальнікаў...

...Наступны крок у развіцці музейнай справы — стварэнне і наступная рэалізацыя **Праграмы аўтаматызацыі Музейнага фонду.** Сёння не ва ўсіх музеях ёсць адпаведная тэхніка і праграмнае забеспячэнне для выканання задачы. Неабходна звярнуць на гэта ўвагу Віцебскаму і Гомельскаму ўпраўленням культуры. Праграмай прадугледжана мадэрнізацыя сайтаў, увядзенне новых электронных паслуг...

Музейны форум раскрыў існасць і новай для музеяў справы: мы адчулі падтрымку апякунскіх саветаў, да якіх напачатку ставіліся насцярожана. Мы ўбачылі дзейсную зацікаўленасць і ўвагу прадстаўнікоў прамысловасці, бізнесу, турыстычных кампаній, што выдаткавалі на арганізацыю правядзення форуму "Музеі Беларусі — трэцяму тысячагоддзю" прызавы фонд амаль у 400 млн. руб. у 17 намінацыях. На Форуме прадстаўлены тэхнічныя сродкі, выдатныя выстаўкі, многія з якіх сталі магчымымі з дапамогай саветаў...

І апошняе. Нашымі праграмамі прадугледжана шмат мерапрыемстваў, якія мы можам выканаць толькі з дапамогай **прафесійных кадраў**. Таму хочацца звярнуцца да навучальных устаноў. Калі са спецыялістамі, якія прыходзяць да нас на пасады навуковых супрацоўнікаў, праблема — вырашальная, то з некаторымі спецыялізацыямі, такімі, як падрыхтоўка **мастацтвазнаўцаў-экспертаў, спецыялістаў па экспазіцыйным дызайне, рэстаўратараў, якіх нам на месцах востра не хапае, — пытанне.** Адсутнасць іх асабліва адчувальная для тых, хто стварае новыя музеі і экспазіцыі.

Спадзяюся, прапановы, якія былі агучаны на калегіі Міністэрства культуры, падтрымаюць, і спецыяльнасць **"Экспертыза твораў мастацтва і культурных каштоўнасцей"** будзе адкрыта ў БДУКіМ. Прапануем разгледзець пытанне аб павелічэнні набору спецыялістаў Акадэміі мастацтваў па **экспазіцыйным дызайне**, якія сёння рыхтуюцца толькі ў рамках спецыялізацыі "Дызайн".

Сёння адбываецца змена пакаленняў, на працу прыйшлі маладыя супрацоўнікі са спецыяльнай музейнай адукацыяй, што гатовы арганізоўваць новыя музейныя праекты. Музейны форум стаў для іх адметнай пляцоўкай, каб раскрыць сябе і навучыцца новаму. Менавіта ад іх, моладзі, — словы ўдзячнасці за цудоўную ідэю яго правядзення. Сёння, з пачуццём гонару за ўсе музеі рэспублікі, мы рыхтуемся да Другога Нацыянальнага музейнага форуму-2014, да якога прыйдзем ужо з канкрэтнымі вынікамі рэалізацыі галіновых праграм.

КУЛУАРЫ: ПРАЗ ФОТА І СЛОВА

Валерый ГЕЙХМАН,
начальнік аддзела культуры Ельскага райвыканкама:

— Трэба закончыць распачатыя бягучыя рамонты чатырох сельскіх устаноў культуры. Вядзём мы іх сіламі сваёй гаспадарчай групы. Летась яна асвоіла 600 мільёнаў рублёў. На бягучы год выдаткавана больш за мільярд. Так што асноўную нашу праблему, звязаную з умацаваннем матэрыяльна-тэхнічнай базы, пакрысе вырашаем...

Працягваецца давядзенне да ладу Зашырскага культурна-спартыўнага цэнтра. Дарэчы, гэтая ўнікальная сельская клубная ўстанова толькі за студзень бягучага года зарабіла 24 мільёны пазабюджэтных рублёў...

КУЛЬТУРА-2013: КАНКРЭТНЫЯ ПАДЫХОДЫ

Даклад міністра культуры Рэспублікі Беларусь Барыса Святлова на выніковай калегіі Міністэрства культуры

(Працяг. Пачатак на стар. 3 — 10.)

Міністэрства культуры ў 2013 годзе ставіць перад дзяржаўнымі тэатрамі і канцэртнымі ўстановамі дзве асноўныя маштабныя задачы: першая — значна павысіць творчы ўзровень спектакляў і канцэртаў; другая — павялічыць ўласныя даходы арганізацый. Як бачым, гэтыя задачы цесна звязаны паміж сабой.

Першым крокам па вырашэнні дадзеных задач павінна стаць забеспячэнне росту новых пастановак за межамі нарматыўнага фінансавання, а таксама павелічэнне колькасці гледачоў шляхам выканання планаў па запаўняльнасці глядзельных залаў.

Перш чым перайсці да музычнага і харэаграфічнага мастацтва, колькі слоў асобна скажу пра Нацыянальны акадэмічны Вялікі тэатр оперы і балета.

Калектывам тэатра на асноўнай сцэнічнай пляцоўцы, у Камернай зале імя Л.Александроўскай, тэатральных залах і на канцэртных пляцоўках нашай рэспублікі праведзена 304 спектаклі і канцэрты, якія наведалі 254 тыс. чалавек. За гэты год ажыццёўлены пастаноўкі 10 спектакляў.

Тэатрам ажыццёўлены маштабныя культурныя праекты па прапагандзе класічнай музыкі, упершыню праведзены Міжнародны маладзёжны оперны форум краін СНД, Балтыі і Грузіі, III Мінскі міжнародны Калядны оперны форум.

Музычнае і харэаграфічнае мастацтва

Увогуле, сучаснае музычнае мастацтва Беларусі характарызуецца высокім прафесійным узроўнем. На сённяшні дзень канцэртную дзейнасць ажыццяўляюць 16 дзяржаўных канцэртных арганізацый рэспубліканскага і мясцовага падпарадкавання, якія аб'ядноўваюць каля 1 500 чалавек артыстычнага персаналу.

У краіне створаны ўнікальныя кампазітарская і выканальніцкая школы. Кожны год па дзяржаўным заказе набываецца больш за 150 сачыненняў беларускіх кампазітараў розных жанраў, сярод якіх — сімфанічныя і камерна-інструментальныя творы, вакальныя творы на вершы беларускіх аўтараў на роднай мове. На гэтыя мэты ў мінулым годзе было выкарыстана 250 млн. рублёў з рэспубліканскага бюджэту, што на 90 млн. больш, чым у 2011-м.

Асноўнымі накірункамі дзейнасці вядучай канцэртнай арганізацыі Беларускай дзяржаўнай філармоніі, якая святкавала сваё 75-годдзе з дня стварэння, сталі ажыццяўленне мэтавых музычных праграм, прапаганда лепшых узораў класічнага мастацтва і беларускай музыкі, правядзенне значных дзяржаўных культурных акцый у Рэспубліцы Беларусь і за яе межамі.

Пры фінансавай падтрымцы Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь на сцэне філармоніі быў праведзены шэраг буйных міжнародных культурных акцый: цыкл канцэртаў "Мінская вясна", II Міжнародны фестываль "Уладзімір Співакоў запрашае", VII Міжнародны фестываль Юрыя Башмета, Міжнародны музычны форум "Беларусы свету" ў рамках XXVIII Міжнароднага фестывалю мастацтваў "Беларуская музычная восень".

Стабільна і вынікова працаваў у 2012 годзе вядучы калектыў Беларусі — Нацыянальны канцэртны аркестр Беларусі пад кіраўніцтвам народнага артыста Беларусі, прафесара Міхаіла Фінберга. Ім быў праведзены XII Нацыянальны фестываль беларускай песні і паэзіі "Маладзечна", Міжнародны музычны праект "Мінскі джаз", музычныя праекты ў Хойніках, Нясвіжы, Чачэрску, Тураве, Пінску, Мсціславе. Пад час кожнага з мерапрыемстваў выконвалася ад трох да пяці прэм'ерных канцэртных праграм, прысвечаных творчасці беларускіх творцаў XVI — XX стагоддзяў.

Актыўна і плённа разгортвалася творчая дзейнасць найбуйнейшых творчых калектываў, такіх, як Нацыянальны акадэмічны народны аркестр імя Жыновіча, Нацыянальны акадэмічны народны хор Рэспублікі Беларусь імя Г.Цітовіча, Дзяржаўны ансамбль танца Беларусі, Беларускі дзяржаўны заслужаны харэаграфічны ансамбль "Харошкі", Беларускі дзяржаўны ансамбль "Песняры" і іншыя.

У Рэспубліцы Беларусь склалася і дзейнічае сістэма харэаграфічнага мастацтва, якая з'яўляецца неад'емнай часткай нацыянальнай культуры. У 2012 годзе Міністэрствам культуры была прадоўжана работа па далейшым развіцці і прапагандзе нацыянальнага харэаграфічнага мастацтва. Так, у адпаведнасці з рашэннем калегіі Міністэрства культуры па пытаннях харэаграфічнага мастацтва, якая адбылася ў сакавіку мінулага года, была пашырана геаграфія XXV, юбілейнага, Міжнароднага фестывалю сучаснай харэаграфіі. Упершыню вядомыя харэаграфічныя творы, прэм'ерныя балетныя спектаклі ўбачылі гледачы не толькі ў Віцебску, але і ў Мінску, Гродне, Барысаве, Маладзечне. Была актывізавана работа з маладымі харэографамі.

(Працяг на стар.12.)

Рычард СМОЛЬСКІ, старшыня Беларускага саюза літаратурна-мастацкіх крытыкаў, галоўны навуковы супрацоўнік навукова-даследчага аддзела Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў, доктар мастацтвазнаўства, прафесар **(з выступлення)**:

"Рынак дыктуе свае ўмовы..."

Хачу закрануць некалькі праблем развіцця беларускага мастацтва ў сучасных умовах. Сёння, як вядома, адбываюцца карэнныя змены ў сацыяльна-эканамічнай сферы, дзе паступова ўсталёўваюцца рынкавыя законы. Адначасова пашыраюцца і развіваюцца прыватныя формы ўласнасці ў многіх галінах гаспадарання. Узмацняюцца, пад уплывам глабалізацыі, міжнародная інтэграцыя і кааперацыя. Зразумела, што гэтыя змены ў базіснай аснове беларускай дзяржавы ды грамадства робяць пэўны ўплыў на культурнае і духоўнае жыццё сучаснага чалавека...

Нельга не заўважыць і яшчэ адной прыкметы сённяшняга часу, пра якую мы іншым разам саромеемся казаць з трыбуны. Гэта паступовае фарміраванне ў нетрах нашага грамадства філасофіі празмернага прагматызму, што прыводзіць да ўсталявання так званага буржуазнага грамадства спажывання, якое ўжо даўно пануе ў заходнім свеце...

Таму пошукі свайго месца ў рынкавай мадэлі дыктуюць беларускім творцам неабходнасць распрацоўкі сучасных інавацыйных формаў мастацкай дзейнасці, вынікі якой былі б успрыняты і прыняты, у першую чаргу, масавым спажыўцом культурнага прадукту.

У апошнія гады беларускія творцы, асабліва — маладое і сярэдняе пакаленні, выйшлі на міжнародную арэну і пачалі даволі актыўна асвойваць замежны мастацкі рынак. Значна актывізавалася сумесная творчая праца, найперш — з расійскімі майстрамі тэатра, кіно, выяўленчага мастацтва і дызайну. Гэта, безумоўна, прынесла свой плён для ўсёй айчыннай мастацкай культуры, у тым ліку і ў надзённай справе адаптацыі да новых рыначных пераўтварэнняў у сферы культуры. Але, разам з тым, нарадзілася і шмат новых праблем, якія чакаюць свайго вырашэння.

Да прыкладу, у сферы тэатральнага мастацтва. Асаблівасці эстэтычнай і эканамічнай прыроды тэатра робяць яго даволі дакладным індыкатарам ці, калі хочаце, адбіткам усёй нацыянальнай мастацкай культуры таго або іншага народа, у тым ліку і беларускага. Не можа быць яркага нацыянальнага тэатра, калі няма нацыянальнай літаратуры, выяўленчых, экранных і пластычных мастацтваў, музыкі, архітэктуры, дызайну, а таксама, што важна, эстэтычна адукаванага гледача.

Яшчэ адна прынцыпова важная асаблівасць. Тэатр, вобразна кажучы, — вельмі дарагая "цацка" для дзяржавы і грамадства: ён вымагае значных матэрыяльна-фінансавых выдаткаў, наяўнасці пэўнай інфраструктуры, спецыяльных навучальных устаноў, традыцый і, нарэшце, культурнай ды маральнай развітасці грамадства.

Усё гэта нараджае шматлікія праблемы арганізацыі і развіцця тэатральнай справы на сучасным этапе. У ранейшыя часы Міністэрства культуры Беларусі даволі цвёрда трымала руку "на пульсе" тэатральнага жыцця. Адказныя супрацоўнікі апарата Мінкультуры рэгулярна наведвалі прэм'еры не толькі ў сталічных, але і ва ўсіх абласных тэатрах, своечасова заўважалі таленавітую моладзь, асабліва рэжысёраў, і бралі, як кажуць, "на карандаш", падтрымлівалі, дапамагалі ў фарміраванні творчага лёсу. Актыўна працаваў Саюз тэатральных дзеячаў… Але, як спяваюць "Песняры", няма таго, што раньш было. Зараз СТД раз у год узнагароджвае хрустальнымі "Паўлінкамі" тэатральных дзеячаў і на гэтым сваю місію лічыць закончанай. І поўнасцю знікае з творчага жыцця да наступнага 27 сакавіка — Міжнароднага дня тэатра.

Вось, дарэчы, толькі адзін красамоўны вынік такой бяздзейнасці: тэатральныя рэжысёры зусім нядаўна не здолелі абараніць свае законныя правы як аўтары спектакляў. Цяпер яны — проста выканаўцы, з усімі вядомымі наступствамі. А раней жа існавала Гільдыя рэжысёраў пры СТД, якая збіралася, абмяркоўвала свае прафесійныя праблемы, даволі паспяхова адстойвала інтарэсы прафесіі і тэатра ў цэлым…

Мастацкія і адміністратыўныя кіраўнікі большасці тэатраў сёння лічаць сябе гэткімі "ўдзельнымі князькамі": маўляў, як хачу, так і кірую творчым калектывам і ўвогуле тэатральным жыццём. А як жа іначай! Пануе свабода творчасці, цэнзуры няма, крытыкаў не чуваць, адным словам — райскае жыццё...

Я не супраць "райскага" жыцця ў гэтым недасканалым свеце, хаця вельмі цяжка ўяўляю яго ў творчым асяроддзі. Добра, калі тэатрам кіруе таленавіты, руплівы, па-сапраўднаму дзяржаўны і нацыянальна свядомы дзеяч. Напрыклад, Аляксандр Анісенка ў Віцебску, Аляксандр Козак у Брэсце, Андрэй Новікаў у Магілёве, якія праводзяць вядомыя і аўтарытэтныя фестывалі, падтрымліваюць новую беларускую драматургію…

А калі такія, як Мікалай Пінігін — безумоўна, таленавіты, вынаходлівы рэжысёр? Той, які ўпарта раз за разам паўтарае, што на адноўленай сцэне Купалаўскага не будуць ставіць ні Петрашкевіча, ні Макаёнка, ні Крапіву ды іншых беларускіх драматургаў, таму што яны, маўляў, на яго думку, не адпавядаюць сучаснаму мастацкаму ўзроўню. Вельмі спрэчная, на мой погляд, пазіцыя. Я вось думаю так: а што, напаўаматарскія замалёўкі нашага шаноўнага пачынальніка беларускай драматургіі Дуніна-Марцінкевіча — гэта шэкспіраўскі ўзровень драматычнай літаратуры? Што, еўрапейскія тэатры "выстраіліся ў чаргу", каб ставіць яго п'есы?

Я разумею амбітныя планы Пінігіна паставіць на Купалаўскай сцэне польскага класіка Адама Міцкевіча: гэта цікава, дый у Варшаву запросяць на гастролі… Хто ж супраць — тварыце! Але мне ўсё ж здаецца, што для мастацкага кіраўніка першага нацыянальнага тэатра больш важным было б паклапаціцца пра беларускую драматургію, пра адкрыццё новага маладога аўтара… Так, як даўней, напрыклад, зрабіў Леанід Рахленка, які на першым этапе адкрыў і падтрымаў Кандрата Крапіву, як Канстанцін Саннікаў, які адкрыў Андрэя Макаёнка, як Валерый Раеўскі, які адкрыў Дударава, Курэйчыка, як Валерый Анісенка, які наогул "нарадзіў" цэлае пакаленне беларускіх так званых драмаўцаў на сцэне РТБД.

Прабачце за банальнасць, але прыводзіць вядомы і неаспрэчны факт: нацыянальны тэатр можа паспяхова развівацца і быць цікавым як айчыннаму, так і замежнаму гледачу толькі на аснове нацыянальнай, у тым ліку новай, літаратуры. Вось можаце сабе ўявіць рэакцыю, напрыклад, французскай творчай грамадскасці, калі б мастацкі кіраўнік славутага парыжскага тэатра "Камедзі Францэз" заявіў, што яму, маўляў, Мальер — як костка ў горле! Абрыдла, маўляў, хачу новага, "блакітнага" мастацтва пра аднаполыя шлюбы… Тым больш, для Францыі цяпер гэта вельмі актуальна.

Больш перспектыўным мне ўяўляецца шлях мастацкага кіраўніка Нацыянальнага тэатра імя Максіма Горкага Сяргея Кавальчыка, які выступіў з вельмі цікавай ініцыятывай: правесці сёлета год беларускай драматургіі на сцэне Горкаўскага тэатра. І ў яго планах — паставіць новыя п'есы Дударава, Рудкоўскага, Багуслаўскага, Курэйчыка, нарэшце, класічную спадчыну Андрэя Макаёнка…

Я не буду далей развіваць гэтую тэму, якая ўвогуле патрабуе асобнага абмеркавання. Скажу пра іншае. У 2000 годзе Міністэрствам культуры разам з Акадэміяй мастацтваў была распрацавана праграма развіцця тэатральнага мастацтва на перыяд 2001 — 2010 гады. Гэтая праграма зрабіла вельмі пазітыўны ўплыў на тэатральнае жыццё. Тое, што большасць тэатраў рэканструявана, палепшылася матэрыяльна-тэхнічная база тэатральных устаноў — вынік дзейнасці праграмы.

Але на сёння ўжо шмат што змянілася ў нашай рэчаіснасці. І патрабуюцца сучасныя, у тым ліку і рыначныя падыходы да арганізацыі тэатральнай справы. Таму, на мой погляд, патрэбна распрацаваць зусім новыя, так бы мовіць, правілы гульні. Магчыма, і новы Закон Рэспублікі Беларусь "Аб тэатральнай дзейнасці" — з улікам відавочных працэсаў камерцыялізацыі нашага жыцця і тэатральнай справы. Такія законы ёсць у Расіі, на Украіне, у іншых краінах.

Таксама вельмі важнае пытанне — лёс нацыянальнага кінамастацтва. А лёс гэты вырашаецца менавіта зараз. І тут два шляхі развіцця: альбо ў нас застанецца проста кінафабрыка "Беларусьфільм", з усімі атрыбутамі менавіта кампаніі па прадастаўленні адпаведных паслуг, і тады кінастудыя заробіць не два мільёны, як летась, а дваццаць два, альбо яна зробіць усё для таго, каб развівалася беларускае нацыянальнае кінамастацтва, якое прыносіла адпаведную карысць нашай культуры, гледачу, грамадству і дзяржаве.

У гэтай справе спатрэбяцца выключныя намаганні Дэпартамента па кінематаграфіі, кінастудыі, факультэта экранных мастацтваў, Саюза кінематаграфістаў, іншых дзяржаўных і грамадскіх структур.

І тут не магу не сказаць вось яшчэ пра што. Як вядома, кадры вырашаюць усё. Таму выхаванцы факультэта экранных мастацтваў Акадэміі мастацтваў патрабуюць не проста асаблівай увагі, а, у сілу ўнікальнасці прафесіі кінарэжысёра, зусім іншых падыходаў і да падрыхтоўкі спецыялістаў, і да іх размеркавання. Дзе, напрыклад, сёння выхаванцы Міхаіла Пташука? Большасць з іх працуе на расійскіх тэлеканалах. Летась пяць выхаванцаў выпусціў Аляксандр Яфрэмаў. З іх пакуль толькі ў аднаго спецыяліста ёсць надзея на рэжысёрскі дэбют... Гэтыя прыкрыя прыклады можна доўжыць. А так быць не павінна.

Таксама выкажу думку сваіх калег: магчыма, варта было б ладзіць раз на два-тры гады Форум беларускай творчай інтэлігенцыі для шырокага абмеркавання надзённых праблем нацыянальнай культуры і мастацтва. А яшчэ даўно наспеў час і неабходнасць пабудаваць у Мінску Дом творчасці, які стаў бы культурным цэнтрам беларускай сталіцы, па-сапраўднаму родным і ўтульным домам для вялікай сям'і айчынных дзеячаў тэатра і кіно, выяўленчага мастацтва, тэлебачання і гэтак далей.

КУЛЬТУРА-2013: КАНКРЭТНЫЯ ПАДЫХОДЫ

Даклад міністра культуры Рэспублікі Беларусь Барыса Святлова на выніковай калегіі Міністэрства культуры

(Працяг. Пачатак на стар. 3 — 11.)

Эстраднае мастацтва

У мэтах развіцця нацыянальнага эстраднага музычнага мастацтва, стварэння спрыяльных умоў для творчасці таленавітых выканаўцаў, павышэння прэстыжу беларускіх аўтараў, выканаўцаў і прадстаўнікоў эстраднага музычнага мастацтва прадоўжыліся новыя творчыя праекты — "Нацыянальная музычная прэмія", "Спяваючыя гарады", "Залатая калекцыя беларускай эстрады", праведзеныя сумесна са "Сталічным тэлебачаннем".

У гэтым годзе неабходна прадоўжыць работу над гэтымі праектамі, але сур'ёзна папрацаваць над змяненнем іх канцэпцыі.

Міністэрствам культуры сумесна з Другім нацыянальным тэлеканалам з 14 лютага па 21 верасня 2012 г. была праведзена Рэспубліканская грамадска-культурная акцыя "Беларусь у маім сэрцы" .

XXI Міжнародны фестываль мастацтваў "Славянскі базар у Віцебску" ў чарговы раз пацвердзіў, што не саступае стандартам еўрапейскіх мерапрыемстваў. Але ж трэба памятаць: Кіраўнік дзяржавы чакае ад нас новай канцэпцыі фестывалю, што мы і павінны здзейсніць у бягучым годзе.

Увогуле, Прэзідэнтам надаецца вялікая ўвага стварэнню спрыяльных умоў для развіцця айчыннай эстрады.

Выяўленчае і манументальнае мастацтва

У 2012 годзе Міністэрствам культуры мэтанакіравана вялася работа па развіцці выяўленчага мастацтва. Адной з самых важных і актуальных задач у гэтым кірунку з'яўляецца планамерная работа па падтрымцы творчай дзейнасці мастакоў.

На працягу мінулага года Міністэрствам культуры пастаянна вяліся дзяржаўныя закупкі твораў мастакоў для папаўнення фондаў музеяў краіны. У 2012-м міністэрствам было закуплена мастацкіх твораў на суму каля 900 млн. рублёў.

Разам з тым, гэтую работу неабходна больш актывізаваць у абласцях.

Значнай падзеяй мінулага года ў культурным жыцці нашай краіны з'явілася правядзенне выстаўкі сучаснага мастацтва "І Мінскае трыенале сучаснага мастацтва "БелЭКСПА-Арт-2012", якая была арганізавана па даручэнні Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

Міністэрствам культуры ў мінулым годзе праводзілася актыўная палітыка ў сферы стварэння твораў манументальнага мастацтва.

Да адкрыцця Дня беларускага пісьменства ў г. Глыбокае Віцебскай вобласці ў 2012 г. за кошт сродкаў Міністэрства культуры былі створаны помнікі-бюсты славутым беларусам — дзеячам навукі культуры і гісторыі.

Таксама Міністэрства культуры будзе ў 2013 годзе працягваць працу над стварэннем помніка беларускаму і рускаму паэту, драматургу, грамадскаму дзеячу і асветніку Сімяону Полацкаму ў Маскве, помніка народнаму артысту СССР, заснавальніку легендарнага вакальна-інструментальнага ансамбля "Песняры" Уладзіміру Мулявіну ў г. Екацярынбургу.

Цыркавое мастацтва

Паспяхова ў мінулым годзе працаваў Гомельскі дзяржаўны цырк. Яго калектыў дасягнуў паспяховых вынікаў па павышэнні творча-мастацкага ўзроўню і высокіх вытворчых паказчыкаў.

Але ж нявырашаным засталося галоўнае пытанне — стварэння нарматыўнай базы, якая рэгулявала б дзейнасць гэтай мастацкай сферы. І тут Міністэрства культуры павінна ініцыяваць пэўныя захады.

Кінематаграфія

Галоўнай падзеяй 2012 года ў галіне кіно было прыняцце ўсіх неабходных падзаконных актаў, якія вынікаюць з Указа Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь № 567 "Аб мерах па дзяржаўнай падтрымцы і стымуляванні развіцця кінематаграфіі". Па гэтых пытаннях прыняты тры пастановы Урада і пастанова Міністэрства культуры.

У 2012 годзе Кінастудыяй і Відэацэнтрам створана 7 мастацкіх фільмаў (усяго 31 серыя), 68 дакументальных і 9 анімацыйных.

Беларускія кінематаграфісты ўдзельнічалі ў 57 міжнародных кінафестывалях, нашы фільмы атрымалі 74 узнагароды: у Арменіі, Германіі, Грэцыі, Ізраілі, Індыі, Іспаніі, Італіі, Казахстане, Літве, Расіі, Польшчы, Славакіі, Францыі, Чэхіі, Украіне.

(Заканчэнне на стар. 13.)

Ірына ДРЫГА, намеснік начальніка галоўнага ідэалагічнага ўпраўлення — начальнік упраўлення сацыяльна-культурнай палітыкі галоўнага ідэалагічнага ўпраўлення Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь:

"Мадэрнізацыя і сістэмнасць"

Перш за ўсё, хачу падзякаваць кожнаму з вас, ад сельскага, раённага спецыяліста да работніка рэспубліканскіх устаноў культуры, за адданую дзейнасць у мінулым годзе: пад час кампаніі па правядзенні парламенцкіх выбараў, а таксама — акцыі "Беларусь у маім сэрцы", за дапамогу ў падрыхтоўцы мерапрыемстваў з удзелам Кіраўніка дзяржавы, што прайшлі ў Нясвіжскім палацава-паркавым ансамблі, Нацыянальным гістрычным музеі, Музеі гісторыі горада Мінска, дзе адкрывалася Галерэя Міхаіла Савіцкага. Шмат зроблена ўпраўленнем культуры Магілёўскага аблвыканкама: святкаванне Купалля пераўтварылася з рэгіянальнага ў свята рэспубліканскага і міжнароднага маштабу. Неаспрэчныя і дасягненні Віцебскага аблвыканкама, які разам з Міністэрствам культуры вось ужо столькі гадоў арганізоўвае брэндавы для Беларусі "Славянскі базар у Віцебску"... Інакш кажучы, у сферы культуры працуюць надзейныя і самаадданыя людзі.

Бягучы год у нацыянальнай эканоміцы праходзіць пад знакам мадэрнізацыі. І, як вы самі цудоўна адчуваеце, мадэрнізацыя ў культуры патрэбна не менш, чым на вытворчасці. Апошнім часам Міністэрства культуры зрабіла для гэтага неблагі задзел. Маю на ўвазе прававое забеспячэнне галіны і рэалізацыю шматлікіх творчых акцый, якія вывелі нашу культуру на якасна новы ўзровень. Цяпер галоўнае — перавесці гэтыя пачынанні ў рэчышча сістэмнай працы, не згубіць час, не знізіць тэмпы пераўтварэнняў, давесці іх да лагічнага завяршэння. Таму на пэўныя пытанні пры арганізацыі дзейнасці ў 2013 годзе я хацела б звярнуць увагу і апарата Міністэрства, і прадстаўнікоў усіх сфер культуры.

Што да кінавідэагаліны, то сёння ў дачыненні да яе чамусьці часцей згадвалі "Беларусьфільм". Кінастудыя, на якую ўскладаюцца функцыі фабрыкі стужак, цэнтра развіцця нацыянальнага кінамастацтва, адна з такімі глабальнымі задачамі не справіцца — неабходна працаваць усім разам. Не магу не згадаць у сувязі з гэтым неабходнасць рэфармавання механізма дзяржаўнай падтрымкі кінематографа. Год таму быў прыняты Указ № 567, які стымулюе вытворчасць менавіта беларускіх фільмаў. І гэта задача не толькі Нацыянальнай кінастудыі, але і ўсіх зацікаўленых дзяржаўных ды прыватных кампаній... Але першыя вынікі паказалі, што пэўныя праблемы павінны знайсці адлюстраванне і пры карэкціроўцы прававых актаў, і ў практыцы работы Дэпартамента па кінематаграфіі ў час размеркавання фінансавай дзяржпадтрымкі.

Першае і галоўнае патрабаванне — конкурс пры гэтым павінен быць аб'ектыўным і празрыстым, а яго вынікі мусяць спрыяць з'яўленню якаснага кіно і не выклікаць у кінематаграфістаў дыскусій. Другі нюанс звязаны з вытворчасцю дакументальных стужак: прыярытэт павінны мець тыя кінапраекты, якія адпавядаюць тэматыцы, прапанаванай Міністэрствам культуры. Толькі тады, напэўна, мы ўбачым актуальнае, сацыяльна значнае нацыянальнае кіно. Наступнае патрабаванне: стварэнне належных умоў для таго, каб і дзяржаўныя, і прыватныя кампаніі (як гэта і закладзена ва Указе) мелі магчымасць накіроўваць прыбытак, атрыманы ад сваіх фільмаў, на развіццё кінавытворчасці. Толькі тады ў нас з'явіцца канкурэнтнае асяроддзе.

Пры наступных конкурсах варта ўлічваць і такі крытэрый эфектыўнасці выкарыстання дзяржпадтрымкі, як колькасць гледачоў, касавы збор ад пракату фільмаў. Укладваць сродкі дзяржавы ў кінастужкі, якія лягуць на паліцу ці будуць паказаны толькі на фестывалі, — прынамсі, не зусім правільна. Паўтаруся: задача Указа — павелічэнне колькасці якаснага нацыянальнага кіно. Арыенцір на сумесную кінавытворчасць — правільны, але ён не павінен прывесці да таго, што наш бюджэт застанецца крыніцай фінансавання адно толькі замежных праектаў. Хацелася б больш адваротных прыкладаў: калі наш сцэнарый, наша рэжысура цікавяць расійскую кампанію, якая гатова інвеставаць менавіта наша кіно.

Эфектыўнасць кінапракату — адзін з крытэрыяў ацэнкі працы намеснікаў старшынь аблвыканкамаў, якія курыруюць культуру. Шчыльна знітаваны з гэтым і пераход абласных кінатэатраў на лічбавыя тэхналогіі. За першае паўгоддзе мінулага года па Расіі ў лічбавым фармаце была паказана большасць прапанаваных кінатэатрамі фільмаў. Мы не павінны адставаць. Як, дарэчы, і ў прасоўванні свайго кіно за мяжой. Нашы кінакампаніі тут працуюць пакуль разрозна, асаблівага эфекту

Наталля АЎДЗЕЕВА, старшыня Цэнтральнага Камітэта Беларускага прафсаюза работнікаў культуры:

"Крокі сацыяльнага партнёрства"

Паважаныя ўдзельнікі пасяджэння! Першае. Наша сацыяльнае партнёрства паміж Міністэрствам культуры і яго галіновым прафсаюзам будуецца, у першую чаргу, на аснове галіновага пагаднення. Новае тарыфнае пагадненне, даводзім да вашага ведама, падпісана на 2013 — 2015 гады, зарэгістравана ў Міністэрстве юстыцыі і, адпаведна, з'яўляецца асновай для заключэння мясцовых пагадненняў і калектыўных дагавораў. Дагаворы ў нас пашыраны амаль паўсюдна. Гэта азначае, што мы павінны вельмі аператыўна прыступіць да працэсу ўнясення змяненняў і дапаўненняў у гэтыя вельмі важныя дакументы. ЦК прафсаюза, абкамы прафсаюза гатовы ўсебакова дапамагчы ў дадзеным пытанні — і шляхам правядзення юрыдычнай экспертызы, і шляхам правядзення мерапрыемстваў па абмене вопытам па *калдагаворнай* дзейнасці. Тым больш, што ў мінулым годзе мы з вамі правялі першы рэспубліканскі конкурс на лепшы калектыўны дагавор. І ёсць цудоўныя прыклады: гэта аддзел культуры Гродзенскага райвыканкама, Крупская раённая цэнтралізаваная сістэма ды іншыя.

Другое. Я спадзяюся, што мы з вашай дапамогай завершым працэс стварэння пярвічных прафарганізацый нашага прафсаюза ва ўстановах сістэмы Міністэрства культуры. Каб не было намераў і думак, і мар у незалежных прафсаюзаў заняць нашу арыентаваную падтрымку галіны, беларускага грамадства ў цэлым, нішы.

Хачу таксама вас праінфармаваць, што ў гэтым годзе сістэма "Белпрафсаюзкурорт" рэалізуе пуцёўкі для членаў прафсаюза, якія ўваходзяць у склад Федэрацыі прафсаюза работнікаў Беларусі, і іх дзяцей ад 4 да 14 гадоў коштам на 25 працэнтаў ніжэй. У мінулым годзе гэтая лічба складала 20 працэнтаў.

Мы з вамі актыўна будзем і надалей праводзіць работу па выкананні на месцах заканадаўства аб працы і ахове працы. Гатовы праводзіць мы, прафсаюзы, у вашых інтарэсах, інтарэсах нашай галіны бясплатны па гэтых напрамках аўдыт. Калі ласка, запрашайце — будзем рады аказаць гэтую дапамогу. Таму што, калі мы прыходзім ужо на планавую праверку, то адсюль будуць выцякаць іншыя наступствы, мера адказнасці, па, перш за ўсё, Указе № 40 Кіраўніка дзяржавы.

У завяршэнне. Год беражлівасці. Канешне ж, наш прафсаюз сумесна з Міністэрствам культуры праводзіць конкурс па эканоміі, беражлівасці матэрыялаў, энергарэсурсаў. Я як лідар нашага прафсаюза прашу вас: давайце берагчы яшчэ і адно аднаго, берагчы нашых людзей, уважліва ставіцца да кадраў. Я думаю, што мы гэта ў стане, у сілах зрабіць. Дзякаваць богу, абышліся ў 2012 годзе без судовых разбораў. Спадзяюся, так будзе і сёлета. Я публічна шчыра дзякую вам ад свайго імя, ад імя ўсяго нашага прафактыву за вельмі канструктыўнае супрацоўніцтва, добрае, узважанае!..

не назіраецца. Добра, што два гады запар дзейнічае беларускі павільён на Канскім кінарынку. Але, на жаль, аддача ад гэтага — мінімальная. Натуральна, не выпадае абвінавачваць у тым "Беларусьфільм", які за пазабюджэтныя сродкі выязджае ў Каны і толькі спрабуе яшчэ ўкараніцца на прэстыжным кінарынку.

Мабыць, Дэпартаменту па кінематаграфіі, Міністэрству культуры мэтазгодна вывучыць вопыт работы кампаніі "Роскино", якая дастаткова паспяхова прасоўвае расійскую прадукцыю за мяжу, у тым ліку стварае свае павільёны на Канскім, Берлінскім фестывалях, ладзіць кінарынкі ў рамках Маскоўскага кінафэсту. Напэўна, надышоў час, каб і нашаму "Лістападу" дадаць камерцыйнай дзелавітасці, каб і гэты фэст стаў сродкам прэзентацыі айчыннага кіно замежным дыстрыб'ютарам. А можа, варта падключыць да справы Міністэрства замежных спраў, нашы пасольствы і цэнтры беларускай культуры ў замежжы? Калі для такой каардынацыі сіл трэба звяртацца ва Урад, да Кіраўніка дзяржавы, дык, калі ласка, звяртайцеся, уносьце свае прапановы...

Рэалізацыя праектаў, звязаных з развіццём актуальнага ці сучаснага мастацтва, — задача і творчая, і палітычная. Калі новае пакаленне творцаў не адчуе належнага клопату аб сабе, мы гэтых мастакоў проста згубім. Летась у Мінску прайшло першае ў гісторыі краіны Трыенале сучаснага мастацтва. Падзея павінна стаць пачаткам новай культурнай традыцыі. Таму ў бягучым годзе Цэнтр сучасных мастацтваў, час станаўлення якога ўжо адбыўся, павінен сістэмна працаваць над новымі выставачнымі праектамі. Трэба практычна ўвасобіць ідэю стварэння Арт-дэпо і выдзялення для яго адпаведных памяшканняў. Ужо цяпер варта задумацца і пра чарговы буйны выставачны праект у галіне сучаснага мастацтва, які можна прымеркаваць, напрыклад, да Чэмпіянату свету па хакеі...

Не буду доўга спыняцца на пытаннях рэстаўрацыі і рамонту аб'ектаў культуры. Праблемы тут вядомыя. Паўгода не маглі набыць для Купалаўскага тэатра ні светлавую, ні гукавую апаратуру з-за нейкіх памылак заказчыка і пастаўшчыкоў. А будынак пасля рэстаўрацыі ўжо гатовы. Наспявае чарговы даўгабуд у выглядзе кінастудыі "Беларусьфільм". Летась першую чаргу будаўніцтва аўтагаспадаркі не здалі: таксама з прычыны несвоечасовай пастаўкі абсталявання. Міністэрства культуры павінна ўзмацніць кантроль за ўзвядзеннем і абсталяваннем гэтых аб'ектаў.

Наконт рэалізацыі Дзяржаўнай праграмы "Замкі Беларусі" хачу нагадаць словы Кіраўніка дзяржавы, які пад час наведання Полацкага дзяржуніверсітэта казаў пра больш шырокае выкарыстанне нашых мясцовых сучасных, стылізаваных пад даўніну матэрыялаў для рэканструкцыі гісторыка-архітэктурных помнікаў, пра тое, што гатовыя, адрэстаўраваныя ўжо аб'екты павінны працаваць як, да прыкладу, Полацкі калегіум, пераўтвораны ва ўніверсітэт.

Найпершая музейная задача — стварэнне экспазіцыі Беларускага дзяржаўнага музея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны. Проста цудоўна, што ўстановай кіруе актыўны і неабыякавы дырэктар Сяргей Азаронак, з якім мы зранку, перад пасяджэннем гэтай калегіі, паспелі абмеркаваць многія спрэчныя пытанні... Просьба да ўсіх музейшчыкаў і Міністэрства культуры — каб гэтая экспазіцыя пераканала: наш музей — першы сярод падобных, мы ў адказе перад усім светам за справу захавання памяці аб мінулай вайне. Новая музейная ўстанова павінна ярка і дакладна адлюстраваць неўміручасць Подзвігу Беларусі і ўсяго савецкага народа. З першай да апошняй залы названая ідэя павінна прасочвацца. Калі мы гэтага не зробім, дык не зробіць ніхто... Так, экспазіцыя будзе сучаснай, але пры выкарыстанні найноўшых музейных тэхналогій трэба захаваць колішні дух установы, да якой мы ўсе так прызвычаіліся, і максімальна паказаць усё багацце калекцый. Толькі ў такім выпадку пазбегнем праблемных момантаў, што ўзніклі пры арганізацыі Музея сучаснай беларускай дзяржаўнасці, калі былі вялікія залы, мультымедыя, інфакіёскі, а экспанатаў напачатку аказалася мала, экспазіцыю давялося аператыўна дафарміраваць.

Вялікае значэнне ў справе развіцця нашых брэндаў маюць народныя промыслы. Трэба ўсяляк падтрымліваць рэалізацыю Праграмы па вытворчасці слуцкіх паясоў. Але гэта, так бы мовіць, толькі вяршыня айсберга. Брэнды варта рабіць і з іншых нашых твораў народнага мастацтва. Кіраўнік дзяржавы паспрыяў рэкламе бездзежскіх фартушкоў з Дрыбінскага раёна, калі адзначыў развіццё гэтага промыслу спецыяльнай прэміяй. А справу трэба і далей рухаць, прэзентаваць узоры гэтага ўнікальнага старадаўняга рамяства на рэспубліканскіх мерапрыемствах... Зусім не надаецца ўвага пераўтварэнню ў брэнды твораў сучаснага дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва. Зрабіць — можам, разрэкламаваць і прадаць — не заўжды. Якія кірмашы ў Мінску? "Вясновы букет" ладзіцца раз у год і далекавата — у Лошыцы. Ёсць кірмаш у Палацы мастацтва, але праводзіцца ён цягам двух тыдняў. Між тым, у гэтым будынку цягам двух месяцаў гандлявалі шырспажывам пад маркай "Усходняга базару". Дык мо Міністэрству, упраўленню культуры горада варта прадумаць пытанне аб пастаянна дзеючай пляцоўцы, дзе народныя ўмельцы, майстры сучаснага мастацтва маглі б і выстаўляцца, і рэалізоўваць свае творы на льготных умовах...

Патрабуе неадкладнага павышэння ўзровень аналітычнай і навуковай прапрацоўкі праектна-прававых актаў, інавацый, увогуле — усіх праблемных момантаў у сферы культуры. На жаль, усё ідзе тут метадам спроб і памылак. Між тым, адпаведны замежны вопыт не заўжды аналізуецца і выкарыстоўваецца. Да прыкладу, два гады запар "вынаходзіцца веласіпед" па Нацыянальнай тэатральнай прэміі, замест таго, каб вывучыць досвед расійскай "Залатой маскі". Падаецца, істотную дапамогу ў пытаннях абмеркавання праектаў прававых актаў, правядзення экспертыз ды маніторынгаў могуць і павінны аказваць грамадскія творчыя структуры. Да прыкладу — Рэспубліканскі грамадскі савет па культуры і мастацтве, які пакуль працуе без належнай аддачы...

КУЛЬТУРА-2013: КАНКРЭТНЫЯ ПАДЫХОДЫ

Даклад міністра культуры Рэспублікі Беларусь Барыса Святлова на выніковай калегіі Міністэрства культуры

(Заканчэнне. Пачатак на стар. 3 — 12)

Агульная сума прыцягнутых у фільмавытворчасць пазабюджэтных сродкаў па стане на 20 снежня дасягнула 66,7 млрд. рублёў (74,7% ад агульнага кошту праектаў).

Увогуле ад усіх накірункаў дзейнасці кінастудыяй атрымана у эквіваленце больш за 2,2 млн. долараў ЗША (рост валютных паступленняў у параўнанні з мінулым годам склаў 168%).

Разам з тым, перад кінастудыяй "Беларусьфільм" і сёння ставіцца задача паляпшэння мастацкай і тэхнічнай якасці фільмаў, актуальнасці іх тэматыкі, што павінна ўзмацніць іх канкурэнтаздольнасць. Акупнасць фільмаў кінастудыі дасягнула амаль 30%, аднак гэта не павінна стаць падставай для самазаспакаення. Таму актуальным застаецца пытанне актыўнага прыцягнення ў кінематаграфію пазабюджэтных сродкаў.

Найважнейшай задачай таксама з'яўляецца стварэнне нацыянальнага фільма, які павінен стаць яркай падзеяй у кінамастацтве, атрымаць моцнае сацыяльнае гучанне, прыцягнуць увагу масавага глядача.

Што да кінапракату, то кінавідэапракатнымі арганізацыямі рэспублікі ў 2012 годзе абслужана 16 млн. гледачоў, платныя паслугі ад кінавідэапаказаў склалі 132 899,9 млн. рублёў, што на 87,3% больш, чым у 2011-м.

Галоўнай задачай на бліжэйшую перспектыву з'яўляецца мадэрнізацыя кінатэатраў у адпаведнасці з сучаснымі патрабаваннямі, устаноўка ў іх абсталявання для дэманстрацыі фільмаў у лічбавым фармаце.

МІЖНАРОДНАЕ СУПРАЦОЎНІЦТВА

У 2012 годзе Міністэрства культуры па-ранейшаму імкнулася да развіцця і ўмацавання ўзаемакарыснага супрацоўніцтва ў сферы культуры з усімі зацікаўленымі партнёрамі. Найбольш актыўна яно развівалася з краінамі-суседкамі. Праводзіліся абменныя Дні культуры, адбываліся ўдзелы ў разнастайных фестывалях, конкурсах, праходзілі гастрольныя туры. Наладжваліся рэгіянальныя і прыгранічныя сувязі. Пашыралася супрацоўніцтва ў рамках Саюзнай дзяржавы, СНД і ЕўрАзЭС. Гораду Магілёву быў нададзены не толькі статус Культурнай сталіцы Беларусі, але і статус "Культурная сталіца СНД 2013 года".

На працягу 2012-га Міністэрствам культуры сумесна з замежнымі партнёрамі былі праведзены Дні культуры Беларусі ў Катары, Туркменістане, Санкт-Пецярбургу, Літве, Кітаі, а таксама Дні культуры Катара, Азербайджана, Ізраіля ў Беларусі.

У 2012 годзе Міністэрствам культуры былі падрыхтаваны і падпісаны пяць міжнародных дагавораў, у тым ліку міжурадавая праграма з Катарам, міжведамасныя праграмы і пратаколы супрацоўніцтва з Расіяй, Польшчай, Сербіяй, Кітаем.

У 2012 годзе працягвалася работа па ўмацаванні і пашырэнні культурных кантактаў з суайчыннікамі, якія пражываюць за мяжой, а іх у розных краінах — больш за 2,5 мільёна чалавек. Адбыліся дзелавыя і творчыя сустрэчы кіраўніцтва Міністэрства культуры, мастацкіх калектываў рэспублікі з беларусамі Польшчы, Літвы, Латвіі, Эстоніі, Расіі.

Да завяршальнай стадыі падышла работа над Законам "Аб беларусах замежжа"; у Савет Міністраў быў унесены праект Дзяржаўнай праграмы "Беларусы ў свеце", мэтай якога з'яўляецца стварэнне сістэмы дзяржаўнай падтрымкі і развіцця партнёрскага супрацоўніцтва з беларусамі замежжа ў сацыяльна-эканамічнай, інфармацыйнай, адукацыйнай, культурнай ды іншых сферах. У 2013 годзе пры падтрымцы Міністэрства культуры адбудуцца чарговы З'езд беларусаў свету і II Фестываль мастацтваў беларусаў замежжа.

Шаноўныя калегі!

2012 год быў годам, насычаным новымі праектамі і падыходамі, і ўсімі дасягненнямі мы абавязаны вам, высокапрафесійным спецыялістам сваёй справы — дзеячам тэатральнага, выяўленчага, музычнага і кінамастацтва, канцэртных арганізацый, супрацоўнікам музеяў і бібліятэк, работнікам дамоў культуры, майстрам народнай творчасці, усім тым, хто ад усяго сэрца, шчыра і самаддана, працуе на карысць культуры Беларусі.

Дзякуй вам за вашу творчую працу! Дзякуй за ўвагу!

КУЛУАРЫ: ПРАЗ ФОТА І СЛОВА

Кацярына ДУЛАВА,
рэктар Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі:

— Сёлета ў нас вельмі шмат планаў. У першую чаргу, яны звязаны з пэўнымі пераўтварэннямі самой адукацыйнай сістэмы, яе аптымізацыяй. Гэта будзе датычыцца як спецыяльнасцей, так і саміх кафедр. Акрамя таго, наперадзе нас чакаюць два капітальныя рамонты, у тым ліку галоўнага будынка — помніка архітэктуры. У выніку мы зможам пашырыць плошчы — вельмі неабходныя для маладых творцаў, — а таксама палепшыць тэхнічную базу. Акрамя таго, яшчэ адзін наш клопат, які, будзем спадзявацца, сёлета вырашыцца, — набыццё якасных музычных інструментаў…

Сяргей МАЕЎСКІ,
дырэктар Беларускага дзяржаўнага ансамбля "Песняры":

— Калі казаць пра нашы надзённыя клопаты, то зусім мала часу засталося да выхаду новага альбома. Да таго ж, плануюцца сумесныя праекты на ўзроўні Саюзнай дзяржавы. У прыватнасці, запланавана актыўная гастрольная дзейнасць. І ўсё ж самы вялікі клопат — недахоп фінансавання. У нас ёсць цікавыя задумкі: гэта і кінапраект, і пастановачнае тэатральнае шоу. Усё тое, вядома, патрабуе адпаведных сродкаў…

Уладзімір ЛІТВІНАЎ, намеснік генеральнага дырэктара Гомельскага палацава-паркавага ансамбля па навуковай рабоце:

— Спадзяюся, што падвядзенне вынікаў мінулага года, іх асэнсаванне дазволіць распрацаваць рэалістычныя планы на будучыню. Краіне неабходны амбіцыйныя праекты ў культурнай галіне. Культура можа быць прыбытковай, але зыходзіць трэба з рэальнага патэнцыялу: браць да ўвагі і становішча нашай матэрыяльнай базы, і кваліфікацыю кадраў. Не трэба рабіць з культуры спрынтара, якому кажуць: вось ты прабег стометроўку за дзесяць секунд, заўтра ты мусіць прабегчы за дзевяць, потым — за восем, і нарэшце — за адну. Непамерны цяжар бегу навыперадкі не на карысць справе. Задачы, якія ставяцца перад культурай, павінны быць пад'ёмнымі…

Віктар АЛЬШЭЎСКІ, кіраўнік Творчых майстэрняў "Цэнтр сучасных мастацтваў":

— Праблемы, якія сёння мае наш Цэнтр, — гэты праблемы росту, станаўлення. Мы набываем досвед. Цэнтр існуе нядаўна, але, спадзяюся, магу сказаць, што ён ужо адыгрывае пазітыўную ролю ў культурным працэсе і сцвердзіўся як з'ява, вартая ўвагі. Летась мы здзейснілі шэраг маштабных праектаў, да нас цягнецца творчая моладзь, намі цікавяцца, пра нас гавораць. Але ўсё зробленае — гэта толькі задзел на будучыню, гарантам якой мы ўспрымаем словы міністра культуры: "Цэнтру сучасных мастацтваў — быць!"…

Што да больш глабальных задач, то беларускаму дызайну не хапае сістэмнасці — хацелася б гэта выправіць. У свой час у нас існаваў Інстытут дызайну, Нацыянальны дызайн-цэнтр,— сёння гэтых арганізацый няма. З аднаго боку, попыт на прафесію расце (сёння ужо амаль усе педагагічныя ВНУ маюць аддзяленне дызайну), а з іншага ж — прымяніць свае веды спецыялістам у жыцці складана...

Валерый АНІСЕНКА, дырэктар — мастацкі кіраўнік Нацыянальнага акадэмічнага драматычнага тэатра імя Якуба Коласа, заслужаны дзеяч мастацтваў краіны:

— Насамрэч, сёння ў нас шмат падстаў для размоў, для абмеркавання праблем, якіх "вышэй за дах", — як глабальных (як стварыць, захаваць нашае агульнае культурнае поле?), так і цалкам канкрэтных. Што да апошніх, то прыкладаў тут дастаткова. Сёння наш Коласаўскі тэатр перавыканаў план на 201%. Мы выплацілі прэмію ўпершыню за многія гады, зарабілі больш за мільярд. Але на наступны год, у выніку, будзем вымушаны зарабіць яшчэ больш. Так нельга! Відавочна, што гэтае пытанне патрабуе разгляду. Па-другое, у нашым тэатры востра стаіць кадравае пытанне. Катастрафічна не хапае моладзі. У мяне больш за 20 чалавек пенсійнага ўзросту. Пры ўсёй павазе да сталасці, маладыя людзі — гэта зусім іншая энергія. Са сцэны мусіць ісці жыццё! Але ніхто не хоча ехаць па размеркаванні, і гэта — трагедыя! З іншага боку, запрасіць маладых спецыялістаў няма куды: існуюць праблемы з жыллём і не толькі. Усе яны патрабуюць вырашэння. Пры гэтым сітуацыя ў тэатры вельмі спрыяльная: практычна нараджаецца новы тэатр…

КУЛУАРЫ: ПРАЗ ФОТА І СЛОВА

Анатоль Тозік уручае Ганаровую грамату Урада старшыню Беларускага саюза кінематаграфістаў Віктару Васільеву.

Барыс Святлоў уручае дыплом пераможцы ў Рэспубліканскім конкурсе "Клуб года" дырэктару Вяззеўскага СДК з Асіповіччыны Мікалаю Забаўскаму.

Юрый ІГРУША, дырэктар "Беларускага відэацэнтра":

— Задача калегіі, у першую чаргу, — падвесці вынікі 2012 года. Таму тут наўрад ці будуць вырашацца нейкія стрыжнявыя пытанні. Калі ж згадаць тое, што мяне хвалюе, дык зараз увогуле пад пытаннем лёс "Беларускага відэацэнтра". Але сказаць нешта канкрэтнае я пакуль не магу.Зараз гэтае пытанне — на стадыі вырашэння...

Ірына БЕЛЯКОВА, дырэктар Магілёўскага дзяржаўнага прадпрыемства "Кінавідэапракат":

— Мінулы год стаў для нашай арганізацыі паспяховым: выкананы і нават перавыкананы ўсе даведзеныя паказчыкі, паспяхова адбываецца пераход кінатэатраў на лічбавае абсталяванне. На сёння ў Магілёве лічбавыя залы ёсць у кінатэатрах "Радзіма", Космас", "Чырвоная зорка". Нельга забыцца і на Бабруйск, дзе за кошт бюджэтных сродкаў была адчынена лічбавая зала, і на Горкі, дзе ў рамках Рэспубліканскага свята "Дажынкі" адрамантаваны кінатэатр. Аднак трэба развівацца далей: ёсць рэзерв — тыя памяшканні, якія пакуль здаюцца ў арэнду. Гэта залы магілёўскіх кінатэатраў "Ветразь" і "Космас" — ім патрэбны рамонт і новае абсталяванне. Таму для нас пытанне фінансавання на дадзены момант — самае важнае…

Дзмітрый СУРСКІ, старшыня Беларускага саюза дызайнераў (на калегіі быў узнагароджаны Падзякай міністра культуры Рэспублікі Беларусь):

— За васямнаццаць гадоў, цягам якіх узначальваю Саюз, я ўпершыню атрымліваю такую ўзнагароду. Гэта вельмі прыемна! Ёсць шмат цікавых праектаў, якія хацелася б ажыццявіць з прыходам новага міністра. Па-першае, гэта стварэнне Музея плаката. У Беларускім Саюзе дызайнераў ёсць буйная калекцыя плакатаў. Сёння яна, на жаль, ляжыць на паліцах, а трэба, каб людзі яе бачылі. Добра, каб будучая музейная ўстанова працавала не толькі як музей: каб там праходзілі плакатныя конкурсы, біенале, самыя розныя мерапрыемствы.

Вераніка ВІНЕЛЬ, дырэктар Магілёўскага абласнога тэатра драмы і камедыі імя В.Дуніна-Марцінкевіча (г. Бабруйск):

— Мяркую, што і нацыянальныя, і абласныя тэатры маюць у чымсьці падобныя клопаты. Гэта — і рост выручкі ад спектакляў, і кадравы голад, і памеры зарплат… Да спецыфікі тэатра не абласнога горада варта далучыць яшчэ і неабходнасць новых пастановак. Іх цыклічнасць мусіць быць частая, бо публіка, якой у нашым горадзе каля двухсот тысяч, прагне новага матэрыялу. А гэта — дадатковыя мазгавыя штурмы. Сёлета ў нашым тэатры зноў пройдзе Фестываль беларускай нацыянальнай драматургіі. Да яго зараз і рыхтуемся…

Сяргей ДЗЕЙКАЛА, начальнік аддзела культуры Мастоўскага раёна Гродзенскай вобласці:

— Адно з тых пытанняў, што актуальнае заўсёды, — паляпшэнне матэрыяльна-тэхнічнай базы ўстаноў культуры раёна. Так, летась зрабілі рамонт даху Цэнтральнай раённай бібліятэкі Мастоў, які да гэтага часу працякаў. Плануем сёлета адрамантаваць фасад гэтай бібліятэкі, а таксама распачаць рамонтныя работы ў мясцовай ДШМ. Працягваецца асвойванне фінансавых сродкаў (а гэта 260 тысяч еўра), атрыманых, паводле Праграмы трансгранічнага супрацоўніцтва з ЕС "Польшча — Літва — Беларусь", на рамонт Гудзевіцкага дзяржаўнага літаратурна-краязнаўчага музея. Сёлета, прыкладна ў красавіку, як я мяркую, мы скончым там усе рамонтныя работы і абавязкова зладзім у паселішчы рэгіянальны ці, калі атрымаецца, нават міжнародны фестываль традыцыйнага народнага мастацтва. Натуральна, абавязкова запросім на свята і карэспандэнтаў "К"!..

Уладзімір САМСОНАЎ, начальнік аддзела культуры Лідскага раёна Гродзенскай вобласці:

— Сёлета ў Лідзе пройдуць мерапрыемствы, прысвечаныя 690-годдзю райцэнтра. Натуральна, самы чынны ўдзел у гэтых святочных акцыях возьмуць і культработнікі раёна. А з сакавіка распачынаем рэалізацыю сумеснага з Тракайскім замкам праекта паводле Праграмы трансгранічнага супрацоўніцтва ЕС "Польшча — Літва — Беларусь". Агульны кошт атрыманага гранту роўны 160 тысячам еўра. Пад час рэалізацыі сумеснага праекта, які называецца "Дух продкаў жыве ў нашых сэрцах", зладзім буйныя святочныя мерапрыемствы, звязаныя з традыцыйнымі народнымі рамёствамі, правядзём навукова-практычныя канферэнцыі, фальклорныя экспедыцыі і многае іншае. Таксама плануем развіваць традыцыі ткацтва: сёлета створым у Лідзе своеасаблівую ткацкую мануфактуру — будзем выконваць разнастайныя заказы ад дзяржаўных і прыватных арганізацый ды фірмаў на паясы, касцюмы, іншыя вырабы з ільну. Далучым, дарэчы, да гэтай справы і раён: сёлета запланавана адкрыць яшчэ чатыры філіялы Лідскага РЦР у сельскай мясцовасці. Цяпер падводзім пад гэта неабходную "базу": набываем ткацкія станкі, праводзім навучанне нашых культработнікаў ткацкаму майстэрству… Гэтая дзейнасць, на мой погляд, — даволі перспектыўная, і, спадзяюся, мы зможам заняць сваю нішу на рынку, што, натуральна, прынясе дадатковы прыбытак сферы культуры Лідчыны…

Мікалай ЗАБАЎСКІ, дырэктар Вяззеўскага СДК Асіповіцкага раёна Магілёўскай вобласці:

— Адна з праблем, якую хацелася б агучыць, — набыццё гукаўзмацняльнай і светлавой апаратуры для СДК. Наяўная тэхніка беларускай вытворчасці, на жаль, не надта якасная. Гэтае пытанне трэба абавязкова вырашаць, бо, набываючы няякасную апаратуру, якая, да таго ж, часта ламаецца і патрабуе замены ды рамонту, мы проста растрачваем дзяржаўныя грошы. А набыць прадукцыю замежных вытворцаў — больш якасную і эфектыўную — мы, як вядома, не можам, бо бюджэтныя сродкі выдаткоўваюцца толькі на закупку айчыннай апаратуры. Пазабюджэтныя сродкі выкарыстаць пад гэтыя мэты не заўсёды атрымліваецца, таму трэба альбо дазволіць установам культуры набываць замежную апаратуру за сродкі бюджэту, альбо павышаць якасць айчыннай прадукцыі да адпаведнага, еўрапейскага, узроўню…

Ігар СІГОЎ, дырэктар Рэспубліканскага тэатра беларускай драматургіі:

— Сёлета будзем працягваць актыўна развіваць міжнароднае супрацоўніцтва. Так, у маі, спадзяюся, у нас атрымаецца паехаць на тэатральныя фестывалі ў Херсон, Чаркасы, Арол. Таксама сёлета ў тэатры абавязкова будуць новыя прэм'еры. Тыя прэм'ерныя паказы, што прайшлі летась, атрымаліся, на мой погляд, удалымі, таму будзем рухацца ў гэтым накірунку і надалей. Так, Аляксандр Гарцуеў зараз працуе над спектаклем "Раскіданае гняздо", а пасля ў нашым тэатры адбудзецца пастаноўка Сяргея Паўлюка паводле п'есы ўкраінскага драматурга Віктара Понізава "Збегчы з Лісінора". Спадзяюся, яна будзе цікавая нашаму гледачу, бо гэта незвычайны і нават, я сказаў бы, дзёрзкі спектакль. На пачатку восені плануем паказаць п'есу "Прымакі" ў пастаноўцы таго ж Аляксандра Гарцуева, а таксама, магчыма, на сцэне тэатра цягам года будуць прадстаўлены некалькі новых п'ес у пастаноўцы іншых рэжысёраў — як айчынных, так і замежных…

Максім ШАПАВАЛАЎ, намеснік дырэктара Гомельскай абласной філармоніі:

— Сёлета запланавана актыўная гастрольная дзейнасць нашых калектываў, іх удзел у міжнародных конкурсах. Вялікія спадзяванні звязваем з дзейнасцю нашага менеджара па маркетынгу — гэтую пасаду толькі нядаўна ўвялі ў нашай філармоніі. Наш галоўны клопат сёння — адсутнасць сваёй канцэртнай залы. Абнадзейвае той факт, што нам некалькі месяцаў таму перадалі адпаведнае памяшканне, і, спадзяюся, пры спрыяльных умовах, ужо сёлета артысты змогуць радаваць сваіх прыхільнікаў на ўласнай сцэне…

Матэрыялы з пасяджэння калегіі падрыхтавалі Яўген РАГІН, Юрый ЧАРНЯКЕВІЧ, Кастусь АНТАНОВІЧ, Пётра ВАСІЛЕЎСКІ, Дар'я АМЯЛЬКОВІЧ, Юрый ІВАНОЎ (фота).

Напрыканцы пасяджэння калегіі міністр культуры Рэспублікі Беларусь Барыс Святлоў падзякаваў за выступленні і адзначыў, што ўсе прапановы, якія прагучалі пад час пасяджэння, будуць унесены ў заключнае рашэнне калегіі. А пасля віцэ-прэм'ер Урада Анатоль Тозік і кіраўнік Міністэрства культуры ўручылі ўзнагароды лепшым спецыялістам сферы па выніках 2012 года.

Работнікі культуры і мастацтва былі ўзнагароджаны Ганаровымі граматамі Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь, атрымалі Падзякі міністра культуры краіны. Пераможцам рэспубліканскага агляду-конкурсу на лепшую арганізацыю работы аграгарадоцкіх устаноў культуры «Клуб года» былі ўручаны дыпломы Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь.

Вялікі рукапіс мастака, які так поўна друкуецца ўпершыню

"Свае ўспаміны напішу Вам у лісце..."

(Працяг. Пачатак у № 6 за 2013 г.)

"...Так здарылася, што з Жорам мы кантактавалі і ў час нашай вучобы ў ВХУТЕМАСе-ВХУТЕИНе, а на пачатку 1930-х разам уступілі ў мастацкае аб'яднанне станкавістаў (ОСТ). Потым я выехаў на Радзіму, у Беларусь, потым — вайна, фронт... І толькі праз дваццаць гадоў пасля Перамогі я зноў сустрэўся з Георгіем у яго маскоўскай творчай майстэрні на Вялікай Маслаўцы: ён ужо быў народным мастаком Расіі, шырока вядомым савецкім пейзажыстам-наватарам. За кілішкам "Столичной" гарэлкі мы з асалодай доўга ўзгадвалі той далёкі і незабыўны час — час бурлівай маладосці, дзёрзкіх мар і надзей, светлых памкненняў...

Акім Шаўчэнка — студэнт ВХУТЕМАСа. 1927 г.

Сярод мастакоў-педагогаў, якія паказвалі свае творы ў студыі, запомніўся Сяргей Аляксандравіч Каўроўскі (ён пайшоў з жыцця ў час Вялікай Айчыннай вайны ва ўзросце 54 гадоў. — **Б.К.**) з ягонай "Месячнай сімфоніяй". Карціна таксама, як у Ніскага, была выканана мазочкамі, але акрэслена чорным контурам накшталт візантыйскай мазаікі. Хаця, аднак, тады я гэтых слоў — "Візантыя", "мазаіка" — не ведаў. Памятаю, на палатне быў намаляваны чалавек у лодцы, сярод зараснікаў. Усе магчымыя адценні блакітных, ружовых, зеленаватых і сініх тонаў рабілі гэты твор вельмі прывабным ды святочным.

З работ іншых мастакоў запомніў серыю карцін Афанасія Сазонава, таго самага аўтара роспісаў на вакзале. Назваў палотнаў зараз не памятаю, але ўсе яны былі прысвечаны злабадзённай на той час тэме — мяшэчнікам і іхняму нялёгкаму побыту. Карціны распавядалі, як гэтыя людзі ехалі на Украіну, каб набыць там зерне і муку; як прывозілі адтуль сваім галодным сем'ям харчы альбо проста перапрадавалі іх на базары, каб набыць газу ці соль. На адной карціне — адчыненыя дзверы таварнага вагона, а ў вагоне ўжо поўна людзей з мяхамі ды рукзакамі, але людзі ўсё працягваюць ламіцца і караскацца ў тамбур. На другой карціне — таксама таварны вагон, але цягнік ужо рухаецца. На даху сядзяць і ляжаць мяшэчнікі, паміж імі складзены мяхі. А на буферах вагона, на дошках, — таксама людзі. Наступная карціна: на даху вагона сядзяць маладыя хлопцы і дзяўчына, над іхнімі галовамі — высокае сонечнае неба...

Усе творы былі напісаны алеем на фанеры, у акадэмічнай манеры, але добра зроблены па колеры. На жаль, работ гэтага мастака мне больш бачыць не давялося. Праўда, пазней, у 1930-я гады, я неяк набыў адну паштоўку з рэпрадукцыяй карціны Сазонава "Беларускія партызаны": на саламяным даху вясковай хаты — два мужыкі, адзін з якіх, са стрэльбай, углядаецца ўдалечыню, відаць, у бок размяшчэння белапалякаў... Неяк я сустрэў Афанасія Сцяпанавіча ў студыі Урубеля: ён быў апрануты ў форму дэмабілізаванага вайскоўца — у фрэнч і боты. Запомніўся адзін сказ з ягонага аповеду: "Сёння рэалізм не ў пашане". Тады я даведаўся: Сазонаў толькі што вярнуўся з Петраграда, куды ездзіў восенню 1923 года паступаць у толькі што створаны петраградскі ВХУТЕМАС. Але — не паступіў...

А.Шаўчэнка. "Кветкі". 1952 г.

Што я рабіў у студыі імя Міхаіла Урубеля? Маляваў, рысаваў, кампанаваў. Як усе — нічога асаблівага. Памятаю, пры ўваходзе ў нашу студыю стаяла велізарнае пано, зробленае з некалькіх аркушаў фанеры, з постаццю сцяганошы, выкананае таленавітым мастаком Аляксандрам Быхоўскім, дарэчы, як я даведаўся пазней, першым ілюстратарам апавяданняў І.Бабеля. А побач, на Працоўнай вуліцы, знаходзілася тая самая майстэрня Дэ Валера. Сярод маіх знаёмых там працаваў і скульптар Нісан Шыфрын. Пасля вайны я сустрэў яго ў Маскве: ён — вядомы мастак-сцэнограф, заслужаны дзеяч мастацтваў РСФСР, лаўрэат Сталінскай прэміі за афармленне спектакляў па п'есах А.Астроўскага ў Тэатры Савецкай Арміі.

...У тыя часы скульптурныя партрэты былі ў Гомелі паўсюль: у клубах, школах, на прадпрыемствах, у агіткутках, у чырвонаармейскіх частках. Большасць з іх выконвалася з гліны асаблівага, чырванаватага, колеру і ніколі не псавалася. Захаванасць была ідэальнай! А што да газетна-часопіснай графікі, дык гэтая галіна таксама была прэрагатывай прафесійных мастакоў. Той самы Аляксандр Якаўлевіч Быхоўскі пастаянна выконваў для абласной газеты "Палеская праўда" арыгінальныя малюнкі, застаўкі, невялікія кампазіцыі (у 1926 г. выйшла кніга "А.Быхоўскі. Графіка", а ў 2005-м у Пушкінскім музеі адбылася яго персанальная выстаўка. — **Б.К.**). На газету працавалі і Малец, і Каўроўскі, і Балашоў — прыроджаны газетны графік. Той самы Балашоў, які ў 30-я як мастак зрабіў "цукерачку" з часопіса "Вокруг света"! Пазней Масква дала прытулак і іншаму вельмі таленавітаму мастаку — А.Яўменеку, які стварыў у Гомелі яскравыя ды прыгожыя плакаты для вітрын кнігарняў. У сталіцы ён стаў вядомым мастаком-мультыплікатарам. Нешта і я спрабаваў рысаваць для газет. Гэта былі першыя мае спробы ў галіне графікі, што потым мне нейкім чынам спатрэбілася ў першыя гады Вялікай Айчыннай вайны, калі я прымаў удзел у стварэнні агітплаката "Раздавім фашысцкую гадзіну!".

Франтавыя замалёўкі ваенных гадоў. 1944 г.

Ішоў час. І аднойчы заняткі ў студыі Урубеля перапыніліся. Безумоўна, было шкада, але доўга мы не засмучаліся, бо ў Гомелі было дзе папрацаваць. Нядоўга думаючы я скіраваўся на вуліцу Савецкую, дзе месцілася гарнізонная студыя, што падпарадкоўвалася Чангарскай кавалерыйскай дывізіі. Там, на трэцім паверсе будынка, кожны вечар адбываліся заняткі па маляванні. Любы ахвотны атрымліваў аркуш шэрай паперы і стрыжань пячнога вугалю. Праўда, большасць пачаткоўцаў-мастакоў былі вайскоўцы-кавалерысты, пераможцы белага генерала Урангеля, хаця заходзілі і цывільныя. У вялікай, добра асветленай зале былі ўстаноўлены спецыяльна зробленыя падстаўкі. Ты падыходзіш да падстаўкі, прымацоўваеш паперу, і — малюй на здароўе! Сюды прыходзілі дзяўчаты ды хлопцы: хтосьці — проста дзеля цікаўнасці, нехта — папазіраваць.

Сярод кавалерыстаў, між іншым, былі адораныя хлопцы, адзін з якіх нават захапляўся жывапісам Барысава-Мусатава! У адным з куткоў для будучых скульптараў у вялікім чане мокла гліна; у іншым — стаялі мяхі з гіпсам альбо цэментам. А кіраваў гэтай цудоўнай студыяй Яўген Паўлавіч Краўчанка. Аднойчы, згодна з ягонай просьбай, кавалерысты прывялі проста на трэці паверх сапраўднага, жывога каня! Нейкі хлапчук сеў на яго, і ўсе мы з вялікім задавальненнем малявалі "натуру"! Прыходзілі ў гэтую студыю папрацаваць і мае старыя знаёмцы па былой "урубелеўцы": Каўроўскі, Сазонаў, Малец.

Сярод выкладыкаў запомніліся Мікалай Яфрэмавіч Русецкі і Усевалад Уладзіміравіч Зорын. Дарэчы, на гэтую студыю ўскладаліся вельмі вялікія нагрузкі напярэдадні рэвалюцыйных святаў. Трэба было аформіць горад, і ў кожнай галіне мастацкага афармлення былі свае спецыялісты. Велізарныя пано на фанерных шчытах зазвычай ствараў Быхоўскі. Чырвоныя з бронзай сцягі для дэманстрацый з'яўляліся прэрагатывай Краўчанкі. Між іншым, Яўген Паўлавіч у студзені 1924-га выканаў і агромністы жалобны вянок з партрэтам Леніна, які быў пасланы ў Маскву на пахаванне правадыра.

Гарнізонная студыя Краўчанкі праіснавала да 1940 года. Неаднойчы змяняла яна сваё месцазнаходжанне. Але, пастаянна папаўняючыся мастацкімі матэрыяламі, муляжамі птушак, звяроў, гіпсавымі адліўкамі, маскамі, арнаментыкай, а галоўнае — новымі і новымі людзьмі, якія прагнулі далучыцца да мастацтва, яна заваявала прызнанне не толькі ў мастакоў, але і ва ўсіх гамяльчан...

Ну а мой лёс пасля Гомеля склаўся наступным чынам. У 1926-м я дэмабілізаваўся з Чырвонай Арміі і стаў настаўнікам малявання ў пачатковай школе, марачы, натуральна, пра вялікае мастацтва. І праз год — рызыкнуў: паехаў паступаць у маскоўскі ВХУТЕМАС. За плячыма — толькі школа майго настаўніка Сяргея Грамыкі, вопыту і ўмення ў акадэмічным малюнку — амаль што няма. Тым не менш — вырашыў паспытаць шчасця. Памятаю, пад час іспыту па жывапісе нам паставілі нацюрморт. Ён быў амаль беспрадметны і спалучаў у сабе заданні на колер, аб'ём і фактуру. Пісалі яго на працягу трох сеансаў. Я выканаў пастаноўку даволі хутка і астатні час рабіў выгляд, што заканчваю працу. На іспыце па малюнку, атрымаўшы аркуш паперы, я пачаў маляваць аголеную натуру — першую ў маім жыцці. Натуршчыцу звалі Надзя Асіповіч. Казалі, што раней яна пазіравала ў студыі знакамітага "бубновавалетаўца" Ілы Машкова. Я хутка намаляваў яе з пэўнай доляй шаржу, скончыў малюнак падтушаванымі дужкамі, не ведаючы, што рабіць далей. Я назіраў, як побач гумкай мае таварышы праціралі паперу да дзірак. Да мяне падышоў прафесар графікі Павел Якаўлевіч Паўлінаў і, аглядзеўшы малюнак, прапанаваў зрабіць на гэтай жа паперы іншы. Як я вытрымаў уступныя іспыты па іншых прадметах — ведае адзін Бог...

Тады пры паступленні ў ВХУТЕМАС ільготамі карысталіся рабфакаўцы, якіх прымалі без уступных экзаменаў і якія складалі асноўную масу абітурыентаў. Астатнія дапускаліся да іспытаў па прафсаюзных пуцёўках, і толькі невялікая колькасць месцаў пакідалася для тых, хто паступаў па конкурсе. У ліку апошніх быў і я. Карацей, я быў прыняты на жывапісны факультэт. А ўсяго было сем факультэтаў, у тым ліку жывапісны — з трыма аддзяленнямі: станковага жывапісу, манументальнага жывапісу і тэатральна-дэкарацыйнага мастацтва.

Для мяне пачалася няпростая вучоба. Я сталеў хутка, і мае наіўныя ўяўленні пра мастацтва саступалі месца сур'ёзнаму стаўленню да жывапісу ды яго традыцый. Сацыяльны склад маіх калег-студэнтаў быў неверагодна стракаты. Многія прыйшлі ў інстытут проста з франтоў Грамадзянскай вайны, некаторыя ўдзельнічалі і ў Імперыялістычнай. Былі студэнты з правінцыйных украйкаў Расіі, вялікі працэнт складалі рабфакаўцы, і ўзрост іх вагаўся ў межах ад 18 да 40 гадоў"...

(Заканчэнне будзе.)

Барыс КРЭПАК

АК Афіша "К"

з 16 лютага — да 23 лютага

МУЗЕІ

НАЦЫЯНАЛЬНЫ МАСТАЦКІ МУЗЕЙ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

г. Мінск, вул. Леніна, 20. Тэл.: 327 45 62.

Экспазіцыі:
- Мастацтва Беларусі XII — XVIII стст.
- Мастацтва Беларусі XIX — пач. XX стст.
- Мастацтва Беларусі XX — пач. XXI стст.
- Мастацтва Расіі XVIII — пач. XX стст.
- Мастацтва краін Заходняй і Цэнтральнай Еўропы XVI — XX стст.

Выстаўкі:
- **"Польская кераміка XVIII — XX стст. з фондаў Верхнесілезскага музея з Бытомы".**
- **"Сустрэча. М.Фердынандаў і А.Рэверон. Дзве гамы аднаго натхнення".**
- **"Мастак і час"** (да 90-годдзя Л.Шчамялёва).
- **"Вайна 1812 года вачыма відавочцаў. Графіка Х.-В. Фон Фабера дзю Фора".**
- Партрэт Войцэха Пуслоўскага пэндзля Валенція Ваньковіча.
- **Слуцкія паясы** з фонду Нацыянальнага мастацкага музея Літвы.

Філіялы Нацыянальнага мастацкага музея Рэспублікі Беларусь:

МУЗЕЙ "ДОМ ВАНЬКОВІЧАЎ. КУЛЬТУРА І МАСТАЦТВА ПЕРШАЙ ПАЛОВЫ XIX СТ."

г. Мінск, вул. Інтэрнацыянальная, 33а. Тэл.: 327 87 96.

- Пастаянныя экспазіцыі: "Парадныя залы", "Жыццё і творчасць Валенція Ваньковіча", "Сядзібны партрэт XVII — сяр. XIX стст.".
- **"Цярноўнік крэсаў".**
- **"Аўтапартрэт"** Валенція Ваньковіча.

МУЗЕЙ БЕЛАРУСКАГА НАРОДНАГА МАСТАЦТВА Ў В. РАЎБІЧЫ

Спарткомплекс "Раўбічы", Мінскі раён. Тэл.: 507 44 68.

- Пастаянная экспазіцыя.
- Выстаўка А.Вярбіцкага. **"Сучаснасць. Былое. Майстар".**

МУЗЕЙ В.К. БЯЛЫНІЦКАГА-БІРУЛІ Ў Г. МАГІЛЁВЕ

г. Магілёў, вул. Ленінская, 37.

Тэл.: (8–0222) 22 48 87.

- Экспазіцыя **"Культура 1-й пал. XIX ст."**.
- **"Вясельныя традыцыі Усходу. Японія. Індыя. Карэя".**

МУЗЕІ

НАЦЫЯНАЛЬНЫ ГІСТАРЫЧНЫ МУЗЕЙ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

г. Мінск, вул. К.Маркса, 12. Тэл.: 327 43 22.

Экспазіцыі:
- **"Старажытная Беларусь".**
- **"Беларусь XVI — XVIII стст. у партрэтах і геральдыцы".**
- **"Водбліскі ваеннай славы".**
- **"Мастацтва ў гарадской культуры XIX — пач. XX стст.".**
- **"Вайна 1812 г. у гісторыі Мінска".**

Выстаўкі:
- Выстаўка **"Скарбы Беларусі"** (са збору музея).
- Выстаўка **"Чатыры пэндзлі: Бархатковы".**
- Выстаўка **"Душы маёй чароўнае святло".** Дом-музей I З'езда РСДРП *г. Мінск, пр-т Незалежнасці, 31а. Тэл.: 290 68 47.*
- **"Народная архітэктура беларускай вёскі ў здымках Уладзіміра Шарнікава".**

ЗАМКАВЫ КОМПЛЕКС "МІР"

г.п. Мір, Карэліцкі раён, Гродзенская вобласць. Тэл.: (8–01596) 2 82 91, (8–01596) 2 82 70.

- Пастаянная экспазіцыя.

Выстаўкі:
- **"Мір стары — Мір новы"** (фотавыстаўка).
- **"Таварыства перасоўных мастацкіх выставак. XXI стагоддзе (Санкт-Пецярбург)".**
- **"Рэмінісцэнцыя"** (выстаўка Ю.Каралевіча).

НАЦЫЯНАЛЬНЫ ГІСТОРЫКА-КУЛЬТУРНЫ МУЗЕЙ-ЗАПАВЕДНІК "НЯСВІЖ"

г. Нясвіж, вул. Ленінская, 19. Тэл.: 8–01770 5 51 81, 5 31 96, 2 06 02

- Выстаўка **"Вера, Надзея, Уваскрэсенне".** З Музея Рокішкскага краю (Літва).

ДЗЯРЖАЎНЫ ЛІТАРАТУРНА-МЕМАРЫЯЛЬНЫ МУЗЕЙ ЯКУБА КОЛАСА

г. Мінск, вул. Акадэмічная, 5. Тэл.: 294 91 96.

- Экспазіцыя **"Якуб Колас. Жыццё і творчасць".**
- Тэатралізаваная экскурсія паводле казак Якуба Коласа.
- **"Шляхам Янкі Купалы да Якуба Коласа"** (у філіяле "Мікалаеўшчына", у Мемарыяльнай сядзібе "Смольня").
- Выстаўка да 130-годдзя з дня нараджэння Якуба Коласа **"Якуб Колас — народны паэт Беларусі".**
- **"Таямніцы Дома Песняра".**

ДЗЯРЖАЎНЫ ЛІТАРАТУРНЫ МУЗЕЙ ЯНКІ КУПАЛЫ

г. Мінск, вул. Янкі Купалы, 4. Тэл.: 327 78 66.

- Пастаянная экспазіцыя **"Шляхі"** з праглядам роліка ў 3D-фармаце.
- Выстаўка **"Не загаснуць зоркі ў небе"** са збору Пушкінскага запаведніка.
- Цыкл музейна-педагагічных заняткаў з элементамі тэатралізацыі **"Дзядзька Янка, добры дзень!"** для дзяцей малодшага школьнага ўзросту і сямейнага наведвальніка.

ДЗЯРЖАЎНЫ МУЗЕЙ ГІСТОРЫІ БЕЛАРУСКАЙ ЛІТАРАТУРЫ

г. Мінск, вул. М.Багдановіча, 15. Тэл.: 334 56 21.

Выстаўкі:
- **"Апякункі паэтычных нябёс".**
- **"Васіль Быкаў. Шлях, вызначаны лёсам"** (жыццё і творчасць).
- **"Паэт з Нарачанскага краю".** Да 100-годдзя з дня нараджэння Максіма Танка.
- **"Ходзіць Сон ля вакон..."** (прысвечана беларускай перадачы "Калыханка").
- **"А.П. Чэхаў. Лінія жыцця"** з фондаў Дзяржаўнага літаратурна-мемарыяльнага музея-запаведніка А.П. Чэхава "Меліхава" (Расія).

БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ МУЗЕЙ ГІСТОРЫІ ВЯЛІКАЙ АЙЧЫННАЙ ВАЙНЫ

г. Мінск, пр-т Незалежнасці, 25а. Тэл: 226 03 98.

- Пастаянная экспазіцыя.

Выстаўкі:
- **"1812 г. Вайна і мір".**

ГОМЕЛЬСКІ ПАЛАЦАВА-ПАРКАВЫ АНСАМБЛЬ

г. Гомель, пл. Леніна, 4. Тэл.: (8-0232) 74 19 11. Цэнтральная частка палаца

Выстаўкі:
- **"Культавыя прадметы"** ("Дамавая царква", паўночны рызаліт палаца).
- **"Загадкавыя фантазіі мора"** (грот палаца).
- Экспазіцыя, прысвечаная дзяржаўнаму дзеячу СССР А.Грамыку.
- **"Чырвоная гасцёўня".** "Зала ўрачыстых прыёмаў".
- Экспазіцыя адкрытага захавання археалагічнай калекцыі музея (цокаль паўднёвай галерэі).
- **"Старажытная гісторыя Гомельшчыны"** (археалагічная экспазіцыя). *Вежа палаца*

Экспазіцыя: **"Уладальнікі Гомельскага маёнтка Румянцавы і Паскевічы".**

Выстаўкі:
- **"Конны партрэт генерал-фельдмаршала І.Ф. Паскевіча (1874 г.)"** (выстаўка адной карціны з калекцыі Д.Асташонка).
- **"Мінулага прасочваючы ніць..."** (мемуарная літаратура канца XVIII — XX стст.).
- **"Класікі беларускага мастацтва".** *Паўночнае крыло палаца*

Экспазіцыя:
- **"Свет звяроў Гомельшчыны".**

Выстаўкі:
- Куток жывых экзатычных рэптылій. *Зімовы сад* Свет субтрапічных раслін і жывёл.

МУЗЕЙ ГІСТОРЫІ ГОРАДА ГОМЕЛЯ

г. Гомель, вул. Пушкіна, 32. Тэл.: (80232) 74-28-23.

Экспазіцыі:
- Інтэр'еры гарадскога асабняка к. XIX — пач. XX стст.
- Прагулкі па старым Гомелі.
- Гісторыя Гомеля ад старажытнасці да пачатку XX ст.

Выстаўкі:
- Фотаапараты і фотатэхніка XX ст. (каля 100 адзінак).

ГРОДЗЕНСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ МУЗЕЙ ГІСТОРЫІ РЭЛІГІІ

г. Гродна, вул. Замкавая, 16. Тэл.: (8-0152) 74 25 13.

Экспазіцыі:
- **"Рэлігія і культура ў Беларусі"** (ад старажытных часоў да XXI ст. — архаічныя вераванні, хрысціянскія канфесіі, іслам, іудаізм).
- **"Эпоха. Час. Будынак"** (гісторыя палаца, у якім размешчаны музей, сямейныя традыцыі і каштоўнасці XIX — пач. XX стст.).

Выстаўка:
- **"Пад Віфлеемскай зоркай"** (мастацкія творы з перламутру, ражджэсцвенскія паштоўкі канца XIX — пач. XX стст.).

ГОМЕЛЬСКІ АБЛАСНЫ МУЗЕЙ ВАЕННАЙ СЛАВЫ

г. Гомель, вул. Пушкіна, 5. Тэл.: (8-0232) 77 60 60.

- Пастаянная ваенна-гістарычная экспазіцыя.
- Выстаўка тэхнікі на адкрытай пляцоўцы.
- Выстаўка **"Салдацкі доўг".**
- На тэрыторыі музея працуе пнеўматычны цір.
- **"Музей крыміналістыкі".**

ЛІДСКІ ГІСТОРЫКА-МАСТАЦКІ МУЗЕЙ

г. Ліда, вул. Перамогі, 37а. Тэл.: (8-0154) 53 22 44.

- Пастаянная экспазіцыя **"Прырода Лідчыны".**

Выстаўкі:
- **"Вядзём пачатак свой ад Гедыміна...".**
- **"Прадметы побыту к. XIX — пач. XX стст.".**
- Выстаўка адной карціны **"Партызаны".**
- **"Прывітанне, ранейшая Ліда!".**
- **"Музейна-вобразная зала "Хрушчоўка-60".**
- Турыстычна-пазнаваўчая праграма **"Праз вякі, праз стагоддзі"** ў Лідскім замку.

ГАЛЕРЭІ

ПАЛАЦ МАСТАЦТВА

г. Мінск, вул. Казлова, 3. Тэл./факс.: 290 60 10.

- **З 21 да 23 —** выстаўка **"Адукацыя і кар'ера"** (Экспафорум).

МАСТАЦКАЯ ГАЛЕРЭЯ "УНІВЕРСІТЭТ КУЛЬТУРЫ"

г. Мінск, Кастрычніцкая плошча, 1. Тэл.: 327 26 12.

- Фотавыстаўка беларускіх фотамастакоў **"Прыступкі".**

ПАСПЯШАЙЦЕСЯ НА ПОШТУ!

НАГАДВАЕМ! ПРАЦЯГВАЕЦЦА ПАДПІСКА НА ГАЗЕТУ "КУЛЬТУРА" НА САКАВІК І НАСТУПНЫЯ МЕСЯЦЫ І-га паўгоддзя 2013 г.

Падпісныя індэксы: індывідуальная падпіска — 63875, ведамасная падпіска — 638752.

ТЭАТР

НАЦЫЯНАЛЬНЫ АКАДЭМІЧНЫ ВЯЛІКІ ТЭАТР ОПЕРЫ І БАЛЕТА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

г. Мінск, пл. Парыжскай камуны, Тэл./факс: 334 11 56.

Гастролі Нацыянальнай оперы "Эстонія"
- **16, 17 — "Іяланта"** П. Чайкоўскага.
- **17, 20 — "Лебядзінае возера"** П.Чайкоўскага.
- **19 — "Тоска"** Дж.Пучыні.
- **20 — "Вечар рускага раманса"** (Музычныя вечары ў Вялікім).
- **21 — "Яўгеній Анегін"** П.Чайкоўскага.
- **22 — "Спячая прыгажуня"** П.Чайкоўскага.
- **23 — Святочны канцэрт зорак Вялікага тэатра Беларусі.**

НАЦЫЯНАЛЬНЫ АКАДЭМІЧНЫ ТЭАТР ІМЯ ЯНКІ КУПАЛЫ

г. Мінск, вул. Энгельса, 7. Тэл./факс: 227 60 81.

На Малой сцэне Канцэртнай залы "Мінск"
- **20 — "Гендэль Бах"** П.Барца.
- **21 — "Востраў Сахалін"** А.Чэхава.

На сцэне Палаца культуры прафсаюзаў:
- **18 — "Пінская шляхта"** В.Дуніна-Марцінкевіча.
- **22 — "Translations"** Б.Фрыла.
- **23 — "Хам"** паводле Э.Ажэшка.

ЗАСЛУЖАНЫ КАЛЕКТЫЎ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ "РЭСПУБЛІКАНСКІ ТЭАТР БЕЛАРУСКАЙ ДРАМАТУРГІІ"

г. Мінск, вул. Крапоткіна, 44. Тэл./факс: 334 60 08.
- **16 — "Ліфт"** Ю.Чарняўскай.
- **17 — "Містар Розыгрыш"** С.Кандрашова.
- **18 — "Дастаеўскае пытанне"** С. Кавалёва.
- **19, 20 — "Тры Жызэлі"** А.Курэйчыка.
- **21 — "Адэль"** Я.Таганава.
- **22 — "Янка Купала. Кругі раю"** С.Навуменка.

БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ АКАДЭМІЧНЫ МУЗЫЧНЫ ТЭАТР

г. Мінск, вул. Мяснікова, 44. Тэл.: 200 81 26.
- **16 — "Айбаліт-2002"** І.Левіна. **"Шчаўкунок"** П.Чайкоўскага.
- **17 — "Залатое кураня"** У.Улановскага. **"Паяцы"** Р.Леанкавала.
- **19 — "Вестсайдская гісторыя"** Л.Бернстайна.
- **20 — "Сільва"** І.Кальмана.
- **21 — "Звычайны цуд"** Г. Гладкова.
- **23 — "Чароўная лямпа Аладдзіна"** М.Самойлава. **"Лятучая мыш"** І.Штраўса.

БЕЛАРУСКІ ТЭАТР "ЛЯЛЬКА"

г. Віцебск, вул. Пушкіна, 2. Тэл.: (8-0212) 36 32 50.
- **16 — "Церам-церамок"** С.Маршака.
- **17 — "Ямелева шчасце"** (па матывах рускіх народных казак).
- **23 — "Кветачка-вясёлка"** В. Катаева.

ШТОТЫДНЁВАЯ ГРАМАДСКА — АСВЕТНІЦКАЯ ГАЗЕТА
Выдаецца з кастрычніка 1991 года
Заснавальнік — Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь
Рэгістрацыйнае пасведчанне № 637, выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь

Галоўны рэдактар — Сяргей Сяргеевіч ТРАФІЛАЎ
Рэдакцыйная калегія: Лілія АНАНІЧ, Уладзімір АРЛОЎ, Міхаіл БАРАЗНА, Уладзімір ГІЛЕП, Ірына ДРЫГА, Аляксей ДУДАРАЎ, Кацярына ДУЛАВА, Валянцін ЕЛІЗАР'ЕЎ, Міхаіл КАЗІНЕЦ, Віктар КУРАШ, Барыс СВЯТЛОЎ, Святлана СУХАВЕЙ, Міхаіл ФІНБЕРГ, Леанід ШЧАМЯЛЁЎ, Уладзімір ШЧАСНЫ.

Рэдакцыя: Марына САМОНЧАНКА (адказны сакратар).

Рэдактары аддзелаў: Дар'я АМЯЛЬКОВІЧ, Канстанцін АНТАНОВІЧ, Надзея БУНЦЭВІЧ, Таццяна КОМАНАВА, Барыс КРЭПАК, Яўген РАГІН, Ілья СВІРЫН.
Спецкарэспандэнты: Пётр ВАСІЛЕЎСКІ, Юрый ЧАРНЯКЕВІЧ.
Загадчык аддзела фотаілюстрацый — Юрый ІВАНОЎ
Карэктар — Інга ЗЕЛЬГІС
Мастацкі рэдактар — Наталля ОВАД
Адрас рэдакцыі: 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 77. Пакоі 16-28, 94-98, чацвёрты паверх.
Тэлефоны: (017) 290 22 50, (017) 286 07 97, (017) 334 57 23
Тэлефон/факс: (017) 334 57 41
Рэкламны аддзел: тэл. (017) 334 57 41
www.kimpress.by
E-mail: kultura@tut.by

Аўтарскія рукапісы не рэцэнзуюцца і не вяртаюцца.
Аўтары допісаў у рэдакцыю паведамляюць сваё прозвішча, поўнасцю імя і імя па бацьку, пашпартныя звесткі (нумар пашпарта, дату выдачы, кім выдадзены пашпарт, асабісты нумар), асноўнае месца працы, зваротны адрас.
Меркаванні аўтара могуць не адпавядаць пункту гледжання рэдакцыі.
Аўтары нясуць адказнасць за дакладнасць матэрыялаў.
*Матэрыял на правах рэкламы.

"Культура", 2013.
Індэксы 63875, 638752
Наклад 7542
8.02.2013 у 18.30
Замова 766
Дзяржаўнае прадпрыемства "Выдавецтва "Беларускі Дом друку".
ЛП № 02330/0494179 ад 03.04.2009.
пр. Незалежнасці, 79, 220013, Мінск.

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова "Культура і мастацтва"
Ліцэнзія на выдавецкую дзейнасць ЛВ №02330/0003879 ад 17 красавіка 2009 г.

Дырэктар — ПРЫКО Алег Васільевіч
Першы намеснік дырэктара — КРУШЫНСКАЯ Людміла Аляксееўна
Намеснік дырэктара па маркетынгу — СІДАРЭНКА Антон Васільевіч

220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 77.
Тэл.: (017) 290 22 50 (прыёмная).
Бухгалтэрыя: тэл.: (017) 334 57 35